Серыя «Беларусь і Эдвард Вайніловіч»




# БЕЛАРУСЬ, КАПЫЛЬШЧЫНА І ЭДВАРД ВАЙНІЛОВІЧ

Серыя «Беларусь і Эдвард Вайніловіч»

ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА
КАПЫЛЬСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
РЫМА-КАТАЛІЦКІ КАСЦЁЛ У БЕЛАРУСІ

# БЕЛАРУСЬ, КАПЫЛЬШЧЫНА І ЭДВАРД ВАЙНІЛОВІЧ

*Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі*

(г. Капыль, 14 лістапада 2015 г.)

Мінск
«Медысонт»
2016

УДК [94(476)+929Вайніловіч](082)
ББК 63.3(4Беи)я43
Б43

Серыя заснавана ў 2016 годзе

Укладальнікі:
*А. У. Унучак*, *У. С. Пуцік*, *Н. В. Анофранка*

Рэдакцыйная калегія:
*А. А. Каваленя* (галоўны рэдактар), *В. В. Даніловіч*, *В. Л. Лакіза*, *У. С. Пуцік*, *А. У. Унучак*

Рэцэнзент:
акадэмік НАН Беларусі *М. П. Касцюк*

Б43 **Беларусь**, Капыльшчына і Эдвард Вайніловіч : матэрыялы навук.-практ. канф. (г. Капыль, 14 лістап. 2015 г.) / уклад.: А. У. Унучак, У. С. Пуцік, Н. В. Анофранка. — Мінск : Медысонт, 2016. — 218 с. — (Серыя «Беларусь і Эдвард Вайніловіч»).

ISBN 978-985-7136-18-6.

У зборніку змешчаны даследаванні беларускіх навукоўцаў, спецыялістаў па гісторыі Беларусі другой паловы XIX — першай трэці XX ст., прысвечаныя выдатнай асобе, рэфарматару, патрыёту сваёй Айчыны Эдварду Вайніловічу (1847–1928). На фоне гістрычных катаклізмаў як у Беларусі, так і за яе межамі адлюстраваны важнейшыя вехі з жыцця і дзейнасці нашага земляка.

Адрасуецца вучоным, выкладчыкам ВНУ, настаўнікам школ, краязнаўцам і ўсім тым, хто зацікаўлены ў вывучэнні амаль забытых старонак з гісторыі нашай Бацькаўшчыны.

**УДК [94(476)+929Вайніловіч](082)**
**ББК 63.3(4Беи)я43**

**ISBN 978-985-7136-18-6**

© Унучак А. У., Пуцік У. С., Анофранка Н. В., укладанне, 2016
© Афармленне. ТАА «Медысонт», 2016

## ПРЫВІТАЛЬНАЕ СЛОВА

**дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдата гістарычных навук, дацэнта В. В. Даніловіча ўдзельнікам навукова-практычнай канферэнцыі «Беларусь, Капыльшчына і Эдвард Вайніловіч» 14 лістапада 2015 г.**

*Паважаныя гаспадары!*

*Шаноўныя ўдзельнікі навуковага форуму!*

*Беларусь — незалежная дзяржава, якая мае ўласную багатую гісторыю, створаную шматлікімі пакаленнямі людзей, што жылі на нашай зямлі. Мы павінны іх памятаць і ўслаўляць, на іх прыкладзе выхоўваць падрастаючыя пакаленні.*

*Наша гісторыя — гэта невычэрпная крыніца для выхавання патрыятызму. Менавіта важнасць фарміравання патрыятычных пачуццяў як адной з першасных неабходных асноў паспяховага развіцця нашай краіны неаднаразова падкрэсліваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка.*

*Нельга не адзначыць, што з Капыльшчынай шчыльна звязана цэлая плеяда выдатных асоб нашай гісторыі і сучаснасці. Мне як дырэктару Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі асабліва прыемна адзначыць, што сярод іх*

*ёсць сапраўдныя гісторыкі-падзвіжнікі, уклад якіх у развіццё сучаснай айчыннай гістарычнай навукі цяжка перабольшыць. Гэта акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, член-карэспандэнт Аляксандр Аляксандравіч Каваленя і галоўны археолаг нашай краіны, загадчык цэнтра гісторыі даіндустрыяльнага грамадства нашага Інстытута, доктар гістарычных навук, прафесар Вольга Мікалаеўна Ляўко.*

*Вучоныя Інстытута гісторыі НАН Беларусі заклікаены вырашаць складаныя задачы навуковага асвятлення гісторыі беларускага народа. Наша мэта — давесці да грамадскасці краіны, суседніх дзяржаў і ўсёй сусветнай супольнасці багацце беларускай гісторыка-культурнай спадчыны, якой мы маем усе падставы ганарыцца.*

*Шчыльнае супрацоўніцтва ў названым напрамку з раённымі ўладамі стварае базу для прымянення дасягненняў айчыннай гуманітарнай навукі на мясцовым ўзроўні, робіць даступнымі найноўшыя веды для ўсіх слаёў грамадства.*

*Сённяшні навуковы форум прысвечаны адной з найвыдатнейшых асоб беларускай гісторыі — Эдварду Вайніловічу, чый радавы маёнтак Савічы знаходзіцца на Капыльшчыне. З канца XIX ст. ён аказваў падтрымку маладой беларускай літаратуры. Займаючы розныя пасады ва ўстановах Расій-*

*скай імперыі, Э. Вайніловіч значна паспрыяў паляпшэнню эканамічнага становішча беларускай вёскі, развіццю сельскай гаспадаркі. Неацэнным укладам у беларускую культуру з'яўляецца будаўніцтва з ягонай ініцыятывы і на ягоныя сродкі касцёла св. Сымона і Алены ў Мінску. У 1917–1918 гг. Э. Вайніловіч падтрымліваў кантакты з беларускім нацыянальным рухам, удзельнічаў у фінансаванні беларускіх устаноў. Ён адкрыта асудзіў падзел Беларусі паводле ўмоў Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г.*

*Бясспрэчна, што памяць аб асобе і справах Э. Вайніловіча павінна захоўвацца. Таму выказваю шчырыя словы ўдзячнасці Капыльскаму раённаму выканаўчаму камітэту, Капыльскаму раённаму савету дэпутатаў, Беларускаму дзяржаўнаму педагагічнаму ўніверсітэту імя Максіма Танка, а таксама Рыма-каталіцкаму касцёлу ў Беларусі, разам з якімі мы арганізавалі гэту навукова-практычную канферэнцыю, якая з'яўляецца выдатным прыкладам даніны павагі да нашых продкаў. Яе праца, безумоўна, папоўніць скарбонку ведаў аб гісторыка-культурнай спадчыне Капыльшчыны.*

*Жадаю ўсім удзельнікам навуковага форуму плённай працы дзеля росквіту нашай Бацькаўшчыны!*

# ПРЫВІТАЛЬНАЕ СЛОВА

**акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, члена-карэспандэнта, доктара гістарычных навук, прафесара А. А. Кавалені ўдзельнікам навукова-практычнай канферэнцыі «Беларусь, Капыльшчына і Эдвард Вайніловіч» 14 лістапада 2015 г.**

---

*Паважаныя гаспадары!*
*Паважаны Анатоль Іосіфавіч!*
*Шаноўныя ўдзельнікі канферэнцыі!*

*У апошнія гады стала добрай традыцыяй правядзенне навуковых канферэнцый, прысвечаных розным аспектам гісторыі рэгіёнаў нашай краіны. Вучоныя Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі арганізавалі і правялі дзясяткі навуковых канферэнцый па гісторыі асобных населеных пунктаў і раёнаў Беларусі.*

*Сучасныя навуковыя даследаванні сведчыць, што ў айчыннай гісторыі шмат таленавітых і апантаных грамадскіх дзеячаў, вучоных, паэтаў, пісьменнікаў і людзей працы, хто сваёй самаадданай дзейнасцю рухаў грамадска-палітычны і сацы-*

*яльна-эканамічны прагрэс. Гэтыя асобы складаюць гонар нашай нацыі. Між тым, доўгі час гісторыю беларускага народа і яго выбітных прадстаўнікоў мы пачыналі толькі з савецкага перыяду.*

*Аднак жыццё мяняецца. У незалежнай Беларусі разгорнута шырокая праца па вяртанні з небыцця імён шматлікіх айчынных дзеячаў.*

*Увогуле, дзякуючы мэтанакіраванай дзяржаўнай палітыцы, актыўнаму ўдзелу ўсяго беларускага народа шмат зроблена і дасягнута ў нашай краіне ў апошнія 20 гадоў. Беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця прызнана нават нашымі апанентамі. Дзяржава вялікую ролю адводзіць забеспячэнню занятасці насельніцтва, паляпшэнню спартыўнай і турыстычнай інфраструктуры, медыцынскага абслугоўвання, бытавых і камунальных паслуг для жыхароў не толькі гарадоў, але і сельскіх раёнаў.*

*Паспяхова развіваецца і Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. У адпаведнасці з патрабаваннямі часу аптымізуецца структура навуковых даследаванняў, удасканальваецца і пашыраецца перспектыўная тэматыка, павышаецца эфектыўнасць работ, якія выконваюцца ў інтарэсах народнай гаспадаркі, умацавання нацыянальнай бяспекі, развіцця культурнай і сацыяльнай сфер нашай дзяржавы. Мы ганарымся тым, што дзякуючы пра-*

*цы айчынных акадэмічных вучоных Рэспубліка Беларусь стала касмічнай дзяржавай, стварае ўласную станцыю ў Антарктыдзе, адраджае багатую гісторыка-культурную і духоўную спадчыну беларускага народа!*

*Вядома, што грамадства, якое не шануе памяць аб сваёй гісторыі, не мае будучыні. Мінулае з'яўляецца надзейным падмуркам у справе патрыятычнага выхавання маладога пакалення, паспяховай рэалізацыі сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў у краіне, дазваляе з упэўненасцю глядзець у будучыню.*

*Для нас важна забяспечваць гістарычную пераемнасць і аб'ектыўнае асвятленне мінулага беларускага народа, папулярызаваць багатую і ўнікальную гісторыка-культурную спадчыну нашай краіны. Менавіта гэтыя задачы ставіць перад беларускімі вучонымі-гуманітарыямі Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка.*

*Чалавек, які не ведае мінулага свайго народа, гісторыі сваіх родных мясцін, не можа клапаціцца аб захаванні спадчыны і росквіце роднага краю. Таму вывучэнне і захаванне гісторыі і культуры рэгіёнаў Беларусі з'яўляецца адказнай, цікавай і неабходнай справай.*

*Мне як ўраджэнцу Капыльшчыны асабліва прыемна, што ўладамі і грамадствам Капыльскага раё-*

*на робіцца велізарная праца па забеспячэнні годнага ўзроўню жыцця насельніцтва, захаванні і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны краю. Не многія раёны могуць пахваліцца выдатнымі музеямі розных узроўняў (ад школьных да раённага краязнаўчага), шматлікімі самадзейнымі музычнымі і танцавальнымі калектывамі.*

*На жаль перакрыжаванне гандлёвых шляхоў несла Капыльскай зямлі не толькі росквіт, але і прыводзіла сюды шматлікіх ворагаў. Яе жыхарам неаднаразова даводзілася бараніцца ад варожых навал. У войнах гінулі людзі і гісторыка-культурныя каштоўнасці, аднак памяць пра іх захоўвалі і зараз захоўваюць нашчадкі.*

*Капыльскі раён мае слаўныя баявыя і працоўныя традыцыі. Яскравым прыкладам з'яўляецца гераізм і мужнасць капылян у гады Вялікай Айчыннай вайны. Звання Героя Савецкага Саюза ўдастоены 11 ураджэнцаў Капыльшчыны, 10 сталі Героямі Сацыялістычнай працы, 41 узнагароджаны ордэнам Леніна.*

*Мы не павінны забывацца, што ў аснове гісторыі ляжыць жыццё людзей. Менавіта таму ў цэнтры даследаванняў па гісторыі асобных рэгіёнаў Беларусі павінен быць чалавек. Мы павінны памятаць, што вывучаем наша гістарычнае мінулае для таго, каб на яго прыкладах выхоўваць і адукоўваць пад-*

*растаючае пакаленне, вучыць моладзь дабру, павазе да сваіх продкаў, уменню жыць у міры і дабрасуседстве. Гісторыя — гэта сапраўдная Настаўніца жыцця.*

*З Капыльшчынай звязана дзейнасць цэлага сузор'я выдатных гістарычных асоб, палітычных і грамадскіх дзеячаў, навукоўцаў, пісьменнікаў. Сярод іх Уладзіслаў Сыракомля, Цішкі Гартны, Кузьмы Чорны, Алесь Адамовіч, Герой Беларусі Міхаіл Высоцкі і многія, многія іншыя. У тым ліку і Эдвард Вайніловіч, асобе якога прысвечаны сённяшні навуковы форум.*

*Шмат гадоў жыцця Эдвард Вайніловіч правёў у родавым маёнтку Савічы на Капыльшчыне. Але ён не адасабляўся ад жыцця грамадства. Шмат сіл і энергіі Эдвард Вайніловіч аддаваў дапамозе дробным сельскім гаспадарам, ажыўленню грамадскага жыцця краю. З 1888 г. ён з'яўляўся віцэ-старшынёй Мінскага сельскагаспадарчага таварыства, а гэта значыць фактычным яго кіраўнікам, бо пасада старшыні была ганаровай. Эдвард Вайніловіч займаўся і дабрачыннай дзейнасцю, падтрымліваў беларускіх літаратараў, дзеячаў нацыянальнага руху. У 1910 г. за яго грошы быў пабудаваны касцёл св. Сымона і Алены ў Мінску, які і сёння з'яўляецца адным з сімвалаў нашай сталіцы. Э. Вайніловіч адкрыта асудзіў*

*падзел Беларусі паводле ўмоў Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 года.*

*Безумоўна, Эдвард Вайніловіч зрабіў вялікі ўклад у справу сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця Беларусі. Яго асоба і дзейнасць заслугоўваюць памяці і ўшанавання, з'яўляюцца годным прыкладам для пераймання маладым пакаленнем.*

*У гэтым кантэксце вельмі важна, што мы праводзім не проста навуковую, акадэмічную канферэнцыю, а менавіта навукова-практычную. Такі падыход дазваляе ўключыць у навукова-даследчы працэс не толькі вучоных, але і мясцовых даследчыкаў гістарычнага мінулага. Як тых, хто займаецца ідэалагічнай, выхаваўчай работай, так і мясцовых краязнаўцаў, а таксама моладзь. У выніку напрацоўкі вучоных, якія прысутнічаюць тут, стануць набыткам жыхароў рэгіёна, у першую чаргу тых, хто займаецца вывучэннем і захаваннем яго гісторыі і культуры.*

*Упэўнены, што праца сённяшняй канферэнцыі будзе карыснай у справе нацыянальна-патрыятычнага выхавання, пашырэння ведаў аб гісторыі Капыльшчыны і ўсёй Беларусі, умацавання пачуццяў гонару і любові да нашай Бацькаўшчыны.*

*Поспехаў Вам у працы, паважаныя ўдзельнікі канферэнцыі!*

## ПРЫВІТАЛЬНАЕ СЛОВА БІСКУПА ЮРЫЯ

*Сардэчна вітаю Вас,*
*дарагія браты і сёстры, шаноўная*
*інтэлігенцыя Беларусі, прадстаўнікі мясцовай*
*улады і ўсе людзі добрай волі на гэтым,*
*так значным для нашай краіны мерапрыемстве!*

*Асоба Эдварда Вайніловіча вядомая не толькі ў нашай краіне, але і далёка па-за яе межамі. Рэфарматар, беларускі і польскі грамадска-палітычны дзеяч XIX – пачатку XX стагоддзяў, мецэнат, віцэ-прэзідэнт на працягу амаль дваццаці гадоў (1888–1907 гг.) Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, актыўны, ініцыятыўны і сумленны чалавек, вельмі паважаны сярод мясцовых землеўласнікаў, а таксама між прадстаўнікоў расійскага дзяржаўнага апарату.*

*Менавіта ён стаў ініцыятарам будаўніцтва (1905–1910 гг.) знакамітага Чырвонага касцёла – касцёла Святога Сымона і Святой Алены на знак памяці аб сваіх заўчасна памерлых дзецях.*

*Вайніловіч свядома адмовіўся ад усякіх ахвяраванняў іншых асоб і фондаў. Але некалькі выклю-*

*чэнняў ўсё ж зрабіў. Прыняў у дар ад свайго сябра Аляксандра Болтуця 1000 рублёў на званы і 200 рублёў ад пані Шантыруўны на арганы. А яшчэ ў дар былі прынятыя святыні: старажытны абраз Маці Божай ад сям'і Скірмунтаў з Парэчча і цудоўнае драўлянае распяцце, выробленае ў свой час для Слуцкага Фарнага касцёла.*

*Для стварэння аконных вітражоў Вайніловіч спецыяльна запрасіў з Кракава вядомага мастака Францішка Бруздовіча. Алтар, інтэр'еры і скульптуры вырабіў для храма варшаўскі скульптар Зігмунд Ота. У 1909 годзе на галоўную вежу касцёла былі паднятыя тры званы: Міхаіл, вагай 2373 фунта, Эдвард – у 1287 фунтаў і Сімяон – у 760 фунтаў. Разам з хорамі храм умяшчаў да 1500 чалавек.*

*Пасля таго, як маёнтак Вайніловічаў быў ўзяты пад кантроль бальшавікоў, Эдвард вымушаны быў выехаць за мяжу. У польскім горадзе Быдгашч узнёсся новы знак бескарыслівай любові Эдварда Вайніловіча да бліжніх – вялікі дом для дзяцей-сірот, які ён ўтрымліваў да канца свайго жыцця. Адышоў Эдвард Вайніловіч у вечнасць 16 чэрвеня 1928 г. і быў пахаваны на мясцовых могілках.*

*Аднак наканавана было яму вярнуцца ў Беларусь, у свой родны край амаль праз 80 год пасля смерці.*

*11 чэрвеня 2006 года перад касцёлам Св. Сымона і Св. Алены ў Мінску адбылося перазахаванне парэшткаў Эдварда Вайніловіча.*

*На працягу апошніх дзесяцігоддзяў у Каталіцкім Касцёле Беларусі па ініцыятыве пробашча парафіі Святых Сымона і Алены, шаноўнага ксяндза-дэкана Уладзіслава Завальнюка збіраюцца дакументы для распачацця інфармацыйнага працэсу святой памяці Эдварда Вайніловіча, каб разгледзець магчымасць далучэння яго да ліку благаславёных.*

*Таму яшчэ раз выказваю ўсім Вам сваю шчырую ўдзячнасць за Вашу працу па вывучэнню жыцця і дзейнасці нашага вялікага суайчынніка і благаслаўляю на далейшае плённае супрацоўніцтва для дабрабыту нашай Бацькаўшчыны.*

*Дапаможны біскуп*<br>
*Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі*<br>
***Юрый Касабуцкі***

*Пётр Бухавец*

# ЭДВАРД ВАЙНІЛОВІЧ — УДЗЕЛЬНІК МІНСКАГА ТАВАРЫСТВА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ (1878–1888 гг.)

Пасля адмены прыгоннага права ўрад Расійскай імперыі прыходзіць да высновы аб тым, што ў мадэрнізацыйных працэсах неабходна падтрымліваць і выкарыстоўваць грамадскія ініцыятывы. Асабліва надзеі ўскладваліся на сельскагаспадарчыя таварыствы, якія аб'ядноўвалі як тэарэтыкаў, так і практыкаў у пазначанай сферы. Такім чынам, 1870-я гг. адзначыліся хуткім ростам колькасці стварэнняў губернскіх сельскагаспадарчых таварыстваў, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі. Адно з першых грамадскіх аб'яднанняў такога тыпу было створана ў Мінску ў 1876 г. Да пачатку XX ст. Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі набыло аўтарытэт найбольш ініцыятыўнага і рэзультатыўнага губернскага аб'яднання не толькі ў беларускіх губернях, але і ў межах імперыі[1]. Значных поспехаў яно дасягнула дзякуючы намаганням такіх дзеячаў, як Э. Вайніло-

[1] Сельскохозяйственные общества // Энциклопедический словарь. СПб., 1900. Т. 29 (57). С. 414–419.

віч. Нягледзячы на даволі значную цікавасць у беларускай і польскай гістарыяграфіі да гэтай выбітнай асобы, нельга сказаць аб дасканалым вывучэнні яго біяграфіі. Адным з найменш даследаваных перыядаў жыцця з'яўляецца час ад уступлення Э. Вайніловіча ў Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі да абрання яго віцэ-прэзідэнтам гэтага аб'яднання.

Рашэнне аб стварэнні Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі было прынята 25 мая 1874 г. на з'ездзе рускіх землеўладальнікаў Мінскай губерні. Дэлегаты, заслухаўшы праект статута, знайшлі яго адпавядаючым эканамічным патрэбам губерні і ўпаўнаважылі распарадчы камітэт хадайнічаць праз губернатара аб яго зацвярджэнні[2]. Мінскі губернатар У. Токараў, які быў старшынёй вышэйзгаданага з'езда, толькі 20 лістапада 1875 г. накіраваў прашэнне аб зацвярджэнні праекта статута на імя міністра дзяржаўных маёмасцей. Аднак толькі 20 жніўня 1876 г. з дазволу Міністэрства ўнутраных спраў і нязначных правак Дэпартамента земляробства і сельскай прамысловасці праект статута быў зацверджаны міністрам дзяржаўных маёмасцей[3].

---

2 Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей — РДГА). Фонд 398. Воп. 39. Спр. 13171. Арк. 3.

3 РДГА. Ф. 398. В. 39. Спр. 13171. Арк. 1–1адв, 28–28 адв.; Устав Минского общества сельского хозяйства. От 20 августа 1876 г. СПб., 1876. С. 1.

Нягледзячы на афіцыйную рэгістрацыю таварыства, яго першае пасяджэнне адбылося праз год, 21 жніўня 1877 г. На ім былі абраны члены савета. Першым прэзідэнтам стаў губернскі прадвадзіцель дваранства В. Паўлаў, а членамі савета — буйныя землеўласнікі А. Лучынскі, Ф. Шміт, мінскі павятовы прадвадзіцель дваранства — П. Хамянтоўскі, сакратаром і адначасова скарбнікам — старшыня Аб'яднанай палаты крымінальнага і грамадзянскага суда М. Мышанкоў. Першым ганаровым членам быў абраны Л. Макаў, які на той час займаў пасаду таварыша (намесніка) міністра унутраных спраў[4].

Варта адзначыць, што таварыства стваралася з мэтай падтрымкі гаспадаркі рускіх землеўласнікаў у краі, таму ў канчатковым выніку павінна было садзейнічаць русіфікацыі беларуска-літоўскіх губерняў[5]. У першапачатковым варыянце статута не была прапісаная забарона на прыняцце ў склад Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі каталікоў, але існавала істотная агаворка: «Общество образуется первоначально из тех русских землевладельцев Минской губернии, которые

---

[4] РДГА. Ф. 398. Воп. 39. Спр. 13171. Арк. 42; Минское общество сельского хозяйства, его наличный состав и характер деятельности общества. — Минск, 1878. С. 2.

[5] Wojniłłowicz E. Wspomnienia 1847–1928. Cz. 1. Wilno, 1931. S. 39.

изъявили или изъявят до утверждения устава желание состоять его членами»[6]. Такім чынам, статут не даваў магчымасці землеўласнікам-каталікам патрапіць у першапачатковы склад таварыства. Гэта дазваляла ўладам сфарміраваць цалкам лаяльнае і падкантрольнае грамадскае аб'яднанне. Уваход у яго склад каталікоў фармальна не забараняўся статутам, але для гэтага было мала іх асабістага жадання: патрэбна была пісьмовая рэкамендацыя ад 3 сапраўдных членаў, што таксама кантралявалася ўладай. Толькі разуменне адсутнасці перспектывы развіцця таварыства вымусіла прадстаўнікоў губернскай адміністрацыі прыняць у яго склад т. зв. «асоб польскага паходжання». Так, на 21 чэрвеня 1878 г. Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі налічвала ўсяго 34 члены (на 5 чалавек менш, чым ініцыятараў яго заснавання ў 1874 г.). Гэта ўжо само па сабе сведчыла аб крызісе грамадскага аб'яднання на самым пачатку яго дзейнасці, нягледзячы на дастаткова вялікую колькасць рускіх землеўласнікаў у Мінскай губерні[7]. З 34 членаў таварыства ў сярэдзіне 1878 г. 31 быў праваслаўнага, па адным мусульманскага,

---

[6] Устав Минского общества сельского хозяйства. От 20 августа 1876 г. СПб., 1876. С. 1.

[7] РДГА. Ф. 398. Воп. 39. Спр. 13171. Арк. 2–2 адв.

евангельска-лютэранскага і евангельска-рэфармацкага веравызнання[8].

У той жа час членамі таварыства жадалі стаць 25 чалавек, большая частка з якіх была мясцовымі землеўласнікамі-каталікамі, у тым ліку і Э. Вайніловіч[9].

Адразу пасля ўступлення ў таварыства ў 1878 г. Э. Вайніловіч актыўна ўключыўся ў яго дзейнасць. У 1881 г. ён разам са С. Свянціцкім і М. Мышанковым прапанавалі ідэю пашырэння дзейнасці таварыства праз стварэнне павятовых аддзелаў. Аднак рэалізацыя гэтай ідэі адбылася толькі ў канцы XIX — пачатку XX ст.[10]

У пачатку 1881 г. Э. Вайніловіч і В. Svіда былі выбраны ад таварыства на з'езд сельскіх гаспадароў у Смаленску. Паколькі В. Свіда не паехаў, то адзіным дэлегатам ад Мінскай губерні быў Э. Вайніловіч. Яму на той момант было 33 гады, а ў такім ўзросце, па яго сцвярджэнні, «...быць прадстаўніком

---

8 Минское общество сельского хозяйства, его наличный состав и характер деятельности общества. — Минск, 1878. — С. 2–3; Список землевладельцев Минской губернии за 1876 год. Минск, 1877. С. 12–13, 16, 21, 36, 40, 48, 53, 59, 62, 65, 69–70, 78, 90, 92, 95, 102, 106, 118, 124, 134, 143, 146, 166, 168, 177, 180; Памятная книжка Минской губернии на 1880 год. — Минск, 1879. С. 66, 95.

9 Минское общество сельского хозяйства, его наличный состав и характер деятельности общества. Минск, 1878. С. 2–4.

10 Отчёт Минского общества сельского хозяйства за 1881 год. Минск, 1882. С. 7–8.

адной з найбуйнейшых губерняў было вялікім гонарам»[11]. На з'ездзе па даручэнні Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі Э. Вайніловіч падняў пытанне аб іпатэчным крэдыце і сэрвітутах. Вынікам з'езда ў Смаленску было абранне 2 дэлегатаў на Усерасійскі з'езд у Пецярбургу. Э. Вайніловіча выбралі ў якасці запаснога, у выпадку калі б адзін з дэлегатаў не змог бы паехаць[12].

Э. Вайніловіч шмат разоў выбіраўся ў разнастайныя камісіі па распрацоўцы спецыяльных пытанняў. Яны ствараліся як самім таварыствам, так і губернскімі органамі ўлады, якія запрашалі да ўдзелу прадстаўнікоў ад Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі. Так, у 1882 г. Вайніловіч увайшоў у склад экспертнай камісіі сельскагаспадарчай выставы і камісіі аб уладкаванні дарог[13]. У 1883 г. ён быў выбраны саветам таварыства ў склад камісіі па распрацоўцы дарожнага пытання па Слуцкім павеце. У тым жа годзе ўваходзіў у камісію па абмеркаванні захадаў па стварэнні і развіцці дробнага вінакурства ў Мінскай губерні[14].

---

[11] Wojniłłowicz E. Wspomnienia 1847–1928. Cz. 1. Wilno, 1931. S. 41.

[12] Wojniłłowicz E. Wspomnienia 1847–1928. Cz. 1. Wilno, 1931. S. 43–44.

[13] Отчёт Минского общества сельского хозяйства за 1882 год. Минск, 1883. С. 2, 4.

[14] Отчёт Минского общества сельского хозяйства за 1883 год. — Минск, 1884. С. 2, 12.

16 кастрычніка 1883 г., з-за адсутнасці прэзідэнта таварыства на пасяджэнні агульнага сходу, згодна з § 42 статута, Э. Вайніловіч быў абраны старшынёй бягучага пасяджэння, што сведчыла аб яго аўтарытэце. У большай ступені на гэта ўказвае просьба агульнага сходу стаць дэлегатам ад таварыства на пасяджэннях суседняга Віцебскага таварыства сельскай гаспадаркі. Аб гэтым жа сведчыць прапанова Э. Вайніловічу стаць сталым карэспандэнтам таварыства ў сувязі з неабходнасцю распаўсюджвання інфармацыі аб яго дзейнасці ў друку[15].

Са сканчэннем тэрміну кадэнцыі В. Свіды як віцэ-прэзідэнта 10 студзеня 1888 г. былі praведзены новыя выбары. На гэту пасаду агульны сход абраў Э. Вайніловіча, хоць той адсутнічаў на гэтым пасяджэнні[16]. Новаабраны віцэ-прэзідэнт даслаў ліст з удзячнасцю і паведаміў, што з-за ўдзелу ў пасяджэннях Слуцкага міравога з’езда ў якасці ганаровага суддзі, ён не можа прысутнічаць на ўсіх пасяджэннях савета Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі. У сувязі з немагчымасцю больш цеснага ўдзелу ў справах Э. Вайніловіч прасіў абраць новага віцэ-прэзідэнта, калі таго патрабуе развіццё

[15] Отчёт Минского общества сельского хозяйства за 1884 год. Минск, 1885. С. 6–7.

[16] Журнал общего собрания Минского общества сельского хозяйства 10 января 1888 г. — Вып. I. Минск, 1888. С. 1–2.

таварыства. На што члены аб'яднання прасілі яго ўскласці на сябе абавязкі віцэ-прэзідэнта і выконваць іх на столькі, на колькі гэта будзе магчыма[17].

Ва ўмовах абмежавальнага заканадаўства дазвол на прыняцце ў склад Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі адкрываў перад прадстаўнікамі рэпрэсіраванага грамадства амаль адзіную верагоднасць выхаду за межы «прававой рэзервацыі». Гэту магчымасць у поўнай ступені выкарыстаў Э. Вайніловіч. За дзесяцігоддзе дзейнасці ў таварыстве ён праявіў сябе актыўным, ініцыятыўным і сумленным чалавекам, за што карыстаўся вялікай павагай як сярод мясцовых землеўласнікаў, так і прадстаўнікоў расійскага дзяржаўнага апарату. Прызнаннем аўтарытэту стала яго афіцыйнае выбранне ў 1888 г. на пасаду віцэ-прэзідэнта Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, якую ён займаў да 1907 г.

---

[17] Журнал общего собрания Минского общества сельского хозяйства 10-го марта 1888 года. Вып. IV. Минск, 1888. С. 9.

*Татьяна Долгач*

## ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ЭДВАРДА ВОЙНИЛОВИЧА В МИНСКОМ ОБЩЕСТВЕ СЕЛЬСКОГО ХОЗЯЙСТВА

Отмена крепостного права затронула все стороны жизни тогдашнего общества. Реформа 1861 г. предвещала новую жизнь не только для крестьян, но и для их бывших владельцев — помещиков. В конечном итоге она ускорила развитие капиталистических отношений в Российской империи и повлекла за собой ряд изменений в экономике, социальных отношениях, общественном устройстве и мировоззрении, а также изменила привычный уклад жизни в белорусско-литовских губерниях. За освобождением крестьян последовали преобразования в системе управления деревней, в социальной структуре общества, в судебной системе, образовании и других сферах. Все эти преобразования имели ограниченный и противоречивый характер, особенно по отношению к белорусско-литовским губерниям. Однако они обеспечили движение Российской империи по пути капитализма, поспособствовав выведению государства на более высокий уровень экономики.

В изучении столь важных исторических событий особую роль играют документальные источники личного происхождения: дневники, эпистолярные источники и мемуары. Информация, которая содержится в них, зачастую не находит отражения в других документах[1]. Мемуары современников событий всегда интересны тем, что позволяют понять общественные настроения времени, в котором жил автор. Очевидцем всех событий и явлений, которые последовали за отменой крепостного права, был Эдвард Войнилович. Его воспоминания являются важнейшим источником в изучении самой реформы, а также пореформенного развития белорусско-литовских губерний. Так, в книге «Воспоминания» он поделился своими впечатлениями, настроениями, изложил свою точку зрения на происходящие события.

В момент отмены крепостного права Э. Войниловичу было 14 лет. В то время он заканчивал Слуцкую гимназию. Позже, будучи в зрелом возрасте, он назвал реформу 1861 г. одним из событий, сыгравших важнейшую роль в жизни его семьи. Эдвард Войнилович вспоминал, что после прочтения «Акта об освобождении крестьян» его отец, придя домой, сказал: «Вот, детки, завтра пойду

---

[1] Улашчык, М. М. Мемуары і дзённікі як крыніцы па гісторыі Беларусі. – Мінск, 2000. С. 68.

сам кормить лошадей и коров, а вы мне будете помогать». Наступило тревожное утро, но все люди приступили каждый к своим обязанностям, словно ничего не произошло. Изменились только условия и оплата труда, но большинство из людей, трудившихся на землях Войниловичей, остались на своих должностях и при своих обязанностях.

Э. Войнилович называл реформу продуманной и спланированной и считал, что только события 1863 г. дали правительству предлог взять все дела крестьянской реформы в свои руки, тем самым ускорив ее осуществление в белорусско-литовских губерниях. «При этом вся реформа с экономической была переведена на платформу политическую путем противостояния местного польского населения, в основном католического, белорусскому населению, в большинстве своем православному. В этом направлении осуществлялись и последующие реформы в Западном крае, проводимые российским правительством»[2], — писал он позже. Э. Войнилович сетовал на то, что крестьянские дела после восстания перешли в руки к людям из глубинной России, «совершенно незнакомыми с местными условиями, обуреваемыми ненавистью ко всему местному, колоритному, что дышало культурой и древней традицией. От большинства

---

[2] Войнилович, Э. А. Воспоминания. – Минск, 2007. – С. 36.

этих «деятелей» глубинная Россия рада была избавиться как от элемента, заболевшего вирусом переворотов: уж пусть лучше свои теории претворяли в жизнь в Западном Крае, но не на территории Матери-России»[3]. Э. Войнилович полагал, что модернизационные процессы в аграрном секторе белорусско-литовских губерний тормозила «недоброжелательность органов государственной власти по отношению к нашему краю». Если бы удалось изъять этот неблагоприятный внешний фактор, то, по мнению Э. Войниловича, аграрная политика на территории Беларуси проходила бы такие же фазы, как и на Западе — сокращение больших латифундий и увеличение числа мелких землевладельцев, не нарушая права собственности и не вызывая классовой ненависти[4].

В 1888 г. Э. Войнилович был избран вице-председателем Минского Общества сельского хозяйства[5]. Множество воспоминаний посвящены именно этому периоду его жизни. Одним из наиболее болезненных вопросов, связанных с собственностью землевладельцев в белорусских и литовских губерниях, Э. Войнилович считал сервитутное право —

---

3 Войнилович, Э. А. Воспоминания. С. 36.

4 Войнилович, Э. А. Воспоминания. С. 36.

5 Шибеко, З. В. Минск в конце XIX — начале XX вв. Очерк социально-экономического развития. — Минск, 1985. С. 82.

пережиток периода крепостничества. Он отмечал: «Ненормальность ситуации и вред, наносимый экономике сервитутами, видел и Виленский генерал-губернатор М. Муравьев, который при передаче конфискованных имений лицам российского происхождения вычеркивал сервитуты, добавляя взамен к крестьянскому наделу по 3 десятины в собственность»[6].

С именем Эдварда Войниловича связан расцвет Общества. Дела в организации решались быстро и качественно не только благодаря заинтересованности участников общества – немаловажную роль в этом играл авторитет, мудрость и талант Войниловича. Несмотря на то, что он занимал пост вице-председателя, фактически, именно на его плечах лежала ответственность за всё происходившее в Минском сельскохозяйственном обществе, поскольку пост председателя имел исключительно почётный характер и его всегда занимал губернатор Минской губернии[7].

С избранием Эдварда Войниловича на пост вице-председателя хозяйственная деятельность Общества постоянно расширялась. В период с 1891 г. по 1901 г. Минское сельскохозяйственное общест-

---

[6] Войнилович, Э. А. Воспоминания. С. 97–98.

[7] Шыбека, З. В. Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі / З. В. Шыбека // ЭГБ. Т. 5. 1999. С. 170.

во приобрело бойню, приняло непосредственное участие в создании Общества взаимного кредитования, организовало Торговый отдел Минского общества сельского хозяйства и Общество взаимного страхования от пожаров. Позже стараниями Минского сельскохозяйственного общества в Минске стала действовать лесная биржа — одна из самых успешных в Российской империи. В имении Туганович Новогрудского уезда была создана экспериментальная станция, где проходили апробацию передовые сельскохозяйственные достижения[8]. Передовой европейский опыт хозяйствования, который Войнилович получил, стажируясь на заводах Германии и Бельгии, пригодился ему в Минске.

Разрастаясь, Общество расширяло штат сотрудников, тем самым предоставляя рабочие места «лицам польского происхождения», то есть тем, кто после подавления восстания 1863–1864 гг. не мог состоять на государственной службе. Деятельность общества имела важное положительное значение для местной экономики, поскольку при оказываемом им содействии сельскохозяйственным предпринимателям, импортная продукция не выдерживала конкуренции с местной и поставщики вынуждены были снижать цены[9].

[8] Войнилович, Э. А. Воспоминания. С. 104–105.

[9] Войнилович, Э. А. Воспоминания. С. 92.

Кроме непосредственно хозяйственных функций Минское общество сельского хозяйства помогало разрешать проблему недостаточной подготовки сельскохозяйственных кадров в Минской губернии. В момент возникновения Общества в ней не было ни одного учебного заведения, которое решало бы эту проблему[10]. Даже после того, как в 1880 г. открылась сельскохозяйственная школа в Марьиной Горке, оно продолжало свою деятельность, направленную на подготовку специалистов в области сельского хозяйства. В 1881 г. Общество обратило внимание на развитие мясо-молочного животноводства и предложило открыть в Марьиной Горке школу сыроваров. Позже оно внесло предложение о создании школы хмелеводства и плодоводства в имении Петровичи, принадлежавшем члену Общества М. Мышакову[11].

В одном из номеров польскоязычного журнала «Край», в котором часто публиковались статьи, посвящённые деятельности Минского общества

---

[10] Бухавец, П.П. Роля сельскагаспадарчых таварыстваў у стварэнні сельскагаспадарчых школ у Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. // Весці БДПУ. Серыя 2. 2014. № 4. С. 31.

[11] Бухавец, П.П. Роля сельскагаспадарчых таварыстваў у стварэнні сельскагаспадарчых школ у Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. // Весці БДПУ. Серыя 2. 2014. № 4. С. 32.

сельского хозяйства, было напечатано интервью с Эдвардом Войниловичем. Вице-председатель Общества указывал на необходимость введения среднего и специального образования для крестьян, поскольку считал, что именно безграмотность тормозила все модернизационные процессы и препятствовала развитию капиталистических отношений в белорусской деревне.

Одной из составляющих деятельности Минского общества сельского хозяйства была организация сельскохозяйственных и кустарно-промышленных выставок. Выставочное дело, имевшее популярность в Западной Европе, с середины XIX в. стало неотъемлемым элементом экономической жизни и в Российской империи. Участие в выставках давало возможность провести своеобразную рекламную кампанию своей продукции; исследовать конъюнктуру рынка; познакомиться с потенциальными конкурентами, технологическими и техническими новинками. Аукционы, конкурсы, система награждений, являвшиеся обязательной частью выставок, стимулировали конкуренцию, тем самым оживляя рынок. Как в Российской империи в целом, так и в белорусско-литовских губерниях в частности, выставки изначально являлись государственной инициативой. Постепенно выставочное дело перешло в руки общественных

(экономических и научно-технических) организаций[12].

Знаменательным событием, имевшим важное значение для жизни Минского общества сельского хозяйства, стала выставка 1883 г. Она предоставила возможность землевладельцам, прибывшим в Минск в качестве участников, познакомиться, обсудить существующие в аграрном секторе недостатки, получить представление об улучшенных пародах скота и усовершенствованных сельскохозяйственных орудиях[13].

Минское общество сельского хозяйства неоднократно устраивало выставки в Минске. Однако наиважнейшим эпизодом в жизни Общества стала большая юбилейная выставка 1901 г., приуроченная к празднованию 25-летнего юбилея организации. Эта выставка стала поводом для гордости Общества и лично для его вице-председателя. Выставки семян, овощей и фруктов, достижений животноводства уже проводились и раньше в амбарах и залах Общества. Но только выставка 1901 г. смогла продемонстрировать не только узкому кругу людей, а всему региону, достижения Минского общества сельского хозяйства за четверть века.

---

[12] Киштымов, А. Л. Беларусь в выставках XIX — начала XX в.: автореф. дис... канд. ист. наук. Минск, 2001. С. 19.

[13] Киштымов, А. Л. Беларусь в выставках XIX — начала XX в.: автореф. дис... канд. ист. наук. С. 56.

Для финансирования выставки был создан гарантийный фонд, освобождающий кассу Общества от растрат в связи с проведением мероприятия[14]. Накануне выставки Минское сельскохозяйственное общество попросило денежную помощь в размере 3 тыс. руб. у Департамента земледелия Министерства государственных имуществ. Несмотря на то, что Департамент признал проведение выставки желательным событием, на нужды мероприятия было выделено только 1 000 руб. Содействие минской выставке оказало Императорское Вольное экономическое общество. Также денежные субсидии последовали от Минского общества взаимного кредита, Минского коммерческого банка. Расходы на проведение выставки составили 41 тыс. 621 руб., из которых 13 тыс. 500 руб. были собраны «по подписке»[15]. Благодаря организаторскому таланту и огромной трудоспособности кураторов, выставка принесла прибыль. Этот капитал остался в фонде, предназначенном для организации выставок в будущем[16].

В павильонах выставки можно было увидеть широкий ассортимент товаров: технику, селекци-

---

[14] Войнилович, Э. А. Воспоминания. С. 100.

[15] Киштымов, А. Л. Беларусь в выставках XIX – начала XX в.: автореф. дис... канд. ист. наук. С. 57.

[16] Войнилович, Э. А. Воспоминания. С. 101.

онные породы домашних животных и сельскохозяйственных культур, древесину разных парод, лесные саженцы, цветы, масла и вина, лечебный кефир, коллекции молочных бактерий, гербарии лекарственных растений. В павильонах ремесленников большинство изделий принадлежало минским производителям (48 экспонатов из 102). Среди прочего были представлены предметы мебели, черепица, кафель, кирпич, музыкальные инструменты, изделия из серебра и золота, косметика и парфюмерия. Некоторые участники экспонировали на выставке группы товаров. Например, помещик Минской губернии Кароль Эмерикович Чапский представил коллекцию саженцев, чистопородный крупный рогатый скот, лошадей станьковского племенного завода, кирпич, черепицу и многое другое[17].

Юбилейная выставка 1901 г. продемонстрировала достижения сельского хозяйства в белорусско-литовских губерниях, талант и высокий уровень организаторских способностей фактического руководителя Общества — Э. Войниловича. Она предоставила возможность многочисленным гостям ознакомиться со структурой и жизнестойкостью экономики Минщины.

---

[17] Шыбека, З. В. Мінск сто гадоў таму. Мінск, 2007. С. 188.

Председательствуя в Минском обществе сельского хозяйства, Э. Войниловичу доводилось общаться чаще всего непосредственно с помещиками, но о проблемах и нуждах крестьян он знал не понаслышке. В 1883 г. Э. Войнилович стал почётным мировым судьёй Слуцкого уезда и оставался на этой должности 35 лет.

Ещё до отмены крепостного права правительственный апарат Российской империи приступил к подготовке ряда преобразований, среди которых значилась и судебная реформа. Переход к новым социально-экономическим отношениям подталкивал руководство государства к учреждению суда, соответствующего нововведениям. Датой начала проведения судебной реформы считается 20 ноября 1864 г., когда Александром II были утверждены «Учреждение судебных установлений», «Устав уголовного судопроизводства», «Устав гражданского судопроизводства» и «Устав о наказаниях, налагаемых мировыми судьями»[18]. Согласно документам, в Российской империи создавались местные и общие суды, которые имели по 2 инстанции: мировые суды и съезды мировых судей (в качестве апелляционной инстанции), которые осуществля-

---

[18] Гушчынскі, І. Г. Роля судовых устаноў у палітычным жыцці і сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі (1864–1914 гг.): аўтарэф. дыс... канд. гіст. навук. Мінск, 2011. С. 1.

ли судебную практику на местах; окружные суды и судебные палаты, которые выносили приговоры по сложным уголовным и гражданским делам. Судами первой инстанции, максимально приближенными к населению, были мировые суды. В их компетенцию входило рассмотрение гражданских и мелких уголовных дел, наказания по которым предусматривали: выговоры и замечания; штрафы, размером до 300 руб.; аресты, сроком не более 3-х месяцев; лишение свободы, сроком не более 1 года.

Новое судебное законодательство провозглашало всесословность, независимость суда от администрации, гласность и ряд других буржуазно-демократических начинаний. В белорусско-литовских губерниях реформа проводилась значительно позже ( 1872 г.) и имела ограниченный характер, поскольку, по мнению законодателя, она должна была способствовать укреплению «русского элемента» и блокированию «польской пропаганды» в регионе. Поэтому мировые судьи на территории Беларуси не были выборными[19]. Однако введение института мировых судей обеспечило доступность и высокую скорость судопроизводства, так как процедура рассмотрения дел в мировом суде

---

[19] Жытко, А. П. Судовая рэформа (пачатак 60-х гг. XIX ст. — канец XIX ст.) / А. П. Жытко, І. Г. Гушчынскі // Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму. Ч. 4. Мінск, 2009. С. 50.

имела упрощённый характер: обращение к мировому судье не требовало уплаты пошлин, судья должен был реагировать в том числе и на устные жалобы, оформление судебного протокола осуществлялось в свободной форме, инициатива в возбуждении уголовных дел принадлежала частным лицам[20].

Мировой суд состоял из одного человека — мирового судьи, к личности которого предъявлялись определённые требования: подданство Российской империи, возраст свыше 25 лет, мужской пол и нравственная безупречность[21]. Мировые судьи в Российской империи могли быть участковыми или почётными. Разница заключалась в том, что почётный судья, в отличие от участкового, не получал жалования. Служебные обязанности мирового судьи заключались в рассмотрении гражданских и мелких уголовных дел. Кроме того, мировой судья должен был принимать письменные и устные жалобы и прошения лично и в любое время, ни под каким предлогом не отказываясь от этого. Обязанности почётного мирового судьи практически не отличались от обязанностей участкового. Однако

---

[20] Полянский, Н. Мировой суд // Судебная реформа. М., 1915. С. 173.

[21] Полянский, Н. Мировой суд // Судебная реформа. С. 170.

в свои полномочия почётный судья вступал только в момент пребывания на своём судебном участке. При отсутствии в уезде участкового судьи все его полномочия и обязанности делегировались почётному судье. Поскольку почётный судья не получал за свой труд вознаграждения, то за ним оставалось право занимать многие другие государственные или общественные должности[22].

Эдвард Войнилович неоднократно подчёркивал в своих мемуарах, что к своим обязанностям относился ответственно, а должностью мирового почётного судьи гордился. Многолетние наблюдения за жизнью белорусской деревни привели его к мысли о том, что для улучшения состояния сельского хозяйства белорусско-литовских губерний необходимо сближение «шляхецкага маёнтка і сялянскай хаты»[23].

Плодотворная и талантливая деятельность Эдварда Войниловича была отмечена предложением П. А. Столыпина стать вице-министром сельского хозяйства Российской империи, от которого Войнилович отказался[24].

---

[22] Полянский, Н. Мировой суд // Судебная реформа. С. 169.

[23] Электронны рэсурс: http://www.istpravda.ru/bel/research/766/ Мельнікаў, І. Польская гістарыяграфія дзейнасці Мінскага сельскагаспадарчага таварыства. — Дата доступу: 20.01.2016.

[24] Войнилович, Э. А. Воспоминания. С. 365.

Таким образом, «Воспоминания» Эдварда Войниловича о его деятельности на посту вице-председателя, затем председателя Минского общества сельского хозяйства, а также на посту почётного мирового судьи Слуцкого уезда дают представление об эпохе: проблемах дворянства белорусско-литовских губерний, нуждах и чаяниях крестьян, взаимоотношениях крестьян, помещиков, местных и центральных властей. Аграрная реформа 1861 г. внесла коррективы во все сферы жизни общества. Новшества, последовавшие за отменой крепостного права, требовали немедленного изменения в мировоззрении современников преобразований. Человеком такого нового склада был Э. Войнилович — образованный первоклассный экономист, инициативный и деятельный руководитель, который сумел вывести экономическое развитие Минской губернии на новый уровень.

Современник Э. Войниловича, литературовед, философ и ректор Виленского университета Мариан Здзеховский, анализируя образ мышления и деятельность главы Минского общества сельского хозяйства, отзывался о нём так: «Эдвард Войнилович был живым воплощением любви к матери-земле, которая его родила и воспитала, был связан с ней всей своей душой»[25]. Личные ка-

[25] Zdziechowski, M. Widmo przyszłości. Warszawa, 1999. C. 67.

чества Э. Войниловича, блестящее образование, богатый опыт хозяйствования сделали его одним из самых уважаемых и влиятельных людей Минщины. Корректное отношение к оппонентам не раз помогало ему осуществлять свои замыслы и проекты, столь полезные для белорусско-литовских губерний.

*Уладзіслаў Завальнюк*

# ХРЫСЦІЯНСКІ АСКЕТЫЗМ — ЛЁС ЭДВАРДА ВАЙНІЛОВІЧА

У аснове сацыяльнага вучэння хрысціянства ляжаць Святое Пісанне – кнігі Старога і Новага Запавету і Святое Паданне – звесткі і кананічныя палажэнні, што вызначаюцца цэрквамі, якія прама не ўтрымліваюцца ў Старым або Новым Запавеце: каноны, аўтарызаваныя цэрквамі літургічныя тэксты, творы Айцоў Царквы, жыціі святых, а таксама царкоўныя абрады. З адзначанага вынікае, што разуменне прынцыпаў арганізацыі грамадства, сацыяльнай справядлівасці ўзыходзяць непасрэдна да ідэй і прынцыпаў, якія змяшчаюцца ў гэтых крыніцах. Аднак іх трэба асіліць.

Для Бібліі чалавек служыць аб'ектам этычнага разгляду толькі ў якасці асобы Божага Уладарства, як стварэнне Божае, адкупленае Госпадам Збаўцам і забяспечанае Божай ласкай у дасягненні належнай дасканаласці.

У адраджэнні сваім кожная хрысціянская асоба ўзнагароджваецца годнасцю Божага паходжан-

ня, таму будзе жыць этычна нармальна (маральна) толькі пры той умове, калі заўсёды захавае адпаведнасць свайму хрысціянскаму званню праз яго развіццё і ўмацаванне ў Царкве Хрыстовай на шляху да Царства Бога і Айца. Сутнасць хрысціянскай маральнай сістэмы дасканала выкладзена ў Святых Пісанні і Паданні, якія дэталёва вывучаюцца на працягу дваццаці стагоддзяў.

Яшчэ у XVII ст. Максім Грэк, які добра ведаў народнае жыццё і спасціжэнне людзмі веры, у сваіх пропаведзях адзначаў, што ў часткі вернікаў ўсталявалася практыка, быццам малітва і пост складаюць тое, што ўводзіць чалавека ў царства нябеснае. Яны ствараюць для сябе такое паняцце аб набожнасці, каб, не клапоцячыся пра маральна-добрыя справы, старанна праводзіць у частых і працяглых малітвах і строга выконваць пост.

На думку Максіма, гэта не зусім адпавядала запаветам Хрыста. Не малітва і пост, а належнае хрысціянскае жыццё і асабліва справы любові да бліжніх складаюць сапраўдную набожнасць. Пра тое ў Старым Запавеце Бог казаў вуснамі прарокаў: «Ибо я милости хочу, а не жертвы, и Боговедения более чем всесожжения» (Осія 6, 6). У Новым Запавеце Збаўца даў дзве запаведзі пра любоў да Бога і бліжніх: «Не всякий, говорящий мне: “Господи! Господи!”, войдет в Царство Небесное,

но исполняющий волю Отца Моего Небесного» (Мф. 7, 21)[1].

У XIX ст. вучэнне пра мараль у хрысціянстве аформіліся ў выглядзе спецыяльнай навукі, а як палажэнні пра хрысціянскае жыццё яно пераходзіць у хрысціянскую філасофію. Спроба растлумачыць паняцце «маральнасць» упершыню была зроблена І. Л. Янышавым. Ён даў ўсім элементам, што ўваходзяць у гэта ўніверсальнае паняцце, больш-менш яснае і дакладнае вызначэнне, паказаў іх узаемную псіхалагічную сувязь.

Абрунтаваўшы, што такое маральная годнасць і прызначэнне чалавечай прыроды, Іаан Лявонцьевіч зрабіў спробу вызначыць вярхоўнае дабро і як яно ажыццяўляецца выратаваннем менавіта ў Хрысце[2]. Навуковец даў тэарэтычную канструкцыю маральнай сістэмы з дапамогай паглыбленага аналізу самой ідэі маральнасці. Менавіта у аскетызме аўтар распазнаў «сэнс подзвігаў хрысціянскага самаўдасканалення (самавыхавання) па ўсіх аспектах рэлігійна-маральнага жыцця, праз што хрысціянін павінен самастойна стварыць у сабе

---

[1] Голубинский, Е. Е. История Русской Церкви. В 4 т. Т. 3. М.: Крутицкое патриаршее подворье, 1997. 920 с. (С. 807–810).

[2] Янышев, И. Л. Православно-христианское учение о нравственности. СПб.: Тип. М. Меркушева, 1906. 462 с.

і таму зрабіць неад’емным ад сябе тое Царства Божае, якое ён зведаў у сабе падчас адраджэння і якое цяпер зноў нібыта скрылася ад яго. «Царства нябеснае», вучыць Збаўца, «силою берется, и употребляющие усилие восхищают его» (Мф. 11, 13)[3].

І. Л. Янышаў лічыў аскетызм асноўным патрабаваннем маральнага закону. Але строгі ўклад жыцця не манаскі, які складаецца з практыкаванняў у дбанні, посце, малітвах і іншых подзвігах, а аскетызм ў самым шырокім яго сэнсе. Іаан Лявонцьевіч меў на ўвазе такі лад жыцця, як панаванне над стыхійнымі інстынктамі арганізма, што патрабуе і садзейнічае развіццю маральных якасцей: мудрасці, мужнасці, цярпення, устрымання, працавітасці.

У святаайчыннай літаратуры канстатуецца, што менавіта аскеза садзейнічае набыццю пэўных духоўных здольнасцей (веры, надзеі, кахання, паслухмянасці, унутранай свабоды) і маральных якасцяў (цярпення, сціпласці, шчырасці, самаадданасці, дабрыні, умення даравать).

Сёння «Каталіцкая энцыклапедыя» пашырае разважанні І. Л. Янышава і звяртае ўвагу, што формы аскетычнай практыкі, якія залежаць ад канкрэтных мэт або культурна-гістарычных умоў, могуць быць самымі разнастайнымі. Але выкарыстоўва-

---

[3] Там жа. С. 433.

емыя сродкі ніколі не павінны станавіцца самам-этай, замяняць сабой паглыбленне адносін з Богам, што з'яўляюцца сапраўднай мэтай хрысціянскай аскезы[4].

Тэме маральнага вучэння, а ў яго кантэксце праблематыцы аскетызму і посніцтва вялікая ўвага нададзена ў даследаваннях прафесараў П. П. Панамарова і С. М. Зарына. П. П. Панамароў, які даскана ла ведаў старажытныя мовы, у даследаванні «Дагматычныя асновы хрысціянскага аскетызму па творах усходніх пісьменнікаў-аскетаў IV стагоддзя» дэталёва прааналізаваў святаайчынную аскетычную літаратуру, раскрыў прыроду аскетызму, указаў на сатэрыялагічную аснову аскетызму як яго прынцыповую магчымасць[5].

Прадоўжыў і значна пашырыў даследаванне аскетыкі і посніцтва прафесар С. М. Зарын. Сяргей Міхайлавіч, спасылаючыся на св. Пісанне, дэталізаваў гэту практыку. Ён сцвярджаў, што пачатак практыкі хрысціянскай аскезы і посту ўзыходзіць да прыкладу самога Хрыста і Яго апосталаў[6].

---

4 Католическая энциклопедия. «Научная книга». В 5 т. Т. 1. М.: Издательство францисканцев, 2002. 1906 с.(382)

5 Пономарев, П. П. Догматическое основы христианского аскетизма по творениям восточных писателей-аскетов IV века. Казань: 1899. 217 с. (С. 82–100).

6 Зарин, С. М. Аскетизм по православно-христианскому учению. В 3 т. Т. 1. СПб.: Тип. Киршбаума, 1907. 694 с. [С. 632].

Навуковец адносіў пост і аскезу да ліку сярэдніх добрых спраў, адметнай рысай і характэрнай асаблівасцю якіх з'яўляецца тое, што калі правільна выконваць іх, то яны асвячаюць. У хрысціянскай традыцыі — гэта шлюб, маёмасць, адзінота, дбанне, чытанне святых кніг. Таму родапачынальнікі падзвіжніцтва, адзначаў С. М. Зарын, загадалі здзяйсняць іх згодна з абставінамі, месцам і часам, паколькі яны бываюць карысныя, калі адпавядаюць гэтым абставінам, і, наадварот, робяцца шкоднымі, калі не суадносяцца з імі[7].

Эталонам такой асктыкі ў гісторыі Беларусі можна лічыць лёс Э. Вайніловіча, а таксама яго гаспадарчую дзейнасць і хрысціянскія ўчынкі. Тэхнолаг па адукацыі Э. Вайніловіч пасля смерці бацькі ў 1874 г. уступае ў валоданне радавымі маёнткамі Савічы і Пузава і звязвае свой лёс з зямлёй. Адначасова ён становіцца актыўным грамадскім дзеячам (далучыўся яшчэ пры жыцці бацькі), ажыццяўляе папячыцельства над асірацелымі сем'ямі суседзяў. Свае грамадскія абавязкі выконваў з такой добрасумленнасцю, дакладнасцю, справядлівасцю, здольнасцю ісці на кампрамісы, што заслужыў давер і павагу. Выконваючы гэту цяжкую працу, якая адымала шмат часу, Эдвард набыў найбагацейшы жыццёвы вопыт і быў

[7] Там жа. С. 638

дасведчаны ў сямейных і маёмасных пытаннях сваіх землякоў.

Аднак у сямейным жыцці Э. Вайніловіча перачледавалі няшчасці, адно за адным абвальваліся на яго цяжкія выпрабаванні. У 1897 г. памірае адзіны 12-гадовы сын, апошні нашчадак старадаўняга роду. Падняцца няшчаснаму бацьку пасля такога страшнага ўдару дапамагла вялікая і моцная вера ў Бога. У сваім завяшчанні ён напісаў: «Бог даў мне сілы, каб я не ўпаў, Бог даў мне шчасце, якое зведалі, хіба што благаславёныя — бо захаваў для мяне дачку Алёну, добрыя якасці характару і розуму якой былі для мяне выразным знакам міласэрнасці Божае над галавой маёй»[8]. 12 лютага 1903 г. напярэдадні свайго дзевятнаццацігоддзя памерла дачка Алёна. Пераадольваючы цяжар гэтага страшнага гора, ён піша, падобна да біблейскага Іовы, поўныя пакоры словы: «Бог адабраў тое, што некалі нам даў, відаць мы былі няварты таго шчасця, якое мелі. Мы вучылі нашу дачку, як жыць, яна навучыла нас, як паміраць. Дай Божа і нам калі-небудзь так смела зірнуць смерці ў вочы. Я разумею цяпер, што значаць словы: "Сумная мая душа аж да смерці". (...) А я грэшны, бо дагэтуль за Гэльку маліцца не ўмею,

---

[8] Хмялеўская, Гізэля. Церні Крэсаў: аповесць пра Эдварда Вайніловіча і яго сям'ю / пер. з польск. В. Ждановіч. Мінск. : Выд. В. Хурсік, 2015. 376 с. (С. 73).

а малюся, хутчэй, да яе, як да нейкай благаслаўлёнай, і маю яе нібыта за апякунку і пасланніцу сваю перад Панам — і прашу Найсвяцейшую Маці, каб яе паставіла каля ложа майго канання»[9]. Лёс Эдварда ўсё больш і больш пачынаў нагадваць лёс біблейскага Іовы. Пры гэтым ён разумее жыццё толькі з Богам. Ва ўспамінах Э. Вайніловіч адзначае: «У сувязі з цяжкімі ўдарамі лёсу, якія па волі Усявышняга абрушыліся на мяне, я вырашыў зрабіць ахвяраванне шляхам пабудовы храма Святых Сымона і Алены — заступнікаў маіх памерлых дзяцей. Для гэтай мэты я абраў Менск як горад, якому аддаў вялікую частку сваёй грамадскай дзейнасці, і які больш за ўсіх меў патрэбу ў другім касцёле. Я хацеў, каб Менск меў храм, які вылучаецца на фоне сучасных новых будынкаў. Меркаваў таксама, што немагчыма, каб сярод людзей, якія маліліся на новым месцы, ніхто не ўспомніў бы пра мецэната і "Анёла Гасподняга", не прачытаў бы пацеры за мяне і за маіх памерлых дзетак, апошніх нашчадкаў нашага старажытнага роду»[10].

На гэтым выпрабаванні лёсу не скончыліся. Праз сямнаццаць гадоў (7 ліпеня 1920 г.) гнаныя Грамадзянскай вайной Ваніловічы пасля 350 гадоў вало-

---

[9] Там жа. С. 85.

[10] Войнилович, Эдвард. Воспоминания: пер. с польск. Минск, 2007. 380 с. (С. 126).

дання зямлёй у Савічах, такіх любімых і тых, што жылі ва ўспамінах стольківх пакаленняў, пакінулі родную Айчыну[11].

Выдавец мемуараў Э. Вайніловіча Януш Івашкевіч у «Прадмове» да «Успамінаў» як нельга дакладна адзначыў, што для двух пакаленняў Э. Вайніловіч быў вялікім прыкладам і ўзорам публічнага жыцця і любові да Радзімы. Для Міншчыны, а больш за ўсё для літоўска-беларускай губерні быў тым, чым у свой час для Кангрэсувкі быў Андрэй Замойскі, для Галіцыі – князь Леў Сапега, Пазнанскага павета – генерал Хлапоўскі, Негалеўскі, Марцінкоўскі, для паўднёвых ускраін – князь Раман Сангушка, Рэйтан і Касцюшка – характары, выкаваныя з аднаго каштоўнага металу – грамадзянскага служэння Радзіме, блізкія па духу, ладзе жыцця і паходжанні. Быў, як правільна заўважыў у пасмяротных ўспамінах Ян Лютаслаўскі, «паходняй, якая асвятляла асаблівым маральным полымем», гонарам і славай Крэсаў ...[12].

Сучасныя даследчыкі Бібліі маральны пафас кнігі Іовы бачаць у сцвярджэнні ісцін: традыцыйная дактрына прычыннай сувязі паміж пакутай і грахом ілжывая; веліч Божых спраў, якая перавышае чалавечае разуменне, служыць доказам Бо-

---

[11] Там жа. С. 325.

[12] Там жа. С. 20.

жай справядлівасці; сувязь, адпавядаючая лёсу індывіда, з яго маральнымі заслугамі застаецца для чалавека таямніцай. Больш за тое ў святле пазнання Іовам Божай велічы і сілы пытанні, звернутыя ім да Бога, губляюць сваю дарэчнасць: толькі пры ўмове, што чалавек здольны зразумець мудрасць і сілу Бога, ён можа зразумець і шляхі Божага наканавання. Іоў ўсведамляе поўную немагчымасць гэтага і заключае: «Поэтому я отрекаюсь и раскаиваюсь в прахе и пепле» (42:6).

Эдвард Вайніловіч памёр 16 чэрвеня 1928 г. У канцы дзённіка ён напісаў рукой, скаванай блізкасцю смерці, простыя, поўныя паслушэнства, пакоры і супакою словы: «Відаць, з гэтай хваробы не выйду: на ўсё воля Божая. Э. Вайніловіч»[13]. Гэта яшчэ раз сведчыць пра яго жыццё ў Хрысце, паказвае прыклад хрысціянскай аскетыкі.

[13] Там жа. С. 6.

*Раіса Зянюк, Валянціна Яноўская*

## ТРАДЫЦЫІ ФУНДАТАРСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў БЕЛАРУСІ

У даследаваннях пра асобу, дзейнасць і час Э. Вайніловіча асаблівы акцэнт робіцца на ім як на фундатары аднаго з найбольш вядомых рымска-каталіцкіх храмаў Беларусі. Заснаванне Э. Вайніловічам касцёла св. Сымона і Алены ў пачатку XX ст. у Мінску прадстаўляецца ў пэўным сэнсе як гераічны ўчынак, нетыповая з'ява, вынік жыццёвай трагедыі. Што датычыцца асабістых матывацый, то тут усё правільна. Разам з тым, неабходна адзначыць, што такога роду дзейнасць неадзінкавая ў Беларусі, яна была моцна ўпісана ў традыцыі і светапогляд нашых продкаў.

Фундатар — гэта асоба, якая фінансавала будаўніцтва, забяспечвала матэрыяльна храм і вызначаныя інстытуты пры ім. Традыцыйна фундатарамі з'яўляліся прадстаўнікі заможнага слоя насельніцтва, да якіх адносіліся шляхта і духавенства. Значную групу фундатараў складалі прадстаўнікі каралеўскай сям'і. Напрыклад, у 1504 г. па фундацыі вялікага князя літоўскага Аляксандра Ягелон-

чыка, а таксама гетмана літоўскага і ваяводы полацкага Я. Кішкі быў заснаваны касцёл і кляштар для бернардзінцаў у Будславе. Фундуш для Віленскіх дамініканцаў надаў вялікі князь Аляксандр. Фундуш на касцёл у Адэльску (сёння Гродзенская вобласць) у 1601 г. надаў кароль Жыгімонт III. Першы касцёл у Астроўне (сёння Бешанковіцкі раён) фундаваў Жыгімонт Аўгуст[1].

Прадстаўнікі духавенства таксама былі фундатарамі. Так, у 1621 г. касцёл і кляштар дамініканцаў у Полацку фундаваў кс. Тамаш Гірскі, пралат Віленскі; у в. Альковічы (сучасны Вілейскі раён) драўляны касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі ў 1722 г. фундаваў біскуп Аляксандр Гараін[2].

Асноўную групу фундатараў складалі магнаты і шляхта. Напрыклад, Сымон Караль Агінскі ў Вільні фундаваў касцёл св. Тэрэзы пры кляштары кармелітаў босых у прадмесці Рыбакі. У сярэдзіне XVII ст. падканцлер літоўскі Казімір Леў Сапега заснаваў касцёл і кляштар картэзіянцаў у Бярозе. Князь Марцыян Агінскі ў 1720 г. фундаваў у сваім маёнтку Мікуліне касцёл св. Антонія і кляштар бернардзінцаў. Ён жа выдаткоўваў грошы на касцёл

---

1 Кулагін А. М. Каталіцкія храмы Беларусі. Мінск, 2008. С. 9, 17, 41.

2 Wołyniak. Wykaz klasztorów Dominikańskich prowincji Litewskiej. Kraków, 1917. S. 174.

і кляштар кармелітаў у Вільні, месца спачыну свайго бацькі[3]. Віцебскі ваявода Марцыян Міхал Агінскі быў фундатарам віцебскага езуіцкага калегіума. Амаль цалкам на яго сродкі быў узведзены касцёл св. Юзафа. Касцёл у Беніцы (сёння Маладзечанскі раён) фундаваў трокскі кашталян Міхал Казімір Коцел. Мсціслаўскі ваявода Юзаф Корсак фундаваў у Беразвечы касцёл і кляштар для базыльян.

Асноўныя прычыны, якія ўплывалі на жаданне заснаваць храм, былі звязаныя з важнейшымі падзеямі жыццёвага цыкла чалавека. Найбольш важныя з іх: шлюб, нараджэнне дзіцяці, аздараўленне дзіцяці, старасць, адсутнасць нашчадкаў. Напрыклад, з нагоды шлюбу фундавалі кляштар дамініканцаў у Ракаве Геранім Сангушка і Канстанцыя Тэадора з Сапегаў. Яны ж фундавалі кляштар у Смалянах пасля нараджэння першынца Казіміра. На схіле жыцця вырашыў заснаваць у Чашніках кляштар дамініканцаў Жыгімонт Слушка. Адсутнасць сям'і і нашчадкаў была прычынай фундацыі касцёла і кляштара ў Палонцы Стэфанам Бжуханьскім, ордэн прапаведнікаў у гэтым выпадку станавіўся і спадкаемцам фундатара[4]. Значную групу фун-

---

3 Храпавіцкая Л. Род фундатараў і мецэнатаў // Віцебскі сшытак. 1995. №1. С. 44.

4 Зянюк Р. Ордэн прапаведнікаў на землях Беларусі // Наша вера. 2015. № 2. С. 9–10.

датараў складалі ўдовы. Так, у Хатаевічах касцёл і кляштар дамініканцаў заснавала Барбара Канстанцыя Друцкая-Горская, у Ельні — Зоф'я Марыяна Адахоўская і Ганна Пшэслаўская.

Адной з прычын выдзялення сродкаў на пабудову касцёла/манастыра была таксама цесная сувязь сям'і або канкрэтнай асобы з пэўным ордэнам. Тут маецца на ўвазе членства ў свецкім ордэне, куды прымалі свецкіх асоб, або уступленне ў манастыр таго ці іншага ордэна кагосьці з сям'і. Напрыклад, з ордэнам дамініканцаў такія сувязі мелі сем'і Сапегаў, Радзівілаў, Патоцкіх. Сапегі былі фундатарамі дамініканскіх касцёлаў і манастыроў у Астроўне, Гродне, Беліцы, Заслаўі. Пра Патоцкіх існавала нават прымаўка: *tam diu domus Potociana quam diu religio dominikana* (так доўга будзе стаяць дом Патоцкіх, як і дамініканская традыцыя/рэлігія)[5].

Фундатары не толькі выдзялялі сродкі на сам працэс будаўніцтва і будаўнічыя матэрыялы. Акрамя ўзвядзення храмавага гмаху, храм і духавенства, якое павінна было працаваць пры ім, забяспечваліся зямельнымі ўладаннямі з сялянамі; воднымі рэсурсамі (рэкамі і азёрамі), што давала права або займацца рыбнай лоўляй для забеспячэння ўласных патрэб, або здаваць іх у арэнду; лесам (пры-

[5] Зянюк Р. Ордэн прапаведнікаў на землях Беларусі // Наша вера. 2015. № 2. С. 10.

бытак ад продажу і вырубкі, забеспячэнне ўласных патрэб); корчмамі (прыбытак ад здачы ў арэнду або ўласна прыбытак); пляцамі ў горадзе або мястэчку (здача ў арэнду); а таксама сумамі грошай (аддаваліся пад працэнты пераважна яўрэйскім кагалам).

Пры выдзяленні сродкаў на будаўніцтва храма ці манастыра, або храма і манастыра фундатар дакладна агаворваў абавязкі духавенства, якое павінна было потым працаваць пры касцёле. Гэта былі так званыя «духоўныя аблігацыі». Напрыклад, першапачатковымі фундушавымі абавязкамі драгічынскіх францысканцаў ад Міхала Ажэшкі, маршалка пінскага, было адпраўляць штотыдзень па тры імшы за фундатараў — у сераду, пятніцу і суботу — і спяваць гадзінкі[6]. Першапачатковымі фундушавымі абавязкамі дамініканцаў Стаўбцоўскага кляштара былі наступныя: 1) кожную нядзелю адпраўляць адну імшу за душы фундатараў; 2) кожную суботу за душу Багуслава адпраўляць адну імшу; 3) таксама ў суботу за душу Ганны Слушкі — адну імшу і адну за Міхала Даманьскага; 4) штомесяц — за душу Яна Коса і асобна — за душу Ганны Акіньчовай па дзве імшы; 5) штомесяц за душы Яна Цельшаўскага і Багуслава Пясецкага па дзве імшы; 6) за душу Зоф'і Пілецкай — дзве імшы што-

[6] Makarczyk J. Prowincja litewsko-białoruska zakonu braci mniejszych konwentualnych w latach 1687–1845. Grodno, 2012. S. 38.

месяц і за душы Максімільяна і Юдыты Стравінскіх — адну імшу[7]. Такім чынам, фундацыя забяспечвала практычна няспынную малітву за асобы і душы фундатараў, як пры жыцці, так і пасля смерці. Улічваючы ўзровень тагачаснай рэлігійнасці насельніцтва Беларусі для заснавальнікаў храмаў гэта быў вельмі важны фактар.

Сярод ўмоў фундацыі выдзялялася функцыянаванне пры храме дабрачынных і асветніцкіх інстытутаў. Так, адной з умоў фундацыі Іосіфа Корсака для базыльян у Беразвечы з'яўлялася дзейнасць пры манастыры школы. Такую ж умову мела фундацыя Р. Шчыта для дамініканцаў у Забялах (цяпер Верхнядзвінскі раён).

Фундатар меў шэраг прывілеяў. Ён меў магчымасць абіраць архітэктурны праект (напрыклад, засноўваючы касцёл Божага Цела ў Нясвіжы, Мікалай Кшыштаф Радзівіл Сіротка запісаў: «Заснаваў касцёл новы, які павінен быць пабудаваны крыжам з купалам пасярэдзіне»[8]). Да прэрагатывы

---

7 Зянюк Р. Ордэн прапаведнікаў на землях Беларусі // Наша вера. 2015. № 2. С. 10.

8 Электронны рэсурс: Нясвіжскі езуіцкі касцёл: электрон. данные. Белорусская цифровая библиотека LIBRARY.BY, 17 февраля 2003. — Рэжым доступа: http://library.by/portalus/modules/belarus/readme.php?subaction=showfull&id=1045495431&archive=refhis1126089824&start_from=&ucat=& (свободный доступ). Дата доступа: 20.01.2016.

фундатара адносілася і вызначэнне колькасці духавенства пры храме, а яго нашчадкі маглі абіраць і прапаноўваць для зацвярджэння біскупу святароў, якія павінны былі працаваць пры храме. Найчасцей фундатара і членаў яго сям'і пасля смерці хавалі ў заснаваным ім храме. Дзейнічалі і сямейныя пахавальні: Сапегаў — у Бярозе пры касцёле картэзіянцаў (8 пакаленняў); Радзівілаў — у Нясвіжы (больш за 100 пахаванняў), Святаполк-Мірскіх — у Міры.

Поліканфесійнасць грамадства, якое пражывала на беларускіх землях, адбівалася і на шматвектарнай фундатарскай дзейнасці. Так, сем'і і асобы, якія належылі да адной канфесіі, у сваіх уладаннях будавалі храмы і для прадстаўнікоў іншай канфесіі, калі такія там пражывалі. Такая традыцыя была вельмі распаўсюджанай у выпадку, калі фундатар быў каталіком, а сяляне ў яго ўладаннях вызнавалі праваслаўе або ўніяцтва. Напрыклад, пасля пераходу ў каталіцтва Сымон Караль Агінскі матэрыяльна падтрымліваў праваслаўны Віцебскі Маркаў манастыр. Пры ім жа быў спонсарам будаўніцтва драўлянай царквы ў канцы XVII ст. Тадэвуш Францішак Агінскі ў Тадуліне фундаваў базыльянскі манастыр і царкву пры ім[9].

[9] Верамейчык С. Міхал Клеафас Агінскі, 1765–1833: продкі, жыццё ў Залессі, нашчадкі (спроба храналогіі). Мінск, 2008. С. 27, 31.

Пасля далучэння беларуска-літоўскіх зямель да Расійскай імперыі магчымасці фундатарскай дзейнасці ў сферы каталіцкага храмабудавання змяніліся. У XIX ст. яны былі абмежаваны дзяржаўным заканадаўствам, якое неадназначна ставілася да самой справы заснавання новых касцёльных будынкаў. Аналіз законаў Расійскай імперыі, якія дзейнічалі да 1905 г., паказвае, што каталікі маглі будаваць свае храмы пры наступных умовах:

1. Выкананні патрабаванняў будаўнічага статута.
2. Згодзе каталіцкага епіскапа і рашэнні прыходскага грамадства.
3. Наяўнасці грашовых сродкаў.
4. Папярэдніх зносін з праваслаўным епархіяльным кіраўніцтвам, якое вырашала, ці будзе ўзвядзенне новага каталіцкага касцёла адмоўна ўплываць на праваслаўнае асяроддзе, ці не занадта блізка да праваслаўнага храма мяркуецца пабудаваць касцёл і г. д.
5. Залежнасці дазволу пабудовы ад колькасці жылых дамоў і прыхаджан і адпаведнасці колькасці малельных будынкаў штатам[10].

Відавочна, што чацвёрты пункт азначаў прамое ўзаконенае ўмяшанне Праваслаўнай Царквы ў справы іншых канфесій. Але, нягледзячы на аб-

[10] Яноўская В.В. Хрысціянская царква ў Беларусі. 1863–1914 гг. Мінск, 2002. С. 97–98.

межаванні, фундатарская дзейнасць у каталіцкім асяроддзі ў першай палове XIX ст. не згасала. Напрыклад, у 1825 г. Уладзіслаў Франц Пашкевіч Талаконьскі ў маёнтку Камарова распачаў будаўніцтва мураванага касцёла ў памяць аб заўчасна памерлай (мела 33 гады) жонцы Зоф'і Ганне з Пашкевічаў[11].

Паўстанне 1830–1831 гг., а потым далучэнне ўніяцкай царквы да праваслаўнай узмацніла кантроль за каталіцкім храмабудаўніцтвам і, адпаведна, фундатарскай дзейнасцю. Так, у лісце былога ўніяцкага архіепіскапа, мітрапаліта Літоўскага Іосіфа Сямашкі да Міхаіла Галубовіча (у той час епіскапа Брэсцкага) ад 8 сакавіка 1841 г. адзначалася: «Ваше Преосвященство, хорошо сделаете, если не дозволите Четвертинскому строить Латинскую каплицу — ссылайтесь на то, что это будет вредный пример; ибо если только позволять строить каплицы по случаю смерти какого-либо помещика или помещицы, то вскоре во всяком имении будут Римские каплицы. Впрочем, Четвертинский, кажется, преимущественный недруг Православных, — он, кажется, сбивает с пути Хорошаго (?) и Савощкевича, — он не стоит снисхождения»[12].

---

[11] Рэжым доступу: http://westki.info/artykuly/5664/kasciol-u-kanstancinavie-praciah Дата доступа: 20.01.2016.

[12] Письма архиепископа Литовского Иосифа Семашко к епископу Брестскому Михаилу Голубовичу. Вильна, 1898. С. 43.

Але абмежаванні і жорсткія меры ў той час сваёй мэты не дасягнулі, бо паступова страчвалі сваю сілу, тым больш, што многія з іх засталіся на паперы. Гэтаму садзейнічаў канкардат 1847 г. і тое, што адміністрацыя беларускіх губерняў складалася ў асноўным з асоб польскага паходжання, а таксама дрэннае веданне вышэйшымі ўладамі ўнутранага жыцця краю. У выніку за кароткі тэрмін (1856–1862 гг.) толькі ў Віленскай губерні было пабудавана 8 алтароў, 15 капліц і 37 касцёлаў. Ва ўсіх жа пяці (Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай) губернях за гэты час было адноўлена і пабудавана больш за 200 каталіцкіх храмаў рознага рангу. Напярэдадні паўстання 1863–1864 гг. у пяці губернях дзейнічала 365 каталіцкіх храмаў, у тым ліку 109 парафіяльных касцёлаў, 43 касцёлы філіяльныя, 213 капліц[13].

Пасля паўстання 1863–1864 гг. фундатарская справа, як і ў цэлым справа касцёлабудавання, прыйшлі ў заняпад. Больш таго, ішоў адваротны працэс – закрыццё касцёлаў і перадача іх будынкаў разам з зямельнымі надзеламі ў распараджэнне праваслаўнага духоўнага ведамства. Некаторыя прыстасоўваліся пад казённыя ўстановы, прадаваліся, або проста пуставалі. Паводле архіўных

[13] Яноўская В. В. Хрысціянская царква ў Беларусі. 1863–1914 гг. Мінск, 2002. С. 41.

даных, за 1864–1867 гг. у Віленскай і Гродзенскай губернях было скасавана 140 касцёлаў[14]. Паводле даных польскіх даследчыкаў, за 1860–1905 гг. уладамі было ліквідавана 145 парафіяльных і 52 філіяльных касцёлаў, 240 капліц. Значная частка рымска-каталіцкіх культавых устаноў (205) была пераўтворана ў праваслаўныя[15].

Згодна з цыркулярам генерал-губернатара М. Мураўёва, будаўніцтва філіяльных касцёлаў, а таксама алтароў, капліц, іх рамонт з перабудовай не дапускаліся без дазволу Галоўнага начальніка краю. У выніку такой палітыкі на тэрыторыі пяці губерняў каталіцкія храмы практычна не ўзводзіліся. Так, у Віленскай рымска-каталіцкай епархіі з 1860-х гг. і да моманту прыняцця ўказа аб верацярпімасці (17 красавіка 1905 г.) былі аднаўлены: філіяльны касцёл у мястэчку Васількава (замест скасаванага ў 1867 г.), парафіяльны касцёл у Свянцянах (замест драўлянага пабудаваны цагляны) і такая ж самая перабудова была зроблена ў с. Крыпна Гродзенскай губерні Беластоцкага павета. Ніводнай касцёльнай пабудовы не было ўзведзена ў тых месцах, дзе іх раней не існавала[16].

---

14 Яноўская В. В. Хрысціянская царква ў Беларусі. 1863–1914 гг. Мінск, 2002. С. 42.

15 Odrodzienie kościoła katolickiego w byłym ZSSR. Lublin, 1993. S. 87.

16 Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы (далей – ДГАЛ). Ф. 694. Воп. 1. Спр. 2737. Арк. 64.

17 красавіка 1905 г. каталікі атрымалі дазвол будаваць свае храмы ва ўсіх месцах Расійскай імперыі пры наяўнасці сродкаў і неабходнасці. Для гэтага ставіліся тры ўмовы: а) дазвол каталіцкага духоўнага кіраўніцтва, б) наяўнасць неабходных для будаўніцтва сродкаў, в) выкананне тэхнічных патрабаванняў будаўнічага статута. Менавіта ў гэты перыяд і адбылося будаўніцтва Чырвонага касцёла. У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў фондзе 295 (Канцылярыя Мінскага грамадзянскага губернатара) маецца справа пад назвай «Сведения о костёлах, построенных в 1910 г. на средства помещиков». У адказ на запыт канцылярыі пад грыфам «сакрэтна, цыркулярна» ад 16 верасня 1910 г. Мінскі паліцмайстар у сваім рапарце між іншым паведамляў: «На улице Захарьевской сооружается костёл <...> По слухам помещик Слуцкого уезда Войнилович пожертвовал 200 000 руб.»[17]. І дадае, што больш ахвяравальнікаў на гэты касцёл не было. Паліцмайстар быў здзіўлены гэтым фактам, бо на ўсе іншыя касцёлы, якія былі ўключаны ў спіс, збіраліся, як кажуць, «всем миром». Ды тут ёсць тлумачэнне. У сваіх успамінах Э. Вайніловіч распавядаў аб тым, што калі ў 1904 г. ён прапанаваў будаўнічаму камітэту сваё

[17] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (далей — НГАБ). Ф. 295. Воп. 1. Спр. 8027. Арк. 1.

жаданне пабудаваць касцёл на ўласныя сродкі, то выказаў і свае ўмовы: ён сам дасць яму назву, і ніхто ў будаўнічыя справы і выбар стылю архітэктуры ўмешвацца не павінны. Ва ўспамінах называюцца прозвішчы тых, хто ахвяраваў на ўпрыгожванне касцёла: Аляксандр Болтуць (на выраб званоў), ахвяраванне на арган з боку Шантыруўны, сям'я Скірмунтаў з Парэчча – абраз Маці Божай і цудоўную скульптуру распяцця, якая была дастаўлена са Слуцкага Фарнага касцёла. Ну і, зразумела, жонка Э. Вйніловіча Алімпія, якая ахвяравала балюстрады і падлогу для касцёла.

Змена палітыкі ў адносінах да касцёлабудавання знайшла сваё адлюстраванне ў статыстычных даных, што тычацца адкрыцця новых рымска-каталіцкіх прыходаў, будавання (або аднаўлення) філіяльных касцёлаў. Так, у Віленскай рымска-каталіцкай епархіі за 1906–1914 гг. пачалі дзейнічаць 5 новых прыходаў, 3 філіі і адзін прыход з філіяй (у т. л. – 7 у Віленскай губерні, 2 – у Гродзенскай). Прычым толькі адзін прыход утварыўся пасля 1910 г., усе астатнія – за першыя пяць гадоў пасля выхаду ўказа. Усяго на гэты час у епархіі налічвалася 281 рымска-каталіцкі прыход з 1.392.710 вернікамі (у т. л. 179 – у Віленскай губерні з 975.318 вернікамі і 102 – у Гродзенскай з 417.392 вернікамі)[18].

[18] Studia teologiczne. 1987–1988. № 5–6. S. 127, 142.

Мясцовыя грамадзянскія ўлады выконвалі правілы, адпавядаючыя ўказу 1905 г., толькі на працягу трох з паловай гадоў. 4 лютага 1909 г. было выдадзена распараджэнне Віленскага генерал-губернатара К. Кршывіцкага, якое грунтавалася на цыркуляры МУС ад 26 лістапада 1908 г. і ўтрымлівала ўдакладненні і змены ў справе касцёлабудавання. Вярталіся абмежаванні, адмененыя не толькі ўказам ад 17 красавіка 1905 г., але і «Высочайшим повелением» 1896 г. У дакуменце сцвярджалася: «Что касается ремонта приходских и филиальных римско-католических церквей и строительства новых, вместо пришедших в негодность по старости, или разрушенных по каким-либо причинам, то таковые по Высочайшему повелению от 10 июля 1896 г. могли осуществляться без участия гражданской власти, с разрешения духовного начальства»[19]. Цяпер гэтая прэрагатыва зноў была падпарадкавана папярэдняму дазволу грамадзянскіх улад. Такім чынам, ужо праз тры з паловай гады пункт № 13 указа ад 17 красавіка 1905 г. тлумачыўся зусім інакш, і заходнія губерні зноў вярнуліся да часоў мураўёўскага цыркуляра.

Каталіцкія святары не заўсёды выконвалі распараджэнне К. Кршывіцкага і час ад часу распачыналі збор ахвяраванняў на аднаўленне або будаўніцтва

---

[19] ДГАЛ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 2737. Арк. 65.

храмаў, не звяртаючыся па дазвол да грамадзянскіх улад. У такіх выпадках грамадзянскія ўлады, калі да іх даходзілі звесткі пра падобныя дзеянні каталіцкага духавенства, аб'яўлялі іх незаконнымі. Так здарылася, напрыклад, з дазволам, які дала Віленская рымска-каталіцкая духоўная кансісторыя на збор ахвяраванняў на будаўніцтва каменнага касцёла ў с. Хожава Вілейскага павета Віленскай губерні замест скасаванага ў 1867 г.[20]

Але нават атрымаўшы дазвол грамадзянскага начальства на будаўніцтва касцёла, не так проста было яго скарыстаць. Таму былі розныя прычыны. Адна з іх — наяўнасць сродкаў на будаўніцтва. Даўно ўжо прайшлі тыя гады, калі заможныя вернікі маглі цалкам фінансаваць будаўнічыя работы. Больш таго, нават, калі хто і ахвяраваў грошы на пабудову таго ці іншага касцёла, дык расказваць пра гэта не жадаў. Аб гэтым сустракаем звесткі ў рапартах павятовых спраўнікаў у адказ на сакрэтны цыркуляр Мінскага губернатара, якім прадпісвалася прадставіць звесткі: а) якія касцёлы, у тым ліку і новазбудаваныя, узведзены за кошт землеўласнікаў; б) назваць прозвішчы гэтых ахвяравальнікаў; в) даць прыблізную суму ахвяраванняў ў кожным асобным выпадку[21]. У рапар-

---

[20] ДГАЛ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 2737. Арк. 70.
[21] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 8027. Арк. 5.

це Мінскага павятовага спраўніка сярод тых, хто найбольш ахвяраваў на будаўніцтва касцёлаў называюцца прозвішчы: графа Чапскага (50 тыс. руб.), графа Красінскага (10 тыс. руб.). Больш за 10 чалавек (сярод якіх князь Друцкі-Любецкі) сабралі разам 80 тыс. руб. на будаўніцтва рымска-каталіцкага касцёла ў мястэчку Ракаў. Пінскі павятовы спраўнік называе шмат прозвішчаў ахвяравальнікаў на пабудову рымска-каталіцкага касцёла ў мястэчку Лагішын (у тым ліку Раман, Караліна і Аляксандр Скірмунты, Вацлаў Корсак, Уладзіслаў Пуслоўскі), але адзначае пры гэтым, што памер ахвяраванняў невядомы, бо яны не пажадалі даць звесткі[22].

У пачатку XX ст. трэба было аб'ядноўваць намаганні вернікаў не толькі сваёй епархіі, а звяртацца за дапамогай да суседзяў. 4 лістапада 1905 г. указам Магілёўскай рымска-каталіцкай духоўнай кансісторыі быў зацверджаны камітэт па пабудове новага касцёла на Залатой Горцы ў Мінску. Міністр унутраных спраў дазволіў збор ахвяраванняў ва ўсіх рымска-каталіцкіх епархіях Расійская імперыі. 17 кастрычніка 1906 г. міністэрства пацвердзіла дазвол (тэрмінам на 3 гады). За адведзеныя гады так і не ўдалося сабраць неабходную суму. На паўторны запыт МУС дазволіла працяг-

[22] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 8027. Арк. 7, 7 адв.

нуць збор сродкаў, але ўжо толькі ў межах Мінскай губерні. Збор сродкаў ішоў марудна. У 1913 г. было сабрана толькі 23 тыс. руб. (на будаўніцтва ж было патрэбна каля 200 тыс. руб.)[23].

Імкнучыся стрымаць рост колькасці рымска-каталіцкіх храмаў у літоўска-беларуска-украінскіх губернях мясцовыя ўлады губернскага ўзроўню прыбягалі да розных метадаў. Так, у лістападзе 1914 г. з МУС (Дэпартамента духоўных спраў) на імя Мінскага губернатара паступіў адказ на яго хадайніцтва, у якім разбіраліся неправамоцныя дзеянні апошняга адносна прыняцця рашэння аб незаконнай пабудове ўладальнікам маёнтка Дуброва Мінскага павета Ваньковічам капліцы. Губернатар узбудзіў судовую справу супраць Ваньковіча на падставе таго, што капліца была збудавана ў 1906 г. «... без надлежащего разрешения, что существование таковой не вызывается действительной необходимостью и что в пожарном отношении здание каплицы угрожает опасностью». Пры гэтым ён спасылаўся на рашэнні, прынятыя яшчэ ў 1866 г., згодна з якімі мясцовым уладам губернскага ўзроўню «Северо- и Юго-Западных краёв» было нададзена права закрываць тыя рымска-каталіцкія богаслужбовыя ўстановы «существование коих оказывалось особенно вредным и закрытие коих будет

[23] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 7907. Арк. 1, 5, 6, 9, 50.

признано генерал-губернатором необходимым»[24]. Але гэта правіла, як і шэраг іншых, што грунтаваліся не на дзяржаўных законах, а на адміністрацыйных распараджэннях, былі адменены яшчэ ў лютым 1905 г. У выніку судовая справа, узбуджаная супраць Ваньковіча ў 1907 г., была спынена «з-за адсутнасці злачынства» і хадайніцтва Мінскага губернатара аб закрыцці капліцы не было задаволена. Аднак было адзначана, што капліца «имеет характер частного богослужебного здания, предназначенного для удовлетворения религийных нужд исключительно землевладельца Ваньковича, его семьи и служащих»[25].

Блізкая да праблемы касцёлабудавання — праблема вяртання рымска-каталіцкаму духоўнаму ведамству закрытых і канфіскаваных касцёлаў. Пасля абнародавання ўказа 1905 г. у МУС пасыпаліся просьбы ад каталікоў, каб ім вярнулі касцёлы, якія пасля паўстання 1863–1864 гг. і пазней былі скасаваны і перададзены ў праваслаўнае духоўнае ведамства. У асобных выпадках каталікі самавольна захоплівалі будынкі былых касцёлаў, што пуставалі ўвесь гэты час. У архівах захаваліся матэрыялы, што сведчаць пра тое, як нялёгка было каталікам вяртаць свае былыя святыні. Нават калі будынкі

[24] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 7623. Арк. 38а.
[25] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 7623. Арк. 39.

былых каталіцкіх касцёлаў і манастыроў стаялі пустыя і, здавалася, нікому не патрэбныя, атрымаць згоду ад Св. Сінода (бо большасць будынкаў была перададзена ў праваслаўнае ведамства) на зварот іх каталікам было амаль што немагчыма.

Не так проста было вярнуць уласнасць і ў іншых выпадках. Напрыклад, у 1907 г. на імя Мінскага губернатара паступіла прашэнне ад сялян-каталікоў с. Гарадзішча Пінскага павета з просьбай дазволіць ім аднавіць касцёл, які быў скасаваны ў 1865 г. Па распараджэнні галоўнага начальніка Паўночна-Заходняга краю зямельныя ўладанні, што належалі касцёлу, былі перададзены ў ведамства Мінскага ўпраўлення дзяржаўных маёмасцей, затым — у арэнду стацкага саветніка Льва дэ Гардзі, а ад яго — двараніну Вікенцію Тэадаровічу (праваслаўнаму). Апошні даў згоду перадаць зямлю і касцёльны будынак, які пуставаў да гэтага часу, былым прыхаджанам пры ўмове што гэтаму «не встретится препятствий со стороны надлежащих ведомств». Перашкоды сустрэліся з боку праваслаўнай епархіі. Епіскап Мінскі і Тураўскі не мог дапусціць адкрыцця рымска-каталіцкага касцёла ў праваслаўным асяроддзі, у выніку чаго Тэадаровіч заявіў, што ён менавіта і меў на ўвазе перашкоды з боку праваслаўнага епархіяльнага кіраўніцтва. Мінскі губернатар падтрымаў епіскапа. Але

пакуль ішлі спрэчкі, касцёл быў самавольна асвячоны 21 лістапада 1909 г., што было кваліфікавана губернатарам як самовольны захоп чужой маёмасці, які можа даць штуршок да сялянскага бунта. Гучны рэзананс, які атрымала гэта справа з падачы газеты «Минское слово», і згода Тэадаровіча перапрадаць маёнтак сялянам-каталікам, закончылася перамогай апошніх. Праўда, праз два гады сяляне былі абвінавачаны ў незаконным аднаўленні храма і аштрафаваны на 50 руб. кожны[26].

Такім чынам, традыцыя фундатарскай дзейнасці з боку розных пластоў насельніцтва Беларусі, існаваўшая на працягу стагоддзяў, была пастунова перапынена пасля далучэння да Расійскай імперыі. З гэтага часу дадзеная справа цалкам падпарадкоўвалася дзяржаўным законам, якія, згодна з агульным канфесійным курсам, час ад часу мяняліся. Лібералізацыя заканадаўства ў дачыненні неправаслаўных канфесій і рэлігій, якая разгарнулася ў пачатку XX ст., на некаторы час разняволіла працэс касцёлабудаўніцтва. Але праз невялікі адрэзак часу пачаліся адступленні ад таго, што даваў указ 17 красавіка 1905 г. і папярэднія заканадаўчыя і падзаконныя акты.

---

26 Аддзел рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі. Ф. 1000. Воп. 2. Спр. 571. Арк. 86; НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 7680. Арк. 3, 14, 76 адв., 89, 92.

*Віктар Кахновіч*

# ГАСПАДАРКА Ў МАЁНТКАХ ЭДВАРДА ВАЙНІЛОВІЧА НА МЯЖЫ XIX–XX стст.

Землеўласнік-дваранін з мясцовага шляхецкага роду, вядомы грамадскі дзеяч другой паловы XIX – пачатку XX ст. Эдвард (Эдуард) Адамавіч Вайніловіч (13.X.1847–16.VI.1928)[1] пакінуў пасля сябе ўдзячную і светлую памяць сучаснікаў і нашчадкаў. Пры жыцці яго называлі «беларускім Сталыпіным», а расійскі прэм'ер П. Сталыпін назваў Э. Вайніловіча «мінскім Бісмаркам»[2]. Сябар і супрацоўнік Эдварда Караль Незабытоўскі ў 1928 г. згадваў аб Вайніловічы як аб дасканалым гаспадары і адміністратары, лепшым суседзе і бацьку для навакольных сялян і памешчыкаў, пане добрай парады і апостале паводле ўчынкаў[3]. Вядома, што Эдвард Вайніловіч многія гады ўзначальваў Мін-

[1] Захавалася копія метрычнага запісу аб нараджэнні Эдуарда Антона Леапольда Вайніловіча 13 кастрычніка 1847 г.: Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (далей – НГАБ). Ф. 1476. Воп. 3. Спр. 22839. Арк. 6.

[2] Эдвард Вайніловіч. Яго ўспаміны, дакументы, сувязь з сучаснасцю. Мінск, 2014. С. 7, 17, 59.

[3] Там жа. С. 41–42.

скае таварыства сельскай гаспадаркі, быў вядомым грамадскім дзеячам беларускіх зямель і экспертам па эканамічных пытаннях краю. Усё гэта звяртае нашу ўвагу на тое, якой была гаспадарка ў маёнтках славутага «мінскага Бісмарка».

Вайніловічы як шляхецкі род былі вядомыя з XVI ст. Ім ужо тады належаў шэраг маёнткаў у Слуцкім павеце. Сярод іх ва ўласнасці Эдварда Адамавіча Вайніловіча былі маёнтак Савічы (600 дзес.) і Пузава (600 дзес.); усяго 1200 дзес. альбо 1201,1 га зямлі[4]. Для Мінскай губерні з буйным землеўладаннем дваран, у той час такое валоданне было сярэдняе па памерах. Так, у 1877 г. сярэдні памер маёнтка ў губерні складаў 1003,5 дзес., у 1905 г. — 580,4 дзес. (па статыстыцы тых часоў да катэгорыі сярэдніх маёнткаў адносіліся землеўладанні са 100—500 дзес.[5]). Свае маёнткі Эдвард Вайніловіч атрымаў у спадчыну. Вядома, што ў фамільным маёнтку Вайніловічаў Савічы знаходзіўся вялікі і добра ўпарадкаваны сямейны архіў з дакументамі за XVI — пачатак XX стст., багатая бібліятэка (больш 5 тыс. тамоў кніг), галерэя партрэтаў членаў роду і карцін. Усё было знішчана

[4] Дрозд Д. М. Землевладельцы Минской губернии, 1861–1900: справочник. Минск, 2010. С. 127—128. (1 казённая дзесяціна складала 2400 квадратных сажняў ці 1,09 га).

[5] Кохнович В. Хозяйство в имениях на Полесье в 1861–1914 гг. Saarbrücken, 2015. С. 263, 266, 268.

падчас пагрому маёнтка 19–21 лютага 1918 г.[6] Як вынік, збераглося няшмат архіўных звестак, у асноўным аб выкупе зямлі сялянамі ў маёнтках Вайніловічаў[7].

Члены мінскага губернскага статыстычнага камітэта па стане на 1876 г. фіксавалі наяўнасць 1200 дзес. зямлі ў 2-х маёнтках Э. Вайніловіча. Таксама адзначалі вадзяны млын з гадавым даходам 22 руб. у маёнтку Савічы[8]. У 1888 г., паводле звестак таго ж губернскага камітэта, Эдварду Вайніловічу ў Цімкавіцкай воласці Слуцкага павета належыла ўжо 3 маёнткі: Сівічы (Савічы) — 831 дзес. зямлі, Браткава — 40 дзес., Пузава (Пузічы) — 701 дзес., альбо разам 1572 дзес.[9] Вядома, што па стане на 1914 г. ён меў 1638 дзес., у 1911 г. — 1675 дзес. і іншая ападаткаваная маёмасць, што ацэньвалася ў 22 тыс. руб.[10] Бачым, што землеўласнасць Э. Вайніловіча павялічвалася: у 1864 г. яму належаў маёнтак Пузічы, з 1877 г. быў перададзены ў спадчыну маёнтак Савічы, таму агульная плошча валодання па-

---

[6] Войнилович Э. Воспоминания. Минск, 2007. С. 15–16.

[7] Дрозд Д. М. Землевладельцы Минской губернии, 1861–1900: справочник. Минск, 2010. С. 127—128.

[8] Список землевладельцев Минской губернии за 1876 г. Минск, 1877. С. 31.

[9] Список землевладельцев Минской губернии за 1888 г. Минск, 1889. С. 383.

[10] Дрозд Д. М. Землевладельцы Минской губернии, 1900–1917: справочник. Минск, 2013. – С. 93.

вялічылася ўдвая, складаўшы 1200 дзес. У 1888 г. ва ўласнасці Э. Вайніловіча было 1572 дзес., ці яна вырасла на 31 %; да 1914 г. ўзрасла яшчэ на 8,5 % і складала 1675 дзес. Заўважым, што тое выдзялялася з агульнай сітуацыі: у 35 паветах Беларусі з 1877 па 1905 г. землеўладанне дваран скарацілася, па разліках А. П. Жытко, на 16 % мінімум, а ў Мінскай губерні – на 10 %, у той час як у еўрапейская частцы Расійскай імперыі яно зменшылася на 27,2 %. Між тым, гэта сведчыла аб удалай адаптацыі памешчыцкіх гаспадарак да капіталізму ў Беларусі[11].

З погляду на стан землеўладання маёнткаў можна зрабіць папярэднюю выснову аб паспяховай гаспадарцы Эдварда Вайніловіча. Аднак у спецыялізаваных даведніках мяжы XIX–XX ст., што называліся «Краткие справочные сведения о некоторых русских хозяйствах» у двух выпусках, не знаходзім звестак аб яго гаспадарцы ў маёнтках[12], хоць ён і быў удзельнікам вялікіх гаспадарчых выставаў.

Асобныя і разрозненыя звесткі аб уладаннях Э. А. Вайніловіча знаходзім у яго ўспамінах. Па-

---

[11] Жытко А. П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг. Мінск, 2003. С. 117, 133.

[12] Краткие справочные сведения о некоторых русских хозяйствах. 1-е изд. СПб., 1897. С. 265–268. Краткие справочные сведения о некоторых русских хозяйствах. 2-е изд. Вып. III. СПб., 1902. С. 122–148. Краткие справочные сведения о некоторых русских хозяйствах. 2-е изд. Вып. IV. СПб., 1904. С. 257–261.

першае, згадваецца маёнтак Савічы, што па сведчанні Вайніловіча, належаў прадстаўнікам яго роду з канца XVI ст. і налічваў 5000 дзес. зямлі[13]. Па ўсім бачна, што размова вялася пра пачатак XIX ст., калі Савічы належалі дзеду Эдварда Антонію. Ён быў жанаты на Тэафіліі Адзінцовай, і пад яе уплывам сям'я пачала жыць не па сродках шырока. Замест старога драўлянага палаца быў пабудаваны новы каменны з мансардамі і дзвюма вежамі, у парку былі ўзведзены альтанкі, штучныя астравы, гроты і лабірынты, галандскія ветракі. Як вынік, пасля бабулі Тэафілі засталася вялікая запазычанасць, якую павінны былі выплачваць наступныя пакаленні. У 1846 г. дзед Антоній перадаў гаспадарку ў кіраванне двум сынам – Тадэушу і Адаму[14]. Ёсць звесткі, што па стане на 1 сакавіка 1846 г. у маёнтку Савічы было 211 рэвізскіх душ прыгонных сялян (3 дваравых), 127 – у вёсцы Браткава, 27 – у Савічах, 34 – у Тыхаўні і 20 – у Душава[15]. У 1852 г. Адам Вайніловіч завёў передавы шматпольны севазварот з травасеяннем і ўраджаем на дваравым полі ў сам-8[16].

Бацька Эдварда Вайніловіча Адам (1806–1874) закончыў Віленскі ўніверсітэт і служыў у губерн-

---

[13] Войнилович Э. Воспоминания. Минск, 2007. С. 26.

[14] Войнилович Э. Воспоминания. Минск, 2007. С. 29, 30–31.

[15] НГАБ. Ф. 1476. Воп. 3. Спр. 22839. Арк. 25зв.

[16] НГАБ. Ф. 1596. Воп. 2. Спр. 2529. Арк. 51.

скай фінансавай камісіі. Эдвард адзначаў вялікую працавітасць свайго бацькі, заведзены тым бездакорны парадак у гаспадарцы. Адам Вайніловіч, па словах сына, пазбягаў розных фінансавых афер, увесь час трымаўся таго, каб жыць па сродках, і імкнуўся выплаціць запазычанасць, з чым паспяхова справіўся і нават распачаў збіраць пасаг для дачок[17]. Пра тое ж сведчаць 10 квітанцый за 1849–1858 гг., што захаваліся, паводле якіх бацька Эдварда выплаціў за маёнтак Савічы казначэйству 974,04 руб. срэбрам[18].

Вялікай падзеяй для сям'і Вайніловічаў стала скасаванне прыгоннага права. Эдвард прыводзіць драматычную згадку аб тых падзеях. Так, аднойчы ўзімку памешчык з суседняга маёнтка прачытаў у Браткава Акт аб вызваленні сялян, пасля чаго Эдвардаў бацька сказаў, што назаўтра сам пойдзе карміць коней і кароў, а дзеці будуць дапамагаць. Але на наступны дзень кожны работнік прыступіў да сваіх абавязкаў. Змяніліся ўмовы і аплата працы, аднак колішнія работнікі прыгоннага часу, як і іх дзеці і ўнукі, заставаліся працаваць у Савічах. Цікавае рэзюмэ Эдварда аб гэтым: «Відаць, тут ім (работнікам) не чынілі нічога несправядлівага, альбо для змены ўмоў жыцця ім не хапала ініцыятывы»[19].

---

[17] Там жа. Арк. 33.
[18] НГАБ. Ф. 1476. Воп. 3. Спр. 22839. Арк. 10–19.
[19] Войнилович Э. Воспоминания. Минск, 2007. С. 35.

Захаваліся архіўныя дакументы аб выкупной аперацыі ў маёнтках Савічы і Пузава. Па выкупным акце маёнтка Пузава ад 7.06.1864 г. 106 рэвізскіх душ сялян (30 двароў ці гаспадарак) і 2 батракі атрымалі 370 дзес. за выкупную суму ў 6 тыс. 452,29 руб. і ўзнос у 387,13 руб. Аброк з сялян у год ацэньваўся ў 1110 руб., але па ўказе ад 1.03.1863 г. ён памяншаўся на $^1/_5$ і складаў 888 руб., адкуль і вылічвалася сума выкупнога ўзносу[20]. Пры гэтым яшчэ ў 1864 г. сяляне маёнтка Пузава ўнеслі толькі палову аброку (444 руб.) і адмовіліся сплачваць рэшту, хоць закон ад іх таго патрабаваў[21]. Паводле выкупнога акта маёнтка Савічы ад 14.11.1864 г. сяляне вёскі Браткава (96 рэвізскіх душ ці 26 двароў) і 6 дваравых атрымалі 328 дзес. за выкупную суму ў 5 тыс. 766,92 руб. і ўзнос у 328,01 руб.[22] Вядома, што сяляне Браткава знаходзіліся на паншчыне і павінны былі з $^1/_2$ валокі (13,67 дзес.) 160 мужчынскіх і 114 жаночых рабочых дзён у год, альбо пры палавінным надзеле 79 і 56 дзён адпаведна. Усяго маёнтак абавязваў сялян 6 тыс. 576 прыгонных дзён і 62,88 руб. аброку з 26 гаспадарак у год. У 1861 г. паншчына сялянам была па рэформе зменшана на 15 % (232 і 274 прыгонных

---

20 НГАБ. Ф. 242. Воп. 2. Спр. 931. Арк. 6зв.–7.

21 НГАБ. Ф. 242. Воп. 2. Спр. 932. Арк. 5.

22 НГАБ. Ф. 1596. Воп. 2. Спр. 2529. Арк. 23–24.

дзён з гаспадаркі адпаведна), а аброк прызначаны ў 887,28 руб.[23]

З 25 сакавіка 1863 г. сяляне ў Савічах былі пераведзены з паншчыны на аброк, які, у сваю чаргу, склаў 709,8 руб. Ужо з ліпеня 1864 г. Адам Вайніловіч аскарджваў выкупную аперацыю: глебы былі ўрадлівыя — 4-га разраду (ураджай сам-8 і сам-10), сенакосы добрыя, блізка знаходзіліся мястэчкі (Клецк, Капыль, Сіняўка), таму па выкупе адбылася недаацэнка зямель сялянскіх надзелаў недзе на $^2/_3$[24]. Паверачныя ж камісіі яшчэ ў верасні 1864 г. прынялі аргументы сялян (землі гліністыя і неўрадлівыя з ураджаем сам-3, сенакосы дрэнныя, паш і вадапою не было), а ў ліпені 1867 г. яшчэ раз панізілі ацэнку сялянскіх зямель з 7-га да 9-га разраду і прызначылі выкупны плацёж у 3 тыс. 119,8 руб., з якога 1 тыс. 122,56 руб. пакінулі казне як «пераплату» памешчыку за 1863–1867 гг., затым Слуцкі міравы суд у 1870 г. засведчыў права сялян на сэрвітутнае карыстанне лясным урочышчы Засценак з 27,7 дзес.[25]

Варта адзначыць, што рэформу 1861 г. Эдвард Вайніловіч ацэньваў пазітыўна — яна была дэталёва распрацавана. Аднак падзеі 1863 г., паводле

---

[23] Там жа. Арк. 132зв.–135.

[24] Там жа. Арк. 29—37зв., 50–51зв.

[25] Там жа. Арк. 22зв., 41, 50зв., 67, 70, 87, 91–91зв., 120–123.

Вайніловіча, дазволілі ўраду перавесці рэформу з эканамічнай глебы на палітычную: рэпрэсіі абрынуліся на мясцовае, нібыта польскае, а насамрэч каталіцкае насельніцтва. Адзначалася нават «сацыялістычная» афарбоўка ўрадавых захадаў. Эдвард Вайніловіч, як сведка падзей, пісаў, што расійскі імперскі ўрад сваіх мэт не дасягнуў, а з'явіўся землеўласнік-гаспадар, які забяспечыў мясцовым сялянам нармальны заробак і працу, перадаваў за справядлівую плату надзелы дробным арандатарам[26].

Падобнай да скасавання прыгону ўзрушальнай падзеяй было паўстанне 1863 г. Маці агітавала 15-гадовага Эдварда да ўступлення ў паўстанцкі атрад, аднак на час выступлення юнак знаходзіўся на вучобе ў Слуцку. Хутка на Савічы быў накладзены арышт: п'яны чыноўнік Вінаградаў з атрадам казакоў і ратнікаў-сялян захапіў маёнтак. Аднак чыноўнік-рэкецір не змог дамагчыся адступных нібыта за выключэнне маёнтка «з секвестру» і мусіў пакінуць Савічы. Эдвард адзначаў, што тады адчуў патрэбу сваімі сіламі прабіваць шлях у жыцці і выбраў у якасці занятку пэўную прафесію, а не дзяржаўную ці ваенную службу, як тое прынята было ў дваран. Ён скончыў Тэхналагічны інстытут у Пе-

[26] Войнилович Э. Воспоминания. Минск, 2007. С. 36–38.

цярбургу і стаў механікам па металургіі і машыбудаванні, прайшоў стажыроўку на заводзе лакаматываў у Гановеры і на чыгунцы ў Бельгіі. Затым скончыў сельскагаспадарчую акадэмію ў Прушкаве ў Сілезіі, пасля якой прайшоў практыку як эканом у прускім маёнтку Мехель бліз Быдгашча[27].

Трэба сказаць, што бацька Э. Вайніловіча хацеў, каб яго сын прысвяціў сябе працы на зямлі, хоць падтрымліваў Эдварда падчас навучання ў Тэхналагічным інстытуце і не замінаў яго задуме стаць механікам. Але заможны бяздзетны дзядзька Люцыян (1817–1894 гг.) яшчэ ў 1865 г. перадаў маёнтак Пузава Эдварду і прагнуў, каб яго пляменнік-спадкаемец атрымаў адукацыю, годную асобы дваранскага паходжання[28]. Як вынік, Э. Вайніловіч распачаў у 1871 г. навучанне ў Сарбоне, але ў бацькі абвастрылася хвароба ног і ён пажадаў, каб сын прыступіў да спраў у маёнтках. Эдвард прайшоў курс у акадэміі ў Прушкаве і ўжо ўвосень 1872 г. вярнуўся ў Савічы. У 1872–1874 гг. ён кіраваў маёнткамі сям'і ў Слуцкім павеце, калі яго бацька цяжка хварэў і знаходзіўся на лячэнні[29].

Бацька вёў строга ўпарадкаваную і ашчадную гаспадарку, таму пасля яго смерці, па словах Эд-

---

[27] Там жа. С. 43, 49, 51, 56–57.

[28] Там жа. С. 52, 54.

[29] Там жа. С. 55–57, 59.

варда Вайніловіча, не хапала толькі 10 тыс. руб. для выплат маці і сёстрам паводле тэстаменту (завяшчання). Але сродкі ён хутка знайшоў, калі прадаў пустыя пляцы ў вёсцы Браткава[30].

Захаваўся тэстамент Адама Вайніловіча, што быў складзены 1 лістапада 1874 г. і зацверджаны Палатай крымінальнага і грамадзянскага суда ў Мінску 13 студзеня 1877 г. Сын Эдвард у спадчыну атрымоўваў (без усякіх выняткаў права распараджэння) маёнтак Савічы, фальварак Добрая Воля, лес ва ўрочышчы Душава на 10 валоках зямлі, усю рухомую і нерухомую маёмасць, грошы і прыватныя закладныя паперы. Адзінае, што бацька абавязваў сына, забяспечыць маці капітал ў 15 тыс. руб., а таксама пасаг сястры Ядвізе ў 16 тыс. руб.[31] У архіве ж знаходзім звесткі, што са згоды ўлад, 30 сакавіка 1877 г. Эдвард Вайніловіч законна атрымаў спадчыну, аб чым сведчыць і ўводны ліст № 6 ад 30.03.1877 г. за подпісам калежскага сакратара А. Я. Казанскага[32]. Між тым, маці Эдварда Ганне (з Ваньковічаў) давялося пісаць звароты на імя імператара 12 студзеня, 16 студзеня і 13 сакавіка 1878 г., каб яе сыну дазволілі распараджацца

---

[30] Там жа. С. 33.

[31] НГАБ. Ф. 1476. Воп. 3. Спр. 17941. Арк. 1–5.

[32] НГАБ. Ф. 1476. Воп. 3. Спр. 17941. Арк. 10–11; Спр. 22839. Арк. 1–4.

ўласнасцю ў маёнтку Савічы і завяршыць продаж тых ўчасткаў зямлі ў вёсцы Браткава, што распачаў яшчэ яе муж[33]. Аднак «указам імператара» Слуцкая дваранская апека 20 лютага 1878 г. прызначыла маці апякункай Ядвігі і ёй жа перадавала маёнтак Савічы з абавязкам штогадовай справаздачы перад спецыяльным апякунскім саветам. Пры тым адказнасць Эдварда за капітал маці і пасаг сястры не здымаліся[34]. Так у абыход законнасці, сям'я была пакарана за патрыятычныя настроі маці ў 1863 г. Пры гэтым з дакладной запіскі губернатару ад 22.12.1878 г. даведваемся, што Эдварду і Ганне Вайніловіч дазволілі прадаць 9 асобам 147 дзес. зямлі за 9 тыс. 300 руб.[35] Сярэдні кошт 1 дзес. зямлі ў 63,3 руб. сведчыць, што прадаваліся ўчасткі сядзібнай, агароднай і лепшай зямлі ў вёсцы Браткава і яе ваколіцах.

Іншай справай было выкананне абавязкаў міравога суддзі, што нібы па спадчыне перайшла да Эдварда. У тым ліку шмат даводзілася займацца яму межавымі спрэчкамі Нясвіжскай ардынацыі, праз што ён блізка сышоўся з князямі Радзівіламі[36]. Адзначым, што Э. Вайніловіч высока цаніў

---

[33] НГАБ. Ф. 1476. Воп. 3. Спр. 22839. Арк. 20–22зв.

[34] Там жа. Арк. 23–25зв., 33 зв., 35.

[35] Там жа. Арк. 33–33зв., 35.

[36] Войнилович Э. Воспоминания. – Минск, 2007. С. 60.

сваё сяброўства з Радзівіламі. Вялікае значэнне ён прыдаваў устанаўленню добразычлівых стасункаў з уплывовымі людзьмі. У тыя часы, калі любыя суполкі людзей выклікалі падазронасць улад, без сувязей нельга было нічога зрабіць. Важным было і яго ўменне гасцінна прыняць людзей і далучыць іх да кааперацыі, згоды і ўзаемапаразумення[37].

Ва ўсіх успамінах гаворыцца аб грамадскай службе і занятках Э. Вайніловіча, асабліва яго працы ў Аграрным таварыстве ў Мінску, а таксама выкананні абавязкаў члена Дзяржаўнага Савета. Між тым, вельмі скупыя звесткі аб яго занятках у маёнтках. Відаць па ўсім, што ў Савічах і Пузава ён вёў гаспадарку належным чынам, як тое раней у маёнтку Мехель на Пазнаньшчыне, дзе служыў эканомам: «Ужо ў 5 гадзін раніцы пасля кавы я быў на кані, з якога амаль цэлы дзень не злазіў»[38]. Пільна назіраў за справамі і станам гаспадаркі. Так, калі ў 1882 г. Эдвард ажаніўся, то быў уражаны безгаспадарлівасцю ў пасагавым маёнтку Боркі сваёй жонкі Алімпіі Узлоўскай. Вякамі ён аддаваўся ў арэндуі, як вынік, землі і будынкі былі ў запушчаным стане. Таму Эдварду Вайніловічу давялося прыкладаць шмат намаганняў для яго ўзнаўлен-

[37] Там жа. С. 69, 71, 78–79, 82, 88, 90–91, 100, 111, 145.

[38] Там жа. С. 57.

ня, працы і капіталу[39]. Заўважым, што ў яго быў добры практычны вопыт у справах, агранамічная і тэхналагічная адукацыя. Трэба разумець, што як памешчык Эдвард Вайніловіч быў удалым практыкам. Відаць па ўсім, што ён карыстаўся прызнаным аўтарытэтам сярод землеўласнікаў у Мінскім таварыстве сельскай гаспадаркі.

На карысць таго ўскосна сведчыць тая яго заўвага, што калі ў 1878 г. Мінскае сельскагаспадарчае таварыства папоўнілі «загарэлыя сапраўдныя сельскія гаспадары» (Лявон Ваньковіч, Віктар Свіда, Аляксандр Скірмунт, Эдвард Вайніловіч), то яны паціснулі засеўшых там раней «мундзіраў» з ліку расійскіх чыноўнікаў[40].

Некаторыя звесткі пра гаспадарку ў маёнтках Савічы і Пузава Эдварда Вайніловіча даюць даныя па т. зв. працэнтным зборы. Гэты кантрыбуцыйны збор расійскія ўлады сцягвалі з уласнікаў нерухомых маёмасцей «польскага паходжання» ў 1864–1898 г. Рэпрэсіі пры падаўленні Студзеньскага паўстання, а пазней зборы сталі нормай дыскрымінацыйнага рэжыму ў краі: у землеўласнікаў-каталікоў маглі забіраць 30 % (па Пузава 40 %), затым 12 % ад усіх даходаў (табліца).

---

[39] Там жа. С. 61.

[40] Войнилович Э. Воспоминания. Минск, 2007. – С. 64.

**_Табліца_ — Звесткі па маёнтках Э. А. Вайніловіча, 1869–1898 гг.**[41]

| Маёнткі<br>**Маёнтак Савічы** | 1869–1871 гг. | 1879–1884 гг. | 1877–1880 гг. | 1896–1898 гг. | Змены з 1869 г. да 1898 г. у % |
|---|---|---|---|---|---|
| Усяго зямлі ў маёнтку, дзес. | 953 | 800,5 | 809 | 800 | –19,1% |
| Ворыва, сенакос (дзес.) | 486 | 333 | 333 | 333 | –45,9% |
| Даход ад іх, руб. | 388,8 | 266,4 | 266,4 | 266,4 | –45,9% |
| Лес, дзес. | 227 | 467,5 | 476 | 467 | +51,4% |
| Даход ад лесу, руб. | 93,4 | 93,4 | 93,4 | 93,4 | 0,0% |
| Даход ад заводаў, арэнды і г. д., руб. | 50 | 50 | 50 | 0 | –100,0% |
| *Усяго даход ад маёнтка, руб.* | *532,2* | *409,8* | *409,8* | *359,8* | *–47,9%* |
| *% збор, у руб.* | *327,3* | *86* | *56,92* | *43,9* | *–645,6%* |
| **Маёнтак Пузічы (Пузава) падлічана** | **391,8** | **408,4** | **408,6** | **437,2** | **+10,4%** |
| Усяго зямлі ў маёнтку, дзес. | 800 | 673,5 | 673 | 817 | +2,1% |
| Ворыва, сенакос (дзес.) | 233 | 373 | 373 | 373 | +37,5% |
| Даход ад іх, руб. | 242,4 | 298,4 | 298,6 | 298,4 | +18,8% |
| Лес, дзес. | 153 | 300,5 | 300 | 444 | +134,5% |
| Даход ад лесу, руб. | 99,4 | 60 | 60 | 88,8 | –11,9% |
| Даход ад заводаў, арэнды і г. д., руб. | 50 | 50 | 50 | 50 | –100,0% |
| *Усяго даход ад маёнтка, руб.* | *240* | *408,4* | *408,4* | *474,2* | *+150,6%* |
| *% збор, у руб.* | *96* | *85,7* | *56,72* | *53,34* | *–80,0%* |

[41] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1977. Арк. 30зв., 48зв.–49, 60, 85зв.–86; Спр. 2143. Арк. 3, 10зв.–11, 44зв.–45; Спр. 3986. Арк. 39, 48зв.–49, 83зв.–84; Спр. 6060. Арк. 2, 12зв.–13, 48зв.–49.

| Маёнткі | 1869–1871 гг. | 1879–1884 гг. | 1877–1880 гг. | 1896–1898 гг. | Змены з 1869 г. да 1898 г. у % |
|---|---|---|---|---|---|
| **Па 2-х маёнтках Э. А. Вайніловіча** | **924** | **818,2** | **818,4** | **797** | **–15,9%** |
| Усяго зямлі ў маёнтках, дзес. | 1753 | 1474 | 1482 | 1617 | –8,4% |
| Ворыва, сенакос (дзес.) | 719 | 706 | 706 | 706 | –1,8% |
| Даход ад іх, руб. | 631,2 | 564,8 | 565 | 564,8 | –11,8% |
| Лес, дзес. | 380 | 768 | 776 | 911 | +241,7% |
| Даход ад лесу, руб. | 192,8 | 153,4 | 153,4 | 182,2 | –5,8% |
| Даход ад заводаў, арэнды і г. д., руб. | 100 | 100 | 100 | 50 | –50,0% |
| *Усяго даход ад маёнткаў, руб.* | *924* | *818,2* | *818,2* | *834* | *–10,8%* |
| *% збор, у руб.* | *423,3* | *171,7* | *113,64* | *97,24* | *–335,3%* |
| **Па усім павеце / лік маёнткаў** | **175** | **347** | **340** | **357** | **+104,0%** |
| Усяго зямлі ў маёнтках, дзес. | 230612 | 103564 | 103365 | 109848 | –109,9? |
| Ворыва, сенакос (дзес.) | 139362 | 50464 | 51833 | 54844 | –154,1% |
| Даход ад іх, руб. | ? | 37355,2 | 37621,4 | 40387,1 | (+7,5% ?) |
| Лес, дзес. | 82217 | 53100 | 51532 | 55004 | –49,5% |
| Даход ад лясоў, руб. | ? | 5346,1 | 6323 | 7308,86 | (+26.9% ?) |
| Даход ад заводаў, арэнды і г. д., руб. | 6760 (?) | 6869 | 6804 | 8213 | +17,7% |
| *Усяго даход ад маёнткаў, руб.* | *115420,3* | *49570,27* | *50454,24* | *55908,92* | *–106,4%* |
| *%-ны збор, у руб.* | *32575* | *10135,6* | *6698,79* | *6650,24* | *–389,8%* |
| ***у т. л. гэты збор у %*** | ***28,2%*** | ***20,4 %*** | ***13,3 %*** | ***11,9 %*** | ***–14,9%*** |

Заўважым, што даходы 2-х маёнткаў Э. Вайніловіча, паводле даных, некалькі зменшыліся, у тым ліку даход ад арэнды (млын у Савічах, участ-

кі зямлі) і дваровай гаспадаркі. Зусім нязначны быў даход ад лесу, плошча якога, аднак, вырасла ў 2,5 раза за 30 год. Гэта магла быць свядомая змена землеўласнікам структуры ўгоддзяў маёнтка, іх аптымізацыя. Заўважым таксама, што нельга лічыць вялікім і агульны даход у 820—925 руб. для такога землеўладання. Праўда, ён у цэлым адпавядаў сярэдняму даходу з 1 дзес. па павеце. Паўстае пытанне аб верагодных хібах пры правядзенні ацэнкі даходнасці гаспадаркі аб спагнанні збору. Заўважаная, напрыклад, рознасць лічбаў крыніцы пры пераліку даходаў маёнтка Пузічы за 1869 г. складае 151,8 руб. ці 39 %. Разам з тым, бачна, што памеры спагнання з маёнткаў Вайніловіча некалькі перавышалі сярэднія лічбы па павеце. Крыніцы падаюць відавочныя прыклады ў доказ злоўжыванняў чыноўнікаў пры налічэнні сумы збору. Так, востра кідаецца ў вочы пры разглядзе ведамасці па зборы з Бабруйску 1869 г.: калі жыхар дваранін з Бабруйску Восіп Канькоўскі сплочваў 100 руб. збору з 265 руб. ацэнкі ўласнасці (37,7 %), дваранін Лявон Абрыньскі плаціў 100 руб. з 245 руб. ацэнкі (41 %), то жонка калежскага саветніка Мядзведзева —250 руб. з 1353 руб. ацэнкі яе гарадской нерухомасці (18,5 %), а надворны саветнік Баўбельскі — 270 руб. з 1600 руб. (17 %). Там жа можна заўважыць вялікае абцяжаранне бедных жыхароў: дваранка

Юля Райкевічава сплачвала 38,2 % са сваёй сціплай уласнасці (21 руб. з 55 руб.), а Марыя Маліноўская – 40,5 % (51 руб. са 126 руб.) і г. д.[42] Няма сумнення, што губернскія і павятовыя чыноўнікі маглі маніпуляваць сітуацыяй. Найперш тое датычылася прадвадзіцеляў дваранства паветаў, якія прадастаўлялі спісы па зборы.

Даныя табліцы дазваляюць акрэсліць галоўныя напрамкі гаспадаркі маёнткаў Савічы і Пузічы: уласнік зберагаў свой лес і вёў пераважна жывёлагадоўча-земляробчую гаспадарку. З прамысловых аб'ектаў Э. Вайніловіча маглі быць ветраныя млыны (адзін з іх адзначаны губернскімі чыноўнікамі ў 1876 г. у Савічах). Звяртае ўвагу тая акалічнасць, што ў яго маёнтках доля ворыва і сенакосаў з часам расла. Са структуры ўгоддзяў і згаданых вышэй звестак (наяўнасць у маёнтку травасеяння, змаганне з-за паш з сялянамі, высокая ўраджайнасць палёў, словы бацькі пра кармленне кароў і коней) можна зрабіць выснову, што Эдвард Вайніловіч займаўся ў маёнтках адкормам жывёлы, вырошчваў кармавыя травы і збожжа, бульбу. Некаторае зніжэнне даходу яго маёнткаў можна часткова звязаць у 1880–1890-я гг. з уплывам аграрнага крызісу тых часоў. Цяжка недаацаніць згубны ўплыў кантрыбуцыйнага збору: у 1890-я гг., калі ён складаў

---

[42] НГАБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 2058. – Арк. 10–13зв.

12–12,2 %, члены Мінскага Аграрнага таварыства А. Елавіцкі і Я. Кавалеўскі меркавалі аб рэнтабельнасці маёнткаў пяці беларускіх губерняў у 2–3 %[43]. Мыбыць, пасля 1874 г. дядзька Люцыян мог падтрымліваць сродкамі, аднак у пачатку XX ст. рост землеўладання Эдварда Вайніловіча яўна сведчыў пра поспех яго гаспадаркі.

Важна акрэсліць ролю Мінскага сельскагаспадарчага таварыства ў лёсе Эдварда Вайніловіча. У межах Аграрнага таварыства мясцовыя памешчыкі атрымалі новыя і прытым легальныя магчымасці для развіцця гаспадаркі[44]. Гэта, напрыклад, дзейнасць ашчадна-крэдытнага таварыства ў Клецку, дзе Эдвард Вайніловіч быў старшынёй наглядчага савета і мог размяшчаць зберажэнні і браць крэдыты. Вядома, што адкрыўся «Клецкі Банк» з 3 тыс. руб. унесеных Э. Вайніловічам, а хутка ён меў гадавы абарот у 800 тыс. руб.[45] Важнае значэнне мелі пастаўкі ад імя сіндыката Мінскага Аграрнага таварыства інтэндантству зерня ў абыход пасрэднікаў, продаж угнаення, насення і сельскагаспадарчага інвентару са складоў згаданага сіндыката, гандаль прадуктамі сельскай гаспа-

---

[43] Бусько В. Н. Экономическая мысль Белоруссии середины XIX – начала XX в. Очерки. Минск, 1990. С. 59.

[44] Войнилович Э. Воспоминания. Минск, 2007. С. 75, 82.

[45] Там жа. С. 69.

даркі, а таксама льготы па страхаванні як вынік дамовы 1890 г. з Паўночным страхавым таварыствам Марозава[46].

Немалыя прыбыткі аграрнаму таварыству прынёс праект графа Чапскага аб арэндзе таварыствам мінскіх гарадскіх бойняў (1891–1910 гг.) і пастаўкі праз іх адкормленай мясной жывёлы з маёнткаў[47]. Як вынік, пастаўкі мясцовай жывёлы выраслі больш чым удвая, на столькі ж скраціўся прывоз стэпавай жывёлы. Пры бойнях была наладжана сушка агародніны (бульба, капуста)[48]. Вялікі ўздым абаротаў адзначаўся ў 1899 г. Цікава, што за 1878–1900 гг. баланс таварыства амаль штогод быў прыбытковы. Напрыклад, вялікія выгады прыносіла вінакурэнне[49]. Між тым, Эдвард Вайніловіч досыць позна, у 1904 г., адкрыў у Савічах вінакурню, што працавала да 1910 г.: гэта мерапрыемства, па яго словах, стала «несвоечасовым» і ўкладзеныя ў завод сродкі былі страчаны[50]. З успамінаў Вайніловіча вядома, што яму разам з Кяневічам

---

[46] Там жа. С. 84–86, 97. Грабовский Б. С. Краткий очерк двадцатилетней деятельности Минского общества сельского хозяйства. Минск, 1901. С. 30, 38, 42–43.

[47] Войнилович Э. Воспоминания. Минск, 2007. С. 84–86, 93–94, 97. Грабовский, Б. С. Краткий очерк ... С. 30, 38–39, 42–43.

[48] Войнилович Э. Воспоминания. Минск, 2007. С. 94.

[49] Грабовский Б. С. Краткий очерк... Минск, 1901. С. 74, 40.

[50] Войнилович Э. Воспоминания. Минск, 2007. С. 107.

і Э. Аленскім належыла нейкі час «няшчасная» фабрыка затычак у Пінску[51]. З тэксту, на жаль, не зразумела, калі існавала і чаму «няшчаснай» была гэта фабрыка: можа быў няўдалы камерцыйны праект, ці на лесё фабрыкі адбіліся падзеі Першай сусветнай вайны і рэвалюцый.

Вядома таксама, што з 20 ліпеня 1904 г. па 28 снежня 1914 г. Эдвард Вайніловіч быў апекуном ардынацый Радзівілаў у Беларусі[52]. Гэта — надзвычай вялікі давер. Відаць, што ў якасці апекуна ардынацый, як і пры вядзенні спраў Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, Вайніловіч кіраваўся такім прынцыпам: «...Адкінуўшы ўбок палітыку, узяліся ўздымаць родную зямлю-маці, каб атрымаць яе скарбы, што заклалі яшчэ папярэднія пакаленні», «...прынцыпы годнасці, працы і справядлівасці ... без іх існае сёння будзе марнатраўствам, а адраджэнне — немагчымым»[53]. Варта адзначыць, што ў абставінах месца і часу была запатрабаванай і важнай праца Мінскага Аграрнага таварыства. У 1878 г. 92 % маёнткаў Мінскай губерні мелі старую трохпольную сістэму, у 85 % маёнткаў глебы апрацоўваліся драўлянымі сохамі і баронамі, у 95 % маёнткаў не было сеялак і саломарэзак і ў 64 % —

---

51 Там жа. С. 277.

52 Там жа. С. 118, 121.

53 Там жа. С. 101, 103.

малацілак і веялак; неспрыяльнай была дзяржаўная палітыка (сэрвітуты, цяжкія падаткі), не было крэдыту і агранамічных ведаў, у гандлёвай сферы панавалі перакупшчыкі[54]. Менавіта тады Эдвард Вайніловіч быў адным са стваральнікаў Аграрнага таварыства, звярнуў на сябе ўвагу энергіяй і здольнасцямі. Так, менавіта ён адстаяў інтарэсы землякоў на імперскім Сельскагаспадарчым з'ездзе ў Смаленску ў 1881 г. і актыўна прадстаўляў дасягненні таварыства на Усерасійскай сельскагаспадарчай выставе 1883 г. Усё тое прывабіла землеўласнікаў у Мінск, пазнаёміла многіх гаспадароў і адкрыла ім новыя магчымасці, падбадзёрыла песімістаў[55].

Немалыя дывідэнды Э. Вайніловічу прыносілі ўкладзеныя капіталы ў гандлёвую дзейнасць сіндыката Мінскага Аграрнага таварыста. Разам з тым, пры заснаванні апошняга Вайніловіч мусіў, па яго словах, укласці 30 тыс. руб., што толькі праз 20 год яму вярнуліся[56]. Пазней, паводле Януша Івашкевіча, каля 300 тыс. руб. Эдвард Вайніловіч ахвяраваў на будаўніцтва Чырвонага касцёла ў Мінску[57]. Гэтыя сродкі, відаць па ўсім, даў яму ўдзел у аперацыях сіндыката.

---

[54] Грабовский Б. С. Краткий очерк... Минск, 1901. С. 3–4.

[55] Там жа. С. 10, 52.

[56] Войнилович Э. Воспоминания. Минск, 2007. С. 97.

[57] Там жа. С. 12.

Падарвала гаспадарку ў Савічах вайна. Так, Э. Вайніловіч адзначаў у 1915 г. вялікія плыні бежанцаў, якія, «падобна да саранчы, пакідалі пасля сябе пустэчу»: самавольна забіралі і ўжывалі зерне і салому маёнтка, а з 600 вазоў сена пакінулі ўласніку толькі 2–3 вазы кармоў на зіму[58]. У прамежку з 19 па 21 лютага 1918 г. маёнтак Савічы пры паблажцы вясковага камітэта з былых дваровых людзей быў разрабаваны салдатамі-дэзерцірамі і мясцовымі сялянамі. Разбураны дом землеўласніка, яго жывёла, вазы і іншы інвентар былі вывезены. Быў знішчаны архіў, галерэя партрэтаў і бібліятэка. Не засталося нават вопраткі[59]. 2 снежня 1918 г. Эдвард Вайніловіч разам з жонкай пакінуў Савічы, але затым вярнуўся і прабыў там з 9 верасня 1919 г. па 7 ліпеня 1920 г.[60] Цікавы вопыт гаспадара Вайніловіча ў той прамежак часу: душэўных сіл працаваць і спадзяванняў на будучыню праз чаканае вяртанне бальшавікоў не было, «голыя сцены, паламаная мэбля, абутак дзіравы, толькі пара талерак для кашы і бульбы, вечары без святла». Тым не менш, ён сам пайшоў 1 кастрычніка капаць бульбу ў замаразкі і, відаць, ашчаджаў на ўсім[61]. І пры тым не губляў

[58] Там жа. С. 227.

[59] Там жа. С. 243, 248–249, 251.

[60] Там жа. С. 264, 295, 325.

[61] Там жа. С. 295–296.

чалавечнасці і спагадлівасці. Калі мясцовыя сяляне паскардзіліся на крыўду ад польскіх салдат, ён палічыў за свой абавязак звярнуць увагу ўлад на іх праблемы, не шкадаваў сябе і нярэдка праводзіў бяссонныя ночы ў дарозе дзеля вырашэння актуальных для грамадства праблем краю[62].

Такім чынам, адзначым, што Эдвард Вайніловіч быў руплівым і дасканалым вясковым гаспадаром. Яго, пэўна, нельга назваць бліскучым камерсантам. Аднак цяга да працы і шчырасць да людзей, самаахвярнае ім служэнне, арганізацыйны талент «мінскага Бісмарка» ўплывалі на сучаснікаў і супрацоўнікаў. Гэты актыўны грамадскі дзеяч заставаўся тым, хто ўпарта пераадольваў бясконцыя і жорсткія выклікі лёсу: беднасць, ціск чыноўніцтва і сялянства, сямейныя драмы. Можна з упэўненасцю канстатаваць, што Э. Вайніловіч меў вялікую мужнасць і надзвычайную творчую энергію, каб прайсці свой жыццёвы шлях.

[62] Там жа. С. 296, 307.

*Юлия Литвинчук*

# ДЕЛОПРОИЗВОДСТВЕННЫЕ МАТЕРИАЛЫ МИНСКОЙ ГУБЕРНСКОЙ СТРОИТЕЛЬНОЙ КОМИССИИ КАК ИСТОРИЧЕСКИЙ ИСТОЧНИК ПО ИСТОРИИ МАЛОЙ РОДИНЫ Э. ВОЙНИЛОВИЧА

Меценатство Э. Войниловича сыграло значимую роль в области строительного дела в Минской губернии. В связи с тем, что Э. Войнилович был выходцем Слуцкого уезда[1], остановимся на рассмотрении вопросов градостроительства данного региона на основе архивных материалов Минской губернской строительной комиссии (МГСК), хранящихся в Национальном историческом архиве Беларуси в Минске (НИАБ).

Среди материалов делопроизводства по градостроительству особое место занимает фонд 446 «Минская губернская строительная комиссия». Данный фонд включает 561 единицу хранения, среди которых: журналы заседаний, указы, постановления минского гражданского губернатора о ремонте мостов, книги регистрации чертежей

[1] Войнилович Э. А. Воспоминания. Минск, 2007.

и планов, прошения жителей о выдаче разрешений на постройку домов и других строений, ведомости на строительные материалы, дела о строительстве, ремонте дорог, мостов, плотин, мельниц и домов.

Минская Губернская строительная комиссия была создана на основании «Положения о новом образовании строительной части гражданского ведомства» от 29 сентября 1832 г.[2] Она ведала распорядительной и хозяйственной частью гражданских сооружений независимо от того, производились ли постройки за счет казны или за счет земских повинностей, из сумм приказов общественного призрения или городских доходов из частных пожертвований в пользу казны и общества. Обязанности Минской губернской строительной комиссии включали рассмотрение и составление описей и смет, надзор за состоянием казенных и общественных зданий, находившихся в ее ведении составление и утверждение планов, проведения их ремонта и перестройки, строительство новых зданий, ремонта и постройки деревянных мостов. В состав комиссии входили: губернатор (председатель) и такие члены, как ассесор (занимался хозяйственной частью), губернский архитектор и его

---

2 Положение о новом образовании строительной части гражданского ведомства // Полное собрание законов Российской империи. Т. 7. Ст. 5624. С. 627.

помощник (губернский секретарь), один-два офицера корпуса инженеров путей сообщения[3]. 31 января 1851 г. на основании указа Сената Минская губернская строительная комиссия была преобразована в единую губернскую строительную и дорожную комиссию[4].

Среди сохранившихся дел данного фонда по Слутчине наибольший интерес представляют: «Дело по отношению Минского губернского правления о скорейшем составлении губернским архитектором плана и фасада на постройку Забельской Успенской церкви Слуцкого у.», «Дело о ремонте здания Слуцкого лазарета», «Дело о самовольной выдаче мещанином Б. Шаевичем планов на постройку домов жителями г. Слуцка». Так, в «Деле по отношению Минского губернского правления о скорейшем составлении губернским архитектором плана и фасада на постройку Забельской Успенской церкви Слуцкого у.»[5] от 9–20 июля 1834 г.

---

[3] Положение о новом образовании строительной части гражданского ведомства // Полное собрание законов Российской империи. Т. 7. Ст. 5624. С. 628.

[4] Сенатский указ о преобразовании губернских строительных и дорожных комиссий в губерниях: Эстляндской, Новгородской, Вологодской, Подольской, Минской, Тамбовской, Астраханской и Оренбургской // Полное собрание законов Российской империи. Т. 26. Ст. 24888. С. 103.

[5] Национальный исторический архив Беларуси (далее — НИАБ). Ф. 446. Оп. 1. Д. 36. Л. 1.

имеется протокол заседания от 3 июля 1834 г. На заседании губернского правления был заслушан вопрос о постройке в Слуцком уезде Забельской Успенской церкви. При этом последовало требование прислать план и фасад на постройку в селе Забелы новой деревянной церкви с колокольней. Минский губернатор А. Ф. фон Дребуш поручил данное дело архитектору губернского правления.

Касаясь истории Забельской Успенской церкви, следует отметить противоречивость и неточность сведений. Причиной данной ситуации является слабая источниковая база. Начальный период представлен преданием, которое гласит, что в период падежа скота бедному крестьянину Иосифу Забеле явилась во сне Божья Матерь. Она повелела ему убить его единственного вола, отнести кожу в Слуцк и передать «некому живописцу». Бедный крестьянин так и сделал. Именно на этом куске кожи встретившийся ему при входе в город живописец написал икону Богоматери[6]. Есть сведения, что в 1662 г. униатский митрополит Габриэль Коленада дал крестьянину Иосифу Забеле разрешение на строительство новой церкви и размещение в ней

---

[6] Описание церквей и приходов Минской епархии: составлено по официально затребованным от причтов сведениям. Минск, 1878–1879. С. 107–108.

чудотворной иконы Богоматери[7]. Однако источник XIX в., который содержит исторический очерк Забельской церкви, не подтверждает дату постройки церкви и то, что она строилась изначально как униатская. Но в нем отмечается, что на Евангелии есть указание, что данная икона была в церкви уже до 1666 г. и на ней тогда были привески. Речь идет о 43 серебряных привесках, имеющих вид груди, сердца, руки и ноги, которые служили знаками исцелений, что получили многие страждущие от этого чудотворного образа.

Согласно «Описанию церквей и приходов Минской епархии» в конце 1870-х гг., это приходская церковь, к которой были приписаны каменная Вознесенская в Стенкове (построена в 1831 г. помещицей Судаковой) и деревянная в Замостье. Приход состоял из 16 селений: Забелы, Шимчицы, Камень, Карачовщина, Стенков, Евладовичи, Адамово, Руднево, Страхов, Новины, Низище, Веребьево, Захатиново, Круков, Морозы и Замостье. Количество прихожан — 2207 человек[8]. Здесь же

---

7 Борисенко О. По следам иконы Пресвятой Богородицы // История и судьбы // Ср, 13/08/08 — 07:26 // Слуцк, Газета «Инфа-Курьер» // [Электронный ресурс]. — 2000–2015. — Режим доступа: http://kurjer.info/2008/08/13/po-sledam-ikony-presvyatoj-bogorodicy/. — Дата доступа: 09.11.2015.

8 Описание церквей и приходов Минской епархии: составлено по официально затребованным от причтов сведениям. С. 109.

даётся и её описание: «Зданием церковь сия деревянная, в виде продолговатого креста, с колокольней в фронтонной части, покрыта гонтом, с одним глухим куполом; крыша и стены покрашены масляною, кирпичного цвета краскою»[9].

Имеются сведения о нравственно-религиозном состоянии прихожан, а именно то, что прихожане свято соблюдают православные обычаи. Для обучения детей грамоте и молитвам в четырёх деревнях прихода в свободное от сельскохозяйственных работ время открывались домашние школы. Но здесь же отмечалось, что «обучение в оных за недостатком средств содержания и удобных помещений идет неуспешно, поэтому процент грамотности в приходе самый незначительный, едва достигающий 3 % от всего населения»[10]. Подобный показатель и в самом деле был весьма «незначительным». Ибо, как свидетельствуют материалы переписи 1897 г., в целом по Минской губернии (в уездах без учета городов) уровень грамотности среди населения составлял 22,7 % — у мужчин и 7,14 % — у женщин[11]. По Слуцкому уезду уровень

---

[9] Описание церквей и приходов Минской епархии: составлено по официально затребованным от причтов сведениям. С. 107.

[10] Описание церквей и приходов Минской епархии: составлено по официально затребованным от причтов сведениям. С. 110.

[11] Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. СПб., 1904. С. XII.

грамотности населения в целом составлял 20,4 %, в Слуцке – 47,7; Несвиже – 45,5 %[12]. Возможно, что не изменилась ситуация в Забельском приходе и в связи с открытием в д. Камень церковно-приходской школы, ибо наличие одной такой школы на весь приход[13] не свидетельствует о большом стремлении православного духовенства к повышению грамотности местного населения.

В 1930-х гг. в связи с гонениями на церковь со стороны советской власти Забельская церковь была закрыта, а затем полностью разрушена[14].

«Дело о ремонте здания Слуцкого лазарета»[15] от 5 января 1835 г. – 16 марта 1837 г. содержит рапорт от 1835 г. начальника полицейского управления Слуцкого и Бобруйского уездов, подполковника Кремчина, направленный Минскому гражданскому губернатору и кавалеру князю Сергею Ивановичу Давыдову. В нем говорится об освидетельствовании произведения починки лаза-

---

12 Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. СПб., 1904. С. 1.

13 Российский государственный исторический архив. Ф. 1290. Оп. 11. Д. 1336. Л. 1710.

14 Борисенко О. По следам иконы Пресвятой Богородицы // История и судьбы // Ср, 13/08/08 – 07:26 // Слуцк, Газета «Инфа-Курьер» // [Электронный ресурс]. – 2000–2015. – Режим доступа: http://kurjer.info/2008/08/13/po-sledam-ikony-presvyatoj-bogorodicy/. – Дата доступа: 09.11.2015.

15 НИАБ. Ф. 446. Оп. 1. Д. 152. Л. 1.

рета Слуцким городничим Стаховским. Данный рапорт подтверждает выполнение строительной комиссией ремонтных работ и свидетельствует об особом внимании местных властей к вопросам сохранения казенных зданий и внимательном отношении к здравоохранению.

Наиболее привлекательным в плане исторического детектива выглядит архивное дело под названием «Дела о самовольной выдаче мещанином Б. Шаевичем планов на постройку домов жителями г. Слуцка»[16]. Слуцкий уездный землемер 26 июня 1835 г. направил рапорт в Минскую губернскую строительную комиссию, где сообщал, что слуцкий мещанин еврей Берко Шаевич внушает жителям города будто бы он архитектор и занимается выдачей планов и отведением мест под постройку домов на новых проектированных улицах. Делается это, естественно, за определенную плату. Землемер просил строительную губернскую комиссию о помощи в «уничтожении возникшего зла». Чем закончилась это история, установить не удалось, можно лишь предположить, что противозаконные действия были пресечены. Замечание, изложенное в рапорте, является примером того, что Минской губернской строительной комиссии, помимо пря-

[16] НИАБ. Ф. 446. Оп. 1. Д. 188. Л. 1.

мых обязанностей, приходилось заниматься вопросами частного порядка.

Таким образом, делопроизводственные материалы по Слуцкому уезду, представленные в 446 фонде «Минской губернской строительной комиссии» Национального исторического архива Беларуси, являются довольно интересным и важным историческим источником. Они раскрывают процесс строительства культовых сооружений (например, Забельской Успенской церкви сразу после восстания 1830–1831 гг.), роль строительной комиссии в области ремонтных работ, широту полномочий Минской губернской строительной комиссии, специфику строительной деятельности данного региона.

*Валянцін Мазец*

# ЭДВАРД ВАЙНІЛОВІЧ І ПРАЦЭС ІНСТЫТУАЛІЗАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў 1917–1918 гг.

У лісце ад 7 красавіка 1918 г. старшыні Народнага сакратарыяту БНР Я. Варонку ад імя Віленскай Беларускай Рады адзначалася: «Немцы ў прыпадку жаданай для нас развязкі нашае справы гатовы падтрымаць наша дзяржаўнае будаўніцтва, заяўляючы, што за помач яны будуць вымагаць таможаннага саюза Беларусі з цэнтральнымі дзяржавамі ... Яны не давяраюць сілам левых элементаў у дзяржаўным будаўніцтве і за залог удачы ўважаюць учасце элементаў найбольш умеркаваных ... Трэба знайсці “залатую сярэдзіну” між жаданнямі народных мас і вымаганнямі палітычнае кан’юнктуры»[1].

Менавіта да ліку такіх «умеркаваных элементаў» мы можам аднесці і Э. Вайніловіча, які на пра-

[1] Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (далей – БДАМЛМ). Ф. 3. Воп. 1. Спр. 126. Арк. 108.

цягу 1917–1918 гг. паслядоўна адстойваў ідэю беларускай дзяржаўнасці.

Да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. на неакупіраванай германскімі войскамі тэрыторыі Беларусі дзейнасць беларускіх арганізацый, якія ставілі б перад сабой палітычныя мэты, была немагчымая. І толькі пасля звяржэння самадзяржаўя на абшарах былой імперыі выразна намецілася тэндэнцыя да «стварэння шэрагу кампактных, параўнальна аднародных паводле этнічнага складу насельніцтва, нацыянальных дзяржаў»[2].

У змененых палітычных абставінах прадстаўнікі самай уплывовай арганізацыі мясцовых землеўласнікаў – Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі на чале з Э. Вайніловічам актыўна ўключыліся ў працэс барацьбы за палітычную будучыню сваіх зямель.

25–27 сакавіка 1917 г. па ініцыятыве Мінскага аддзела Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (які са студзеня 1917 г. узначальваў землеўласнік Р. Скірмунт), Беларускай партыі народных сацыялістаў (у склад якой разам з Р. Скірмунтам уступіў і Э. Вайніловіч) і Беларускай сацыялістычнай грамады быў склікаены з’езд бела-

---

[2] Ладысеў У. Ф., Брыгадзін П. І. Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.). Мінск, 2003. С. 6.

рускіх нацыянальных арганізацый. Дарэчы, цэнтральнае месца ў праекце праграмы БПНС займала аграрнае пытанне. Праграма партыі не прадугледжвала неадкладнага пераходу ўсёй зямлі ў агульнанародную ўласнасць, хоць у праекце праграмы заяўлялася, што «ўся зямля павінна быць агульнанароднай уласнасцю». Улічваючы наяўнасць у Беларусі вялікай масы малазямельных сялян, БПНС прапаноўвала пашырыць іх надзелы за кошт царскіх, царкоўных і манастырскіх зямель, якія павінны былі падвергнуцца прымусоваму адчужэнню. І толькі ў выпадку недахопу зямлі планавалася адабраць у памешчыкаў тыя маёнткі, якія ім былі «падараваны польскімі каралямі ці расійскімі імператарамі», а таксама куплены за гады Першай сусветнай вайны. Адчужаныя землі павінны былі паступаць у распараджэнне Беларускай краёвай рады і скласці «нацыянальны народны фонд». Гэтым самым БПНС разлічвала адхіліць ад актыўнага палітычнага жыцця тых землеўласнікаў, якія прытрымліваліся польскай ці расійскай арыентацыі. БПНС рабіла стаўку на тыя сілы, якія заставаліся вернымі нацыянальнай ідэі і выступалі за беларускую дзяржаўнасць[3].

[3] Октябрь 1917 г. и судьбы политической оппозиции. Совместное русско-белорусское исследование: В 3 ч. Ч. II. Гомель, 1993. С. 81.

Створаны на з'ездзе беларускіх арганізацый Беларускі нацыянальны камітэт узначаліў беларускі землеўласнік, сябар Э. Вайніловіча Р. Скірмунт. У адпаведнасці з рашэннямі з'езда ў красавіку 1917 г. да расійскага Часовага ўрада была накіраваная дэлегацыя на чале з Р. Скірмунтам. Але прапановы дэлегацыі БНК прадаставіць Беларусі аўтаномію ў межах Расійскай дэмакратычнай рэспублікі і правесці дэмакратычныя выбары ў мясцовыя органы ўлады не атрымалі падтрымкі з боку Часовага ўрада[4].

Розныя падыходы да вырашэння аграрнага пытання абумовілі нарастанне супярэчнасцей паміж кіраўніком БНК Р. Скірмунтам і прадстаўнікамі Беларускай сацыялістычнай грамады. На пасяджэнні БНК, якое адбылося ў маі 1917 г., Р. Скірмунт, дзякуючы падтрымцы з боку буйных землеўласнікаў, у тым ліку і Э. Вайніловіча, здолеў на нейкі час заблакіраваць прыняцце прапанаваных прадстаўнікамі БСГ радыкальных аграрных пераўтварэнняў.

Рост супярэчнасцей у кіраўніцтве ўрэшце прывёў да скасавання БНК на другім з'ездзе беларускіх арганізацый і партый 10 ліпеня 1917 г. і стварэння замест яго Цэнтральнай рады беларускіх арганіза-

---

[4] Рудовіч С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе. Мінск, 2001. С. 123.

цый і партый, кіраўніцтва якой знаходзілася ў руках членаў БСГ: Я. Лёсіка, Я. Дылы, З. Жылуновіча, Ф. Шантыра і старшыні БСГ А. Смоліча. Дарэчы, у ліпені 1917 г. ЦК БСГ апублікаваў новы праект праграмы — «Чаго хоча Беларуская Сацыялістычная Грамада». Пасля доўгай дыскусіі і барацьбы 25 кастрычніка 1917 г. III з'езд БСГ прыняў новую праграму партыі. У адрозненне ад нацыянальна-ліберальных партый, якія прапаведавалі тэорыю класавага міру ўнутры беларускай нацыі, БСГ у абноўленым праграмным дакуменце пацвердзіла сацыялістычную арыентацыю і заявіла аб «сваёй канчатковай мэце здзяйснення сацыялістычнага ладу шляхам развіцця міжнароднай класавай барацьбы і сацыяльнай рэвалюцыі»[5]. У праграме БСГ таксама выказала ідэю ліквідацыі эканамічнага прыгнёту, скасавання класаў, ставіла задачу ўсталявання грамадства, дзе павінна панаваць «права на поўны прадукт працы». З'яўляючыся рэвалюцыйна-дэмакратычнай партыяй беларускай арыентацыі, БСГ у сваіх праграмных дакументах заявіла аб неабходнасці дабівацца поўнага самавызначэння (аўтаноміі) Беларусі ў складзе Расійскай дэмакратычнай рэспублікі «з заканадаўчым органам Краёвай Рады,

[5] Программа Белорусской Социалистической Громады (принята III партийным съездом 14—25 октября 1917 года в Минске) // Палітычныя партыі. Мінск, 1994. С. 74—75.

выбранай на аснове ўсеагульнага, роўнага, прамога, тайнага і прапарцыянальнага выбарчага права»[6].

Такім чынам, радыкалізацыя палітычных настрояў з'явілася перашкодай для супольнага змагання за беларускую дзяржаўнасць прадстаўнікоў розных грамадска-палітычных напрамкаў.

Выступаючы супраць прапаноў БСГ, якія датычыліся шляхоў вырашэння аграрнага пытання і закранал непасрэдна іх маёмасныя інтарэсы, Э. Вайніловіч, як і яго паплечнік Р. Скірмунт, займалі цвёрдую і паслядоўную пазіцыі па пытанні дзяржаўнага самавызначэння Беларусі. Так, яны адмовіліся ад прапановы ўвайсці ў склад створанай у пачатку чэрвеня 1917 г. Польскай рады Мінскай зямлі[7].

Нягледзячы на палітычныя супярэчнасці, на працягу 1917 г. ідэя дзяржаўнага самавызначэння Беларусі аб'ядноўвала вакол сябе ўсё больш прыхільнікаў. 18–24 кастрычніка 1917 г. у Мінску адбыўся з'езд беларусаў-вайскоўцаў Заходняга фронту, у рабоце ўдзельнічалі таксама прадстаўнікі

---

[6] Программа Белорусской Социалистической Громады (принята III партийным съездом 14—25 октября 1917 года в Минске) // Палітычныя партыі. Мінск, 1994. С. 77.

[7] Jurkowski R. Rada Polska Ziemi Mińskiej wobec I Korpusu polskiego gen. J. Dowbór-Muśnickiego // Знакамітыя мінчане: Матэрыялы Беларуска-польскай навук. канф., Мінск, 9 ліст. 2006 г. Мінск, 2007. С. 66–67.

беларускіх арганізацый XII арміі Паўночнага фронту і Балтыйскага флоту. На з'ездзе была створана Цэнтральная беларуская вайсковая рада, выбраны яе Часовы выканаўчы камітэт з 15 чалавек[8], а таксама Беларускі вайсковы камітэт Заходняга фронту на чале з К. Кандратовічам у складзе 20 чалавек[9]. 27 кастрычніка 1917 г. на аснове Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый была заснавана Вялікая беларуская рада.

Маючы ў сваім распараджэнні пэўную сілу (агульная колькасць членаў розных беларускіх грамадска-палітычных аб'яднанняў, якія мелі прадстаўніцтва ў Цэнтральнай радзе беларускіх арганізацый складала ў пачатку кастрычніка 1917 г. больш за 27 тыс. чалавек[10]) Вялікая беларуская рада разам з ЦБВР у канцы кастрычніка 1917 г. «рыхтаваліся да прыняцця ўсёй улады на абшарах этнаграфічнай Беларусі»[11].

Але ў працэсе дзяржаўнага вызначэння Беларусі з'явіўся новы фактар. Да ўлады ў Петраградзе ў кастрычніку 1917 г. прыйшлі бальшавікі.

---

8 Дзяржаўны архіў Літвы. Ф. 582. Воп. 1. Спр. 15. Арк.157.

9 Аддзел рукапісаў бібліятэкі Акадэміі навук Літвы. Ф. 21. Спр. 2231. Арк. 165.

10 Рудовіч С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе. Мінск, 2001. С. 133.

11 Варонка Я. Беларускі рух ад 1917 да 1920 году: карот. агляд. Коўна, 1920. С. 6.

Пасля іх прыходу да ўлады адным з першых быў абвешчаны 26 кастрычніка 1917 г. Дэкрэт аб зямлі, у адпаведнасці з якім скасоўвалася прыватная ўласнасць на зямлю і тым самым ўладальнікі маёнткаў пазбаўляліся сваёй рухомай і нерухомай маёмасці, а паводле дэкрэта ад 11 лістапада 1917 г. і самі землеўласнікі фактычна апынуліся па-за законам, паколькі скасоўвалася дваранскае саслоўе. Пасля прыняцця дэкрэтаў колькасць нападаў на маёнткі землеўласнікаў у Беларусі павялічылася. Не абмінула такая бяда і маёнтак Э. Вайніловіча. Літаральна напярэдадні чарговага наступлення германскіх войск 6–7 лютага (19–20 лютага паводле новага стылю) 1918 г. дэзерціры расійскай арміі пры ўдзеле мясцовых жыхароў разграбавалі палац Э. Вайніловіча ў маёнтку Савічы Слуцкага павета, у выніку чаго «загінула культурная спадчына адзінаццаці пакаленняў»[12].

Абвяшчэнне 2 лістапада 1917 г. урадам Савецкай Расіі у «Дэкларацыі правоў народаў Расіі» права народаў на «вольнае самавызначэнне аж да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў» давала тэарэтычную магчымасць для вырашэння праблемы дзяржаўнага ўладкавання Беларусі. Беларусы не прамінулі выкарыстаць такую магчымасць.

---

[12] Войнилович Э. Воспоминания. Минск, 2007. С. 250.

Так, у сумеснай грамаце ВБР і ЦБВР «Да ўсяго Народа Беларускага» падкрэслівалася, што «Беларусь ... з'яўляецца адзінай і непадзельнай краінай, звязанай братэрскай сувяззю са ўсёй астатняй Федэратыўнай Расійскай Рэспублікай»[13]. Зноў жа да «ідэі ўтварэння аўтаномна-свабоднай Беларусі, як часткі Расійскай Федэратыўнай Рэспублікі» звярнуўся 17 лістапада 1917 г. у сваёй дэкларацыі Беларускі абласны камітэт, заснаваны пры Усерасійскім савеце сялянскіх дэпутатаў у Петраградзе[14].

Чарговым крокам на шляху рэалізацыі ідэі беларускай дзяржаўнасці быў Першы Усебеларускі з'езд, скліканы ў снежні 1917 г. Згодна з пратаколам з'езда, калі на пленарным пасяджэнні ў ноч з 17 на 18 снежня пачалося абвяшчэнне рэзалюцыі па пытанні аб сучасным становішчы Беларусі і формах арганізацыі краёвай улады, у зале пасяджэнняў з'явіліся прадстаўнікі СНК Заходняй вобласці: наркам унутраных спраў Рэзавускі і начальнік мінскага гарнізона Крывашэін, гвалтоўна перарваўшы працу з'езда.

Дэлегатамі з'езда па разгледжанай раней рэзалюцыі было прынята рашэнне «вылучыць са свайго складу орган краёвай улады ў асобе Ўсебеларуска-

---

[13] Турук Ф. Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белорусов. М., 1921. С. 97.
[14] Тамсама. С. 101.

га Савета Сялянскіх, Салдацкіх і Рабочых Дэпутатаў, якому ўручыць кіраванне Беларуссю аж да склікання Беларускага Устаноўчага Сходу»[15].

Усебеларускі з'езд паўплываў на далейшае развіццё беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, прымусіўшы лічыцца з абуджэннем нацыянальнай свядомасці беларускага народа нават тых, хто ўсімі сіламі спрабаваў змагацца з ёй як з перашкодай на шляху да сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Разгон з'езда не мог ужо спыніць далейшага развіцця беларускага руху.

18 снежня 1917 г. дэлегаты з'езда сабраліся на нелегальнае пасяджэнне ў клубе чыгуначнікаў і прынялі шэраг пастаноў аб арганізацыі ўлады ў Беларусі. А менавіта:

«1) Лічыць І-ы Усебеларускі з'езд разагнаным сілай. 2) Савет з'езда прызнаць выканаўчым органам з'езда, у абавязак якога ўваходзіць ажыццяўленне ўсіх рашэнняў і пастаноў з'езда. 3) Папоўніць Савет з'езда дэлегатамі зямляцтваў і іншых груп, дазволіць права адводу і кааптацыі — і г. д.»[16].

Неабходна адзначыць, што з'езд як выразнік інтарэсаў палітычна актыўнай часткі беларускага народа меў найвышэйшую ва ўмовах таго часу

[15] Речь А. Т. Вазилло, произнесённая на 1-м Всебелорусском сьезде. Предисловие Е. С. Канчера. Петроград, 1918. С. 2.

[16] Канчер Е. Белорусский вопрос: сб. ст. Петроград, 1919. С. 52.

ступень легітымнасці. Таму створаныя ім органы: Савет (Рада) з'езда і Выканаўчы камітэт Рады з'езда мелі права прымаць легітымныя рашэнні па пытаннях, што датычыліся лёсу Беларусі і яе народа.

18 лютага 1918 г. на тэрыторыі Беларусі разгарнулася нямецкае наступленне на ўсход ад лініі Дзвінск – Браслаў – Паставы – Смаргонь – Баранавічы – Пінск. 20 лютага Выканаўчы камітэт Рады I Усебеларускага з'езда выдаў Першую Устаўную грамату, у адпаведнасці з якой абвясціў сябе часовай уладай на Беларусі і абавязаўся ў хуткім часе склікаць Усебеларускі Устаноўчы сход.

3 сакавіка 1918 г. у Брэсце быў падпісаны мірны дагавор паміж Расіяй з аднаго боку і Германіяй, Аўстра-Венгрыяй, Балгарыяй і Турцыяй – з другога. Паводле ўмоў гэтага дагавора тэрыторыя Беларусі была падзелена па лініі Дзвінск – Свянцяны – Ліда – Пружаны – Брэст.

Своеасаблівым пратэстам супраць несправядлівага мірнага дагавора было абвяшчэнне Выканаўчым камітэтам Рады з'езда 9 сакавіка 1918 г. Другой Устаўной граматы, у якой Беларусь была абвешчана Народнай Рэспублікай у межах «рассялення і колькаснай перавагі беларускага народа». Але ў Другой Устаўной грамаце, якая абвясціла Беларускую Народную Рэспубліку, нічога не было

сказала аб яе суверэннасці і адносінах да суседніх краін.

25 сакавіка 1918 г. была прынятая Трэцяя Устаўная грамата, згодна з якой БНР абвяшчалася незалежнай і вольнай дзяржавай. На падставе гэтага акта было заяўлена пра скасаванне ўсіх старых дзяржаўных сувязей, а Народнаму сакратарыяту даручалася звярнуцца да зацікаўленых бакоў з прапановай перагледзець умовы Брэсцкага міру.

Рада БНР настойліва спрабавала дабіцца ад нямецкага ўрада прызнання дзяржаўнай незалежнасці БНР. У пачатку красавіка 1918 г. Народны сакратарыят накіраваў мемарандум германскаму рэйхсканцлеру, у якім паведамляў аб прыняцці Другой і Трэцяй Устаўных грамат, прасіў прызнаць незалежнасць БНР, а таксама перагледзець тыя пункты Брэсцкай дамовы, якія датычылі Беларусі[17]. У адказ на гэтыя захады рэйхсканцлер паведаміў Народнаму сакратарыяту БНР, што Берлін разглядае Беларусь як «частку савецкай Расіі» і па Брэсцкай дамове без урада Леніна пытанне сам вырашыць не можа[18].

У абставінах, калі праца Рады БНР была амаль паралізавана, прадстаўнікі Віленскай беларускай рады, створанай у студзені 1918 г., у якасці выха-

---

[17] Тамсама. С. 90.

[18] Варонка Я. Беларускі рух ад 1917 да 1918 году: карот. агляд. С. 12.

ду з сітуацыі прапанавалі кааптаваць у склад Рады БНР членаў Мінскага Беларускага прадстаўніцтва.

На пасяджэннях 12 і 14 красавіка Рада БНР прыняла рашэнне аб каапгацыі Выканаўчага камітэта Мінскага Беларускага прадстаўніцтва, у які ўваходзілі протаіерэй П. Кульчыцкі, генерал К. Кандратовіч, ксёндз В. Гадлеўскі, Р. Скірмунт, А. Уласаў, П. Аляксюк, В. Чавусаў, Р. Зямкевіч і А. Русецкі.

Э. Вайніловіч некалькі разоў прысутнічаў на пасяджэннях Рады БНР, бачыў «вялікую карту Беларусі, межы якой сягалі з аднаго боку да Падляшша, с другога — да Смаленска і Чарнігава на ўсходзе» [19].

20 ліпеня 1918 г. урад БНР на чале з Р. Скірмунтам, праіснаваўшы каля двух тыдняў, быў вымушаны пайсці ў адстаўку[20]. Прадстаўнікоў сацыялістычнай арыентацыі ў Радзе БНР незадавальняла пазіцыя Р. Скірмунта ў вырашэнні аграрнага пытання.

Такім чынам, на працягу 1917–1918 гг. у працэсе змагання за рэалізацыю ідэі беларускай дзяржаўнасці, нягледзячы на асобныя, адносна непрацяглыя перыяды кансалідацыі, дасягнуць палітычнага кампрамісу паміж беларускімі зем-

---

[19] Войнилович Э. Воспоминания. Минск, 2007. С. 259.

[20] Ладысеў У. Ф. На пераломе эпох: станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917—1920 гг.) Мінск, 1999. С. 42.

леўласнікамі і прадстаўнікамі партый сацыялістычнай арыентацыі так і не атрымалася.

З аднаго боку, гэта стала адной з прычын таго, што прцэс інстытуалізацыі беларускай дзяржаўнасці ў форме БНР так і не быў завершаны. З другога боку, такая сітуацыя стала асабістай трагедыяй для Э. Вайніловіча і яго паплечнікаў, якія паслядоўна выступалі за тое, каб Беларусь стала паўнаpraўным суб'ектам міжнародных адносін.

*Віталь Макарэвіч*

# ФАЛЬСІФІКАВАННЕ ДВАРАНСКІХ ДАКУМЕНТАЎ У БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ГУБЕРНЯХ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (30–70-я гг. XIX ст.)

Рэакцыяй на палітыку расійскага ўрада па «разборы» шляхты ў губернях, далучаных пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, стала масавае фальсіфікаванне дакументаў аб дваранскім паходжанні. Гэта з'ява на пэўным этапе набыла надзвычай шырокія маштабы і давала магчымасць зацвердзіцца ў дваранстве шляхце, якая па нейкіх прычынах страціла свае дакументы, альбо іх не мела. Не будзе памылкай таксама адзначыць, што фальсіфікаванні адкрывалі дарогу да прывілеяванага саслоўя многім асобам, якія ўвогуле не мелі дачынення да шляхты.

Фальсіфікаванні і ўсялякія злоўжыванні з дваранскімі спісамі і дакументамі фіксаваліся ўладамі на далучаных пасля падзелаў Рэчы Паспалітай тэрыторыях беларуска-літоўскіх губерняў ўжо з канца XVIII ст. Асабліва шырокі размах падробка дакументаў набыла з 1830-х гг., пасля выдання ўказа 19 кастрычніка 1831 г. Ён пакідаў шляхце двухгадовы тэрмін на прадастаўленне доказаў свайго

дваранскага паходжання. Той, хто не даказаў свайго высакароднага паходжання, павінен быў перайсці ў падаткаабкладаемыя катэгорыі — плаціць падаткі і даваць рэкрута.

Шляхта неадкладна звярнулася да нелегальных шляхоў доказу свайго паходжання. Варта адзначыць, што сапраўднымі дакументамі валодалі нямногія, а ў большасці шляхта ўвогуле не магла належным чынам даказаць сваё дваранскае паходжанне. Гэта, як правіла, была дробная чыншавая шляхта, якая вялікімі ваколіцамі пражывала ў радзівілаўскіх і іншых маёнтках магнатаў ці заможных уладальнікаў. Яна часта ніколі і не мела дакументы, што належным чынам пацвярджалі яе статус, альбо яны былі страчаны. Не многа было шансаў на знаходжанне сапраўдных дакументаў і ў архівах розных устаноў, у якіх захоўваліся актавыя кнігі.

У справе доказу сваіх правоў дробнай шляхце актыўна пачалі дапамагаць, як правіла, за грошы такія ж самыя шляхцічы — чыноўнікі устаноў, служачыя кансісторый, якія мелі доступ да актавых і метрычных кніг. Але не абыходзілася без пратэкцыі ўплывовых асоб.

Дзякуючы ўспамінам Эдварда Вайніловіча захаваліся звесткі, якія даюць уяўленне пра тое, чыноўнікі якога ўзроўню былі заангажаваны ў крымінальны бізнес па нелегальнай набілітацыі ў Мінску

ў 50–60-я гг. XIX ст.: «Дваранскія выбары адбываліся ў доме сакратара губернскага старшыні дваранства Гаўсмана, які дзеля гэтага пабудаваў прыгожую камяніцу ў скверы, а сродкі для гэтага ўзяў ад дробнай шляхты, пераважна хадачковай, якую розныя царскія ўказы істотна зачаплялі і якую з-за адсутнасці ў яе дакументаў для доказу дваранства запісвалі ў катэгорыю людзей ападаткаванага саслоўя, што пагражала ім рэкруцкай павіннасцю і іншымі цяжарамі. Таму кожны з іх збіраў апошні грош і ціснуўся ў канцылярыю камісіі, якая займалася справамі доказу дваранства (якая і вырашала справу — *Э. В.*), а Гаўсман заўсёды ўмеў у архівах палазіць альбо прыпісаць да ўжо зацверджаных у дваранстве радоў»[1]. Прыпіска да іншага роду была адным са шляхоў незаконнага замацавання ў расійскім дваранстве. Дзеля гэтага фабрыкаваліся метрычныя выпісы.

Пра Гаўсмана, згадваючы толькі першую літару яго прозвішча, пісаў віленскі архіварыўс Р. Мяніцкі: «Ён з невядомым дагэтуль майстэрствам падрабляў почырк і пячаткі, якіх меў у сябе мноства, а за добрыя грошы браўся за найбольш рызыкоўныя падробкі і ніводзін, нават найбольш складаны подпіс, не бянтэжыў яго, не страшыў — у імгненне вока ён імітаваў любы, нават той, што першы раз

---

1 Woyniłłowicz E. Wspomnienia z lat 1847–1928. Cz.1. Wilno, 1931. S. 52.

бачыў»[2]. Не абмінуў увагай Гаўсмана і яшчэ адзін аўтар успамінаў з XIX ст. Адам Багдановіч, бацька якога служыў кухарам у мінскага дваранскага старшыні Лапы: «В 50-х годах губернский маршалак ... да секретарь дворянства Гаусман немало состряпали дворянских документов, за хорошие деньги, мелкой шляхте, судя по самому красивому зданию в Минске – каменице Гаусмана»[3].

Масавы характар фальсіфікаванняў у 1830–1860-я гг. шчыльным павуціннем аб'яднаў шляхту і мясцовае чыноўніцтва. Прыклады можна прадоўжыць : захаваліся і іншыя ўспаміны сучаснікаў пра масавы характар з'явы фальсіфікацыі дакументаў і заангажаванасць ў гэты працэс мясцовых чыноўнікаў[4].

Трэба сказаць, аднак, што часам здараліся выпадкі, калі фальшыўкі ўсё ж выяўляліся. Такія выпадкі мелі месца, напрыклад, калі праводзілася зверка прадастаўленых у Сенат доказаў на дваранства з актамі Літоўскай метрыкі.

У 1830–1840-я гг. выраблялася і звычайныя падробкі саміх пасведчанняў аб дваранстве. Такія дакументы часам маглі служыць для вызвалення з-пад рэкруцкай службы альбо для ўладкавання

---

[2] Mienicki R. Archiwum Akt Dawnych w Wilnie w okresie od 1795 do 1922 r. S. 40.

[3] Богданович А. Мои воспоминания // Нёман. 1994. № 5, С. 23.

[4] Маркс М. Записки старика // Віцебскі сшытак. 1996. № 2. С. 97.

на грамадзянскую службу. У дадзеным выпадку вельмі рызыкаваў спажывец паслуг, паколькі ён не быў уключаны ў дваранскія спісы і пры самым мінімальным разбіральніцтве яго недваранскае паходжанне лёгка выкрывалася. Таму, такія падробкі служылі для ўладкавання на службу звычайна ў іншай губерні, каб ускладніць магчымае разбіральніцтва. Цывільныя ўлады рэдка іх ініцыявалі. Вайсковыя ўлады былі больш пільныя і ў сумнеўных выпадках часта ініцыявалі разбіральніцтвы, пра што сведчаць аднатыпныя архіўныя дакументы[5].

Цэнтральныя ўлады безумоўна імкнуліся супрацьдзейнічаць фальсіфікацыям, паколькі яны правальвалі палітыку па «разборы шляхты». Камісія, створаная для Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў, падцвердзіла наяўнасць праблемы фальсіфікацыі дакументаў і паведамляла ў Пецярбург міністру юстыцыі І. Лабанаву-Растоўскаму пра заўважаныя «беспарадкі» у метрычных кнігах — «...замечены в оных большие беспорядки, что в некоторых книгах находятся листы вшитые и вклеенные, в строках подчистки, переправки, между строк приписки и по сторонам листов записки метрические; почему комиссия полагает, что и после исполнения

[5] Нацыянальны гістарычны архіў у Гродне (далей — НГАБГ). Ф. 296. Воп. 10. Арк. 411; Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей - НГАБ). Ф. 295. Спр. 275; НГАБ. Ф. 295. Спр. 249.

возложенного на неё поручения могут происходить в означенных книгах подлоги...»[6].

Пасля абмеркавання праблемы міністрамі юстыцыі і ўнутраных спраў, 14 лістапада 1834 г. загадвалася Дваранскім дэпутацкім сходам і Герольдыі «... дабы при производстве и рассмотрении дел о дворянстве они обращали тщательнейшее внимание на все документы...». Рыма-каталіцкім і грэка-каталіцкім кансісторыям і іншым установам, якія выдавалі метрычныя пасведчанні, было загадана не проста іх выдаваць, але «при выдаче метрических выписей вникать в правильность записки метрики», і адзначаць у іх тое, што будзе здавацца падазроным альбо фальшывым у метрычных кнігах[7].

Указам ад 20 красавіка 1834 г., акрамя камісій па праверцы актавых кніг, былі ўтвораны таксама губернскія камісіі для правядзення рэвізіі дзейнасці дваранскіх дэпутацкіх сходаў у імперыі[8].

---

[6] НГАБ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 202. Арк. 16.

[7] Там жа. Арк. 16–17.

[8] Полный свод законов Российской империи (ПСЗ) II. Т. IX. Отд. 1. № 7007. 20 апреля 1834 г. О производстве обревизования действий дворянских депутатских собраний. (Указ, акрамя стварэння камісій. больш дакладна рэгламентаваў дзейнасць дваранскіх дэпутацкіх сходаў па разглядзе вывадовых дыврвнскіх спраў, дакладна ўстанаўліваў, якія дакументы павінны прадастаўляцца і каго маюць права запісваць у радаводныя кнігі дваранскія сходы без разгляду іх спраў у Герольдыі.)

З 1830-х гг. улады вырашылі таксама ўзяцца за праверку актавых і метрычных кніг, паколькі менавіта такія дакументы часта выкарыстоўваліся для фабрыкацыі дваранскіх вывадаў. Эфект быў слабы. Для выпраўлення недахопаў і злоўжыванняў працы першых губернскіх камісій, якія дзейнічалі з 1833 г., у 1842–1852 гг. за справу ўзяліся ўжо новыя. Як адзначалася ў адносінах працы першых камісій, «урад цалкам не дасягнуў той мэты, якую ставіў перад камісіямі, бо былі выяўлены беспарадкі і злоўжыванні, падобныя да папярэдніх»[9].

Дзейнасць камісій атрымала негатыўную ацэнку сучаснікаў і пазнейшых гісторыкаў з-за вялікай шкоды, нанесенай дакументам[10]. Эфект жа іх працы быў нязначны[11]. Акрамя пастаянных камісій арганізоўваліся і часовыя следчыя камісіі для праверкі працы якога-небудзь архіва.

У 1843 г., каб палегчыць працу Дэпартамента Герольдыі Сената, які быў перагружаны дакументамі шляхцічаў, што прысылаліся на канчатковае зацвярджэнне, была ўтворана Віленская цэнтраль-

---

[9] ПСЗ II. Т. XVII. Отд. 2. № 16163. 3 ноября 1842 г. О производстве новой поверки актовых книг в Западных губерниях.

[10] Sikorska-Kulesza J. Deklasacja drobnej szlachty na Litwie i Białorusi w XIX w. Warszawa, 1995. S. 76–77.

[11] Лялин В. А. Виленский центральный архив.... С. 29; Mienicki R. Archiwum Akt Dawnych w Wilnie w okresie od 1795 do 1922 r. S. 40.

ная рэвізійная камісія[12]. Дзейнасць камісіі была пастаўлена пад нагляд генерал-губернатара.

Адным з найбольш распаўсюджаных відаў афіцыйных папер для доказу дваранства былі дакументы, якія пацвярджалі валоданне нерухомай маёмасцю продкамі зацікаўленай асобы. Фальсіфікаванні тут узнікалі часта — фабрыкаваліся паперы нават на валоданне такімі маёнткамі, якіх ніколі не існавала.

Чарговым важным крокам улад, які, па іх задуме, павінен быў калі не спыніць, але значна абмежаваць аб'ём фальсіфікаванняў, была архіўная рэформа ў заходніх губернях імперыі. Указам 1852 г. ствараліся тры цэнтральныя архівы — у Віцебску, Вільні і Кіеве. Утвораныя архівы прынялі на сябе функцыі рэвізійных камісій па праверцы актаў і выяўленні фальшывак.

З моманту адкрыцця цэнтральных архіваў толькі яны мелі права выдаваць выпіскі з актаў. Перадача архівам актавых кніг калі і паўплывала на змяншэнне з'явы фальсіфікавання, аднак не выкараніла яе цалкам. У 1862 г. зноў з'явіліся звесткі пра масавыя фальсіфікаванні ў беларуска-літоўскіх землях. У 1867 г. улады спынілі разгляд

---

[12] ПСЗ II. Т. XVIII. Отд. 1. № 16857. 18 мая 1843 г. О учреждении в г. Вильно Центральной ревизионной комиссии для губерний: Виленской, Минской, Гродненской и Ковенской.

як у дваранскіх сходах, так і ў Герольдыі тых спраў, якія былі заснаваны на дакументах Кіеўскага цэнтральнага архіва ў сувязі з масавымі фальсіфікаваннямі. Была зноў утворана камісія для пераправеркі рашэнняў, прынятых на аснове дакументаў, што былі выдадзены гэтым архівам. Аднак камісія вымушана была прызнаць сваю некампетэнтнасць, бо «не магла вызначыць прыкметаў, паводле якіх можна было б адрозніць сапраўдныя акты XVIII ст. ад падробленых»[13].

Акрамя падробкі актаў і выпісак па-ранейшаму заставаліся таксама такія магчымасці для незаконнай набілітацыі, як прыпіска да зацверджанага ў дваранстве роду[14]. Дзеля гэтага фабрыкавалася метрыка, куды дапісваліся неабходныя звесткі, ці выраблялася падробленая выпіска з метрычнай кнігі.

Фальсіфікаванне дакументаў аб дваранскім паходжанні ў XIX ст. стала пашыранай з'явай і крыніцай узбагачэння людзей, якія мелі доступ да актаў. Колькі было фальшывак, не выкрытых камісіямі, колькі асоб, на падставе падробленых дакументаў было зацверджана ў дваранстве, высветліць зараз практычна немагчыма. Але можна сцвяр-

[13] Самоквасов Д. Я. Архивное дело в России. Кн. 1. Москва, 1902. С. 120.

[14] Woyniłłowicz E. Wspomnienia z lat 1847–1928. Cz.1. Wilno, 1931. S. 52.

джаць, што колькасць такіх людзей была вялізнай. Спыніць фальсіфікаванне дакументаў не ўдалося з-за дзвюх асноўных прычын — заангажаванасці ў гэту справу многіх, нават уплывовых чыноўнікаў, архіварыусаў і членаў рэвізійных і праверачных камісій, а таксама з-за некампетэнтнасці чыноўнікаў у рабоце з дакументамі XVI–XVIII стст.

Грошы маглі адкрыць дарогу да набілітацыі фактычна любой асобе. Амаль палова з 200 тысяч дробнай шляхты, якую ўлады хацелі пазбавіць дваранскіх прывілеяў (дзесьці каля 80 тыс. чалавек у Беларусі), праўдамі ці няпраўдамі ў 30–60-я гг. XIX ст. усё ж здолела «ўціснуцца» ў дваранскае саслоўе. Строгасць і жорсткасць расійскай аўтакратыі ў адносінах да шляхты ў пэўнай ступені змякчалася прадажнасцю і хабарніцтвам чыноўнікаў, якія рэалізоўвалі імперскую палітыку. Па сведчаннях віленскага архіварыуса І. Спрогіса, працэдура падробкі дакументаў каштавала каля 50 руб. срэбрам[15].

Неабходна адзначыць, што палітыка ўлад у адносінах да той дробнай шляхты, якая пазбегла залічэння ў катэгорыі аднадворцаў і грамадзян заходніх губерняў у 1833–1834 гг., рэалізоўвалася ў напрамку адасаблення іх ад памешчыкаў. А вось

[15] Спрогис И. Я. Виленский центральный архив древних актовых книг.Вильна, 1902. С. 8.

памешчыкам якраз неаднаразова даваліся адтэрміноўкі і льготы ў падачы дакументаў.

З-за адсутнасці магчымасцей для хуткага разгляду дакументаў, а таксама шматлікіх злоўжыванняў і падробак дакументаў на мясцовым узроўні, улады вымушаны былі расцягнуць у часе працэдуру разгляду дакументаў дробнай шляхты, якая іх падавала, аж да 1864 г. У гэтым годзе, карыстаючыся ўмовамі панаваўшай пасля паўстання рэакцыі, усе асобы, не зацверджаныя ў дваранстве, былі канчаткова пазбаўлены ўладамі дваранскіх прывілеяў і прыпісаны ў падаткаабкладаемаых катэгорыі. Той, хто хацеў даказаць дваранства, вымушаны быў перш прыпісацца ў падаткаабкладзены стан.

Рашучыя дзеянні ўлад, накіраваныя на канчатковы перавод шляхты, якая не даказала свайго дваранства, у падаткаабкладзеныя катэгорыі, падлягалі рэалізацыі паводле ўказа 23 верасня 1864 г.[16] Але гэта не спыніла працэсу фальсіфікавання дакументаў. Архіўныя матэрыялы сведчаць, што якраз «неправильная выдача дворянских документов с особенным усилием производилась со времени издания в 1864 г. указа Правительствующего Сената от 23 сентября»[17]. Сітуацыя нагадвала 1831 г. Многія шляхцічы, якія не жадалі страчваць

[16] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1904. Арк.. 1–4 адв.

[17] Там жа. Арк. 16.

такую шыкоўную прывілею дваранства, як адсутнасць абавязку ўносіць падушны падатак, служыць у войску, магчымасць уладкоўвацца на дзяржаўную працу, спрабавалі абысці ўзведзеныя перашкоды. Ізноў у гэтай справе паўсюдна ім спрыялі мясцовыя чыноўнікі. Масштабы фальсіфікацый былі значныя. Для многіх гэта быў апошні шанец перасесці ў дваранскі вагон першага класа, які адыходзіў ад апошняй сартавальнай станцыі доўгага падарожжа пад назвай «разбор» шляхты.

У 1867 г. расследаваннем фактаў масавых фальсіфікацый, якія былі вяўлены у Вільні, заняліся спецыяльна прызначаныя для гэтага следчыя[18]. У красавіку 1868 г. толькі што прызначаны віленскім генерал-губернатарам генерал-ад'ютант А. Л. Патапаў, нават не даехаўшы да Вільні, прама з Пецярбурга накіраваў цыркуляр мінскаму губернатару, у якім прапаноўвалася замяніць нядобранадзейных чыноўнікаў, з-за якіх, як указвалася ў дакуменце, узнікалі праблемы з фальсіфікаваннем дваранскіх дакументаў.

У 1868–1869 гг. следчыя па выяўленні метадаў фальсіфікацыі дакументаў і незаконнай набілітацыі ў Віленскай губерні выявілі спосабы і напрамкі такой дзейнасці. Так, Віленскі дваранскі дэпутацкі сход, які хадайнічаў пра зацвярджэнне якога-

[18] Там жа. Арк. 13.

небудзь роду ў дваранстве, сярод асоб прыналежных да гэтага роду, прымаў за жывых такіх людзей, якія ўжо памерлі, а пасля зацвярджэння Сенатам гэтага хадайніцтва, выдаваў на імёны памерлых дваранскія дакументы зусім іншым асобам, напрыклад мяшчанам. Мела месца падмена чалавека. Фотаздымкі на дакументах яшчэ не выкарыстоўваліся. Адначасова было выяўлена, што некаторыя асобы, якія атрымалі падобныя дакументы, былі замешаны ў паўстанні 1863–1864 гг. Набытыя афіцыйныя паперы на іншае прозвішча адначасова служылі ім для прыкрыцця сваёй асобы. Былі і іншыя спосабы фальсіфікавання.

Фабрыкацыя дакументаў ажыццяўлялася таксама ў Віленскай рыма-каталіцкай кансісторыі. Сур'ёзна парушаліся правілы выдачы выпісак з метрык[19]. Былі выяўлены таксама фальсіфікацыі ў Мінскай губерні[20].

Важна адзначыць, што захады, прынятыя ў 1850–1860-я гг., мелі пэўныя пазітыўныя вынікі на змяншэнне масштабаў незаконнай набілітацыі і выкарыстання фальшывых дакументаў, але яны не спынілі фальсіфікаванняў цалкам, якія мелі месца і ў 1870-я гг. З падробленымі дваранскімі дакументамі, напрыклад Мінскага дваранскага дэпутацка-

---

[19] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1904. Арк. 13–16.

[20] Там жа. Арк. 19–19зв.

га сходу, некаторыя асобы спрабавалі ўладкавацца на працу ў аддаленых губернях. Аднак установы, куды такія асобы намагаліся паступаць на працу, альбо атрымаць там вышэйшы класны чын як дваране, дасылалі ў Мінскі дваранскі сход запыты з просьбай паведаміць, ці сапраўды род, з якога паходзіў той ці іншы дваранін, даказаў дваранства. У многіх выпадках аказвалася, што род, з якога паходзіла асоба, паходжанне якой высвятлялася, нават ніколі не даказваў дваранскага паходжання ў Мінскім дваранскім сходзе. Такія архіўныя справы не з'яўляюцца рэдкасцю[21]. Улічваючы аб'ём ранейшых фальсіфікаванняў, не здзівіла б магчымасць выяўлення фабрыкацыі звестак і такіх даведак.

У выніку неабходна адзначыць, што ўключэнне беларуска-літоўскіх зямель у склад Расійскай імперыі і расійская саслоўная палітыка па пазбаўленні дробнай шляхты правоў расійскага дваранства, стала прычынай фальсіфікавання і падробкі дваранскіх дакументаў. Маштабы гэтай з'явы былі надзвычай шырокія. Існаванне попыту на фальшывыя дакументы і падлогі стала прычынай ўзнікнення пашыранага рынку падобных паслуг. У яго дзейнасць былі заангажаваныя мясцовыя чыноўнікі, святары і служыцелі кансісторый, дваранскіх дэпутацкіх сходаў. Яшчэ адной прычынай

[21] НГАБ. Ф. 319. Спр. 524. Арк. 43–44, 124–124зв, 126.

падробкі дваранскіх пасведчанняў стала імкненне часткі падаткаабкладаемага насельніцтва да змены свайго сацыяльна-прававога становішча ва ўмовах яго жорсткай рэгламентацыі ў Расійскай імперыі, імкненне паўпрывілеяваных катэгорый (зямяне, вольныя людзі, панцырныя баяры і інш.) былой Рэчы Паспалітай прыпісацца да расійскага дваранства дзеля захавання сваіх ільгот.

Дзеянні ўлад па супрацьдзеянні фальсіфікацыям доўгія дзесяцігоддзі не прыносілі жаданага плёну, хоць не заўсёды заставаліся цалкам безвыніковымі. Фальсіфікаванні дакументаў сталі прычынай стварэння шматлікіх рэвізійных камісій у 1830–1850 гг., а таксама прычынай правядзення архіўнай рэформы 1852 г. у заходніх губернях імперыі, узмоцненага кантролю за рэалізацыяй кадравай палітыкі ў 1860-я гг. Аднак усе гэтыя захады так і не выкаранілі цалкм з'явы фальсіфікацыі дакументаў аж да 1870-х гг. Неабходна прызнаць, што фальсіфікаванні дваранскіх дакументаў былі значным фактарам, які ўплываў і на фарміраванне саслоўнай і сацыяльнай структуры грамадства беларуска-літоўскіх губерняў. Фальсіфікаванні былі адной з нямногіх магчымасцей для саслоўнай мабільнасці ва ўмовах імперскай рэчаіснасці. Фальсіфікацыі і падлогі былі сродкам для нелегальных заробкаў і ўзбагачэння адных і пазбягання падуш-

нага падатку і рэкруцкай службы для іншых. Паколькі фальсіфікаванне дакументальных доказаў аб дваранскім паходжанні было надзвычай пашыранай з'явай, то асобам, якія сёння заказваюць шляхецкія радаводы ў архіўных установах, неабходна мець на ўвазе, што яны з вельмі вялікай доляй верагоднасці могуць утрымліваць несапраўдныя дадзеныя пра іх продкаў, якія і падраблялі афіцыйныя паперы дзеля зацвярджэння ў расійскім дваранстве.

*Адам Мальдзіс*

## ЗЯМЛЯ КАПЫЛЬСКАЯ — НЕ "ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ ГЛУШЭЧА"!

Як вядома, Эдвард Вайніловіч нарадзіўся ў Сляпянцы, размешчанай каля тагачаснага Мінска (а цяпер у межах сталіцы) шляхецкай сядзібе, дзе скрыжаваліся вядомыя роды яго продкаў — Ваньковічаў і Манюшкаў. Тады, калі яшчэ не склалася сістэма дамоў нараджэння, панавала традыцыя выязджаць на адказны момант прыходу на свет дзіцяці ў дом яго бабулі па маці, а потым вяртацца на месца бацькоўскага жыхарства. Там, у Савічах Слуцкага павета, а цяпер Капыльскага раёна, нястомны рэфарматар гаспадаркі і, маем надзею, наш будучы заступнік на нябёсах спазнаў навакольны свет. Там прайшлі яго дзяцінства і юнацтва, гады звышактыўнай дзейнасці. Так што калі зыходзіць не з энцыклапедычных прынцыпаў, а з рэальнасці, менавіта Савічы належыць лічыць месцам нараджэння Эдварда Вайніловіча як Асобы.

— І як гэты беларускі Сталыпін мог сфарміравацца і дзейнічаць у такой інтэлектуальнай глушэчы! — дзіваваўся адзін мой калега, даве-

даўшыся пра намечаную маю паездку ў Капыль на навукова-практычную канферэнцыю, прысвечаную нашаму знакамітаму суайчынніку. — Капыль жа гэта нешта, прымітыўнае, ад капыла.

— Не згодзен. Ніякі Вайніловіч не беларускі Сталыпін, — пачаў я спрэчку з нечаканым госцем. — Гэта Сталыпін, будучы яшчэ ковенскім віцэ-губернатарам, прыязджаў спецыяльна ў Мінск, каб спасцігнуць рэфарматарства, дарэчы актуальнае і сёння. А потым, ужо ў Пецярбургу, ён, Сталыпін, хацеў Вайніловіча паставіць гаспадаром усерасійскай гаспадаркі. Але наш зямляк не захацеў кідаць Мінскую губерню, вярнуўся з царскай думы на радзіму. Так што хутчэй Сталыпіна можна іменаваць расійскім Вайніловічам... Што ж датычыцца Капыля, то мясцовы паэт Падгорскі-Аколаў рыфмаваў яго не іначай як з грэчаскім акропалем. Калі гаварыць пра пісьменнікаў, паказчыкаў інтэлектуальнага патэнцыялу, то іх нараджалася на Капыльшчыне багата.

— Ведаю. Той жа Кузьма Чорны...

— Цішка Гартны, Кузьма Чорны, Алесь Гурло і добрая дзясятка іншых прыйшлі ў літаратуру крыху пазней, на хвалі «нашаніўскага» Адраджэння. Тады ж, пасля паўстання 1863 г., калі этнонімы-палітонімы «Беларусь» і «Літва» былі забаронены, хто з мясцовых літаратараў кінуўся ў «северорус-

синов», хто ў польскіх «kresowiaków», хто сціпла і неакрэслена стаў называць сябе «тутэйшым». Але заўважце: Эдвард Вайніловіч не стаў ні першым, ні другім, ні трэцім. Ведаючы добра беларускую мову, ён з сялянамі і з суседкай Магдаленай Радзівіл гаварыў па-беларуску, з рускімі — па руску, з палякамі — па-польску, а з замежнікамі па-нямецку і па-французску. А цэнтрам сваёй радзімы ён бачыў і рабіў Міншчыну, несправядліва падзеленую ў 1921 г. Жывучы ў Быдгашчы і ратуючы там ад рэпрэсій суайчыннікаў, ён бачыў яе ў сваіх ўспамінах цэнтрам сваёй айчыны...

Пра канкрэтных жа пісьменнікаў, на сёння ўжо напаўзабытых, якія нарадзіліся і жылі на Капыльшчыне ў часы прабывання там Эдварда Вайніловіча, я гаварыў ужо на канферэнцыі ў цэнтры гэтага заможнага раёна. Вось яны, Асобы, звесткі пра якіх удалося сабраць і цяпер адшукаць у картатэцы, якая назапашвалася дзесяцігоддзямі ў час айчынных і зарубежных навуковых камандзіровак.

**Тшашчкоўская Зоф'я**, польская і беларуская паэтэса і перакладчыца. Нарадзілася 27 лістапада 1847 г. ў вёсцы Дарагавіца цяперашняга Пацейкаўскага сельсавета ў сям'і Адама Манькоўскага (адсюль сціплы псеўданім Адам М-скі). Па матчынай лініі даводзілася сваячкай Уладзіславу Сыракомлі. Вучылася ў Вільні ў прыватным пансіёне Фран-

цішкі Клячкоўскай. Выйшаўшы замуж за афіцэра расійскай арміі Вацлава Тшашчкоўскага, разам з ім удзельнічала ў вайне з Турцыяй 1877–1878 гг. Пасля разам з ім пасялілася ў Ноўгарадзе, аднак не парывала сувязей з радзімай. Яе «Дарагавіцкія песні» прасякнуты патрыятызмам. Падтрымлівала кантакты з беларускім паэтам Янкам Лучынай, перакладала на беларускую мову вершы і песні Марыі Канапніцкай, Тэафіля Ленартовіча і іншых польскіх аўтараў. На польскай жа мове асобнымі кніжкамі выдала паэму «Адзін з многіх» (Кракаў, 1890) і пераклады паэтычных твораў Дж. Байрана, А. Ламарціна, Л. Камоэнса. Пад канец жыцця вярнулася ў Дарагавіцу, дзе і памерла ў 1911 г.

**Падгорскі-Аколаў Леанард**, польскі паэт і літаратуразнавец. Нарадзіўся 21 снежня 1891 г. ў вёсцы Дусаеўшчына цяперашняга Капыльскага сельсавета. Вучыўся ў Львоўскім універсітэце. Увагу Эдварда Вайніловіча звярнуў зборнік патрыятычных вершаў Падгорскага-Аколава «Беларусь», выдадзены ў Вільні ў 1922 г. Потым ён, жывучы ў Варшаве, выдаў два тамы даследаванняў пра літаратурныя мясціны ў Беларусі, звязаныя з жыццём і творчасцю Адама Міцкевіча. Памёр Леанард Падгорскі-Аколаў 4 студзеня 1957 г.

**Даманская Міхаліна** (1875–1936), польская пісьменніца і грамадская дзеячка. Нарадзілася

ў вёсцы Чыжэвічы цяперашняга Доктаравіцкага сельсавета. З Эдвардам Вайніловічам пазнаёмілася ў час яго наведвання мясцовых касцёлаў. З'яўлялася вольнай слухачкай Ягелонскага ўніверсітэта ў Кракаве. У яе аповесцях і абразках апісана быццё мясцовых сялян, у тым ліку праваслаўнага веравызнання. У час Першай сусветнай вайны жыла ў Мінску, працавала ў таварыстве «Асвета». Пасля вайны пражывала ў Варшаве, дзе перакладала на французскую мовы творы Элізы Ажэшка і Генрыка Сянкевіча.

З Капылём і Капыльшчынай звязаны таксама жыццё і творчасць некалькіх пісьменнікаў яўрэйскай нацыянальнасці, якіх не мог не ведаць Эдвард Вайніловіч, каталіцкі адданы вернік і адначасова талерантны да іншых веравызнанняў мысліцель, шчодры донар усіх жыхароў шматаблічнай на канфесіі і веравызнанні Беларусі.

Вось некалькі прадстаўнікоў разнамоўнай літаратуры Квпыльшчыны часоў Эдварда Вайніловіча.

**Мойхер-Сфорым Мендэле** (у сапраўднасці Абрамовіч Шалом Якаў), класік яўрэўскай літаратуры (1836–1917). У сваіх успамінах пісаў пра сябе так: «Месца майго нараджэння – Капыль – знаходзіцца ў Слуцкім павеце Мінскай губерні. Бог не дабраславіў гэтае мястэчка ні багаццем, ні раскошаю, не вызначыў яго для вялікага гандлю,

але затое ён абдараваў гэты край красою прыроды, цудоўнымі лясамі, спакоем і ўтульнасцю, зялёнымі доламі і ўрадлівымі палямі». Першым настаўнікам будучага пісьменніка стаў бацька, капыльскі рабін. У 1850 г. ён памёр, і сям'я далей стала жыць у галечы. Мендэле вучыўся ў цімкавіцкім і слуцкім ешыботах, некаторы час жыў на хутары Мельнікі ў 10 кіламетрах ад Капыля ў айчыма, вучыў яго дзяцей. Там жа напісаў трактат «Ліст пра выхаванне». Потым падарожнічаў, жыў у Вільні, Камянцы Падольскім, Бярдзічаве, напісаў мноства папулярных аповесцей, п'ес, якімі зачытваліся ў Капылі. Асаблівую папулярнасць здабылі яго сатырычная аповесць «Падарожжа Беньяміна Трэцяга» і празаічная аўтабіяграфія «Шлойме, сын Хаіма». Рэха яго смерці ў Адэсе (1917) дайшло да Капыля, дзе захаваліся ў музеі яго матэрыялы.

**Паперна Аўраам Якаў** (1840–1919), яўрэйскі пісьменнік, літаратурны крытык і педагог, пісаў на іўрыце і рускай мове. Нарадзіўся ў Капылі, дзе атрымаў традыцыйную адукацыю. Потым вучыўся ў семінарыях Жытоміра і Вільні. З 1862 г. пачаў друкаваць вершы і артыкулы ў яўрэйскіх перыядычных выданнях. Яго пяру належыць некалькі падручнікаў, кніг аб стане і патрэбах пачатковай яўрэйскай адукацыі ў школах Расійскай імперыі. У 1890-я гады, час актыўнасці Эдварда Вайнілові-

ча, выдаў некалькі зборнікаў вершаў і гістарычных нарысаў. Захапіўшыся расійскай літаратурай, друкаваў пра яе артыкулы ў перыядычным друку.

**Клейнбарт Леў** (1875–1950), рускі крытык і публіцыст. Нарадзіўся і доўгі час жыў у Капылі. Даследаваў падпольныя выданні капыльскай арганізацыі «Самаразвіццё і самаадукацыя». Разглядаў раннюю творчасць Ц. Гартнага і А. Гурло, Н. Чарнышэвіча і Ф. Шантыра. Пакінуў змястоўныя ўспаміны аб рэвалюцыйных падзеях у Капылі. Менавіта Льву Клейнбарту накіраваў рукапіс сваёй першай кнігі паэзіі «Радуніца» Сяргей Ясенін.

А калі вы, шаноўныя слухачы дакладаў канферэнцыі, знойдзеце час пайсці ў Капыльскі краязнаўчы музей, адкрыты ў 1979 г. у памяшканні былой гарбарні, дзе ў часы Эдварда Вайніловіча працаваў Цішка Гартны, то пабачыце там рукапісы твораў, дзённікі і лісты яшчэ такіх не названых мной пісьменнікаў-землякоў, як А. Адамовіч, С. Александровіч, А. і С. Астрэйкі, А. Бабарэка, А. Коршак, С. Міхальчук, І. Ралько, В. Сташэўскі, В. Хведаровіч, Н. Чарнышэвіч. Усё гэта, можна сказаць, творчыя дзеці і ўнукі Эдварда Вайніловіча, творцы Капыльскага, а, шырэй кажучы, Слуцкага і Мінскага краёў, абуджаных Вялікім Рэфарматарам з эканамічнай і духоўнай спячкі. Гэтыя радкі, калі яны выйдуць з друку, я абавязкова пакажу

свайму калегу, які па традыцыі паўтараў словы аб правінцыяльнай інтэлектуальнай глушэчы Капыля і Капыльскага краю.

Праўда, трэба прызнаць, што на гэтым прыстойным фоне ёсць адзін прыкры рэзананс. Гэта — сённяшні стан Савічаў, у свой час інтэлектуальнай сталіцы Капыльшчыны з бібліятэкай каля пяці тысяч тамоў, у тым ліку старажытных (дарэчы, **дзе** яны падзеліся?). Палаца сёння няма і ледзь бачны сляды гістарычных могілак. Будынак трэба аднавіць паводле малюнка з натуры Напалеона Орды. У зале я бачу мінчан, якія канкрэтна могуць заняцца такім аднаўленнем. Дзе знайсці сродкі? Суарганізатарам гэтай канферэнцыі з'яўляецца ўраджэнец Капыльшчыны Аляксандр Каваленя, які цяпер узначальвае ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі аддзяленне гуманітарных навук. Праз яго я перадам у Інстытут гісторыі, які мае права на розныя пошукі, дакументацыю, якая з дапамогай з нябёсаў самога Эдварда Вайніловіча дасць магчымасць знайсці патрэбныя сродкі. Будзем верыць!

*Владимир Путик*

# МИНСКОЕ ОБЩЕСТВО СЕЛЬСКИХ ХОЗЯЕВ КАК ФАКТОР ФОРМИРОВАНИЯ ЭЛЕМЕНТОВ ГРАЖДАНСКОГО ОБЩЕСТВА В СЕВЕРО-ЗАПАДНОМ КРАЕ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ

Самодержавная власть в России в пореформенный период не допускала никаких политических свобод и в то же время вынуждена была мириться с необходимостью предоставления свободы (хотя и не в полном объеме) экономического развития. На этой основе в производственно-экономической сфере возникали различные объединения, целью которых являлось как защита корпоративных интересов хозяев-предпринимателей, так и содействие прогрессу в производственной сфере на основе внедрения достижений науки, техники, передового опыта хозяйствования.

По мере того, как с течением времени внутриполитическое напряжение снизилось, а экономические интересы в условиях развития капитализма вызывали необходимость расширения творческой предпринимательской свободы, власти вынуждены были делать некоторые шаги навстречу обще-

ству. В сельскохозяйственной области этому содействовал аграрный кризис рубежа 70–80-х гг. XIX в., потребовавший и от помещиков, и от властей общими усилиями искать из него выхода.

Помещики видели для себя пути преодоления кризиса в переходе от зернового хозяйства к животноводству, внедрении технических культур, интенсификации сельскохозяйственного производства на основе широкого задействования рыночных капиталистических отношений, достижений агробиологической науки, передовых методов ведения хозяйства.

Первым в крае появилось, созданное в 1876 г. Минское общество сельских хозяев (МОСХ). Инициировал его создание Л. С. Маков, бывший министр внутренних дел, владелец имения в Минской губернии. Инициируя создание обществ сельских хозяев (ОСХ), Л. С. Маков стремился в первую очередь сгруппировать вокруг себя новых хозяев земельных владений в Северо-Западном крае — представителей русского дворянства. Однако как политик с большим опытом, он прекрасно понимал, что для работы во благо края нет иного пути, как изучать и учитывать местную культуру и традиции.

Идея корпоративности, заявленная в уставе, не выдержала испытания временем, и вскоре по-

мещики местного происхождения вливаются в общество. К 1903 г. за два с половиной десятилетия МОСХ выросло с 50–70 до 700 человек. Вместо людей, вступающих в общество только для того, чтобы удовлетворить свое начальство, в организацию приходили те, кто принимал и разделял деятельность общества и принципы чести, труда и правды[1].

Цели и занятия общества, прописанные уставами, декларировали «сближение лиц, занимающихся и интересующихся сельским хозяйством, содействие успехам земледельческой промышленности, облегчение землевладельцам сбыта продуктов сельского хозяйства...». Также предполагалось изыскание выгоднейших способов ведения хозяйства, распространение полезных сведений по сельскому хозяйству, улучшенных машин и орудий, приобретение высокопродуктивных пород скота и т. п.[2]

Поступательное развитие МОСХ, расширение круга рассматриваемых вопросов, относящихся к разным отраслям сельского хозяйства, значи-

---

1 Woyniłłowicz, E. Wspomnienia. 1847—1928. Wilno, 1931. S. 74.

2 Труды Первого областного съезда сельских хозяев в г. Двинске в 1903 г. Витебск, 1904. С. I–III; Устав Минского общества сельского хозяйства. Утв. 20. Авг. 1876 г. Спб., Тип. В. Домакова, 1877; Бацяеў, В. Ф. Грамадскія сельскагаспадарчыя аб'яднанні беларусаў у XIX ст. // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманітар. навук. 2000. № 2. С. 80.

тельное увеличение числа его членов к середине 1890-х гг. создало ситуацию, когда общие собрания не в состоянии были справляться на своих заседаниях с материалами, накопившимися межу сессиями, что потребовало создания специализированных комиссий. Десятки таких временных комиссий и секций, напоминавших общества в миниатюре, приняли постоянный характер. В 1901 г. при обществе уже работали шесть секций.

Старейшей по времени основания являлась винокуренная секция (председатель Е. И. Любаньский). В 1894 г. возникла лесная секция, которой по 1901 г. руководили С. К. Свенцицкий, В. О. Цюндзевицкий, И. С. Гарглинович. В 1895 г. учреждается агрономическая секция под руководством О. Ю. Свиды.

Вскоре по предложению А. А. Торчинского была учреждена секция скотоводства, а затем, согласно проекту Б. Грабовского, секция рабочего коневодства. Обе секции, кроме теоретических разработок по животноводству, посвятили много времени практическим делам: организации и участию в выставках, рынках, созданию родословных книг племенного скота, открытию в Варшаве магазина для сбыта молочных продуктов. В 1900 г. учреждается Полесское отделение МОСХ, собрание членов которого происходило в Пинске.

В 1901 г. Э. Войнилович, подводя итоги двадцатипятилетия МОСХ, отмечал: «Сегодня все кажется ясным и простым, но этих результатов мы добились с большим трудом и вследствие того, что 1) наше Общество никогда не переступало границы своего регламента, не имело и не ставило чуждых ему задач; 2) действовало соответственно своим силам и возможностям; 3) консолидировало свои силы для выполнения принятых решений, процесс децентрализации начался в последнее время, когда общество стало большим и мощным; 4) всегда и везде Общество считало себя представителем помещиков западного края, хранило и преумножало традиции чести и достоинства, доброту этого края»[3].

С 1878 г. общества поступательно трансформируются в социально-политические клубы местных землевладельцев края. При помощи этих общественных организаций помещики значительно усиливали свое влияние на экономическую жизнь Беларуси, что в свою очередь укрепляло их общественно-политические позиции как в крае, так и в империи в целом.

В 90-х гг. XIX — начале XX в. сельскохозяйственные общества принимают активное участие в разрешении проблем социальной сферы: аграр-

---

[3] Woyniłłowicz E. Wspomnienia. 1847—1928. Wilno, 1931. S. 74.

ного законодательства, самоуправления. Так, представители ОСХ в 1891 г. приняли участие в инициированном МВД Особом совещании по вопросу об устранении сервитутов. Губернским по крестьянским делам присутствиям было предложено выработать проекты правил об обязательной замене крестьянских сервитутов. [4]

Тема сервитутов, инициированная в 1891 г. МВД, неоднократно рассматривалась, докладывалась и дебатировалась Обществами сельских хозяев. В МОСХ с 1876 по 1901 гг. по этому вопросу выступили с докладами Э. А. Войнилович «Сервитуты и их разверстание», Я. Лисовский «О сервитутах», И. Массальский «О сервитутах», граф К. Э. Чапский «О сервитутах» (Журналы обществ). Так, для скорейшего разрешения этого вопроса граф К. Э. Чапский в докладе, сделанном на общем собраинии общества 12 декабря 1893 г., предлагал «выяснить: во-первых, размеры существующих ныне сервитутов (границы, количество десятин, число скота и пр.); во-вторых, норму вознаграждения при обязательной разверстке и, в-третьих, наметить организацию и порядок действий тех установлений или органов, на которые будет возложено проведение в исполнение ликвидации сервитутов», избрать

---

[4] Национальный исторический архив Беларуси в Минске (далее — НИАБ). Фонд. 242. Оп. 1. Д. 2485. Л. 1об.

комиссию Общества и просить ее составить проект разверстки к следующему собранию[5]. Постановление общего собрания было выполнено, и уже 6 марта 1894 г. комиссия в составе графа К. Э. Чапского, графа В. С. Татищева, В. К. Масальского, И. И. Кукевича, С. К. Свенцицкого, Б. В. Ратынского, С. И. Богдашевского, и К. М. Гордзялковского предложила свои тезисы для разрешения вопроса. Председатель комиссии В. К. Массальский сделал обстоятельный доклад «О необходимости замены сервитутов соответственным земельным вознаграждением крестьян в размере 1/6–1/8 общего сервитутного пространства». По мнению докладчика: «Разверстание сервитутов явится в Северо-Западном крае существенным дополнением к великой крестьянской реформе. При благоприятных условиях с разверстанием сервитутов можно справиться в 2–3 года. В Минской губернии из общего лесного пространства 1.500.000 д. 3/4 его в 1100 имениях, то есть 1.125.000 д. находятся под сервитутами, и на долю крестьян при разверстании отойдет около 100.000 д.»[6]. Проекты устранения сервитутов, выработанные В. К. Масальским

---

[5] Журнал общего собрания Минского общества сельского хозяйства 12 декабря 1893 года. Минск, 1893. С. 7.

[6] Журнал общего собрания Минского общества сельского хозяйства 6 марта 1894 года. Минск, 1894. С. 8.

и Э. А. Войниловичем, Минским обществом, были предоставлены правительству.

Неоднократно в обществах обсуждалась тема улучшения мелкого крестьянского сельского хозяйства и улучшения быта сельскохозяйственных рабочих, учреждения постоянной врачебной помощи сельскохозяйственным служащим и рабочим. Б. Грабовский в своем докладе отмечал, что отчасти этот проект осуществлялся в Минской губернии, известная группа соседей — помещиков сообща приглашает врача, который периодически объезжает их имения и оказывает больным помощь.[7]

Итоги обсуждения аграрного вопроса в среде крупных землевладельцев белорусских губерний вошли в программу МОСХ. Программа предусматривала улучшение положения сельского хозяйства в ликвидации обособленности крестьян, учреждении всесословной волости, устранении безземелья и малоземелья без нарушения принципа частной собственности, улучшении способов обработки земли, облегчении покупки земли при помощи широкого народного кредита, упорядочении землевладения и землепользования, ликвида-

---

[7] Грабовский Б. С. Краткий очерк двадцатипятилетней деятельности Минского общества сельских хозяев, состоящего под августейшим покровительством великого князя Владимира Александровича. Минск, 1901. С. 9.

ции коллективного землевладения, выкупных платежей, росте грамотности крестьян.[8]

В качестве принципиального средства решения аграрного вопроса предлагалось «введение самого широкого местного самоуправления», законодательное установление частной земельной собственности, воспитание гражданского общества и, в первую очередь, среди крестьян объяснения понятия права собственности.[9] Предвыборная борьба и деятельность Государственной думы подняли социальные вопросы на новую ступень, что отдаленно стало напоминать республиканские традиции ВКЛ.

Детально роль государства показали и популяризировали в своих трудах историки так называемой государственной школы (С. М. Соловьев, Б. Н. Чичерин, К. Д. Кавелин). Главным их тезисом была мысль не просто о руководящей, но и прогрессивной роли государства в русской истории, в отличие от истории западной, в которой основным движущим фактором была общественная инициатива, борьба общества с государством как источник прогресса.

---

8 Журнал общего собрания Минского общества сельского хозяйства 25—26 сентября 1905 года. Минск, 1905. С. 20–31.

9 Свенцицкий, Г. И. Аграрный вопрос. Доклад Г. И. Свенцицкого Минскому сельскохозяйственному Обществу 5 марта 1906 г.: пер. с польск. Санкт-Петербург, 1906. С. 63–70.

В. О. Ключевский развенчал этот миф, показав, что динамика российской истории укладывается в другую формулу, которую он же и дал — «государство усиливалось, а народ хирел». В полном объеме специфику развития российской истории обозначил американский историк Р. Пайпс в исследовании «Россия при старом режиме». Он объясняет, что политическое бессилие русской буржуазии исходило, прежде всего, из выработанного многовековым опытом убеждения, что путь к богатству в России лежит не через борьбу с властями, а через сотрудничество с ними, и содействовало развитию и укреплению тоталитарных тенденций[10].

Р. Пайпс утверждал, что в отсутствие самостоятельных, юридически определенных, политически организованных и экономически мощных классов государственная власть делается опасной и непредсказуемо произвольной силой. В целях своего собственного выживания власть может разыгрывать какую угодно, даже и патерналистскую карту, но это не меняет ее потенциально тоталитарной природы, если она не ограничена общественными силами. Ученый считает, что прообраз тоталитарного государства, каким стал СССР, был заложен

---

[10] Пайпс Р. Россия при старом режиме. М., 1993. С. 290.

в России во время царствования Александра III с его политикой чрезвычайной охраны.

Однако отметим, что царская Россия не являлась стопроцентным полицейским государством. Были и противовесы, среди которых наиболее важным был институт частной собственности, предпринимательство[11], что традиционно культивировалось в землях бывшего Великого княжества Литовского (ВКЛ). Благодаря частной собственности по всей территории империи создались уголки, куда полиция была бессильна ступить, поскольку законы, бесцеремонно попиравшие права личности, строго охраняли право собственности.

Вот здесь и была перспектива российской истории. Важно отметить, что эту перспективу развивали, укрепляли, всячески содействовали ее росту сельскохозяйственные общества.

В белорусском крае политизация деятельности сельскохозяйственных обществ осуществлялась в большей степени, чем в центральных российских губерниях. Это связано связи с его историческими особенностями, которые характеризовались с преобладанием здесь польского элемента в дворянской среде, а также более высоком уровнем развития капитализма в сельском хозяйстве.

---

[11] Пайпс Р. Россия при старом режиме. М., 1993. С. 409.

Таким образом, постепенно, но неуклонно в самодержавной России еще накануне революции 1905–1907 гг. осуществлялось формирование элементов гражданского общества. Беларусь в этом плане была одним из наиболее активных регионов империи.

*Алена Сакольчык*

# СЛУЦК І ГІМНАЗІЧНЫЯ ГАДЫ Э. ВАЙНІЛОВІЧА Ў ПЕРЫЯД ПАЎСТАННЯ 1863–1864 гг.

Так склалася, што жыццёвы шлях Эдварда Вайніловіча знаходзіўся на скрыжаванні стагоддзяў, а таму яму ўдалося быць сведкам многіх знакавых падзей у гісторыі беларускага краю. Адной з першых палітычных падзей, якая пакінула след у яго памяці, было паўстанне 1863–1864 гг. І хоць яму адведзена нязначнае месца ў аўтарскіх успамінах, але карціна атрымалася выразная і яркая.

У 1863–1864 гг. Эдвард Вайніловіч якраз навучаўся ў Слуцкай гімназіі. Па яго ўспамінах, у горадзе і павеце: «Струны общественной жизни были наиболее чувствительными на все отголоски, доносившиеся из Варшавы и доходившие до нашей провинции. Женщины и молодежь руководили если не внутренней организацией, то, во всяком случае, демонстрировали внешние требования (притязания) народа. И нет ничего удивительного в том, что гимназистская молодежь, в то время в большинстве поляки *(дакладней сказаць, рыма-*

*каталікі — А. С.),* более 300 учеников, часто оставляла свои прямые обязанности для участия в демонстрациях как в костеле, так и за его пределами. Например, демонстративно тянули телегу с прелатом Бялобжеским[1] через весь город, перед тем, как его должны были вывезти из Варшавы вглубь России. Директор гимназии, россиянин Лубкин, вынужден был смотреть на все это сквозь пальцы, коль сами учителя подавали сигналы к действию. Поэтому не каждый из нас всегда знал урок, но носил заколку с белым орлом в галстуке и запонки к рубашкам с портретом Костюшко, Замойского[2], Кроненберга[3], Испанского[4]. Ночами мы читали "Стражницу" и из старых напильников, пилочек для ногтей, делали кинжалы или пики...»[5].

---

[1] Прэлат Бялабжэскі/Бялабржэскі (Bialobrzeski) — часовы адміністратар Варшаўскага архіепіскапства. Выступіў супраць уварвання расійскіх войскаў у варшаўскія храмы ў сувязі з правядзеннем паніхід па Т. Касцюшку са спяваннем патрыятычных гімнаў, загадаў 3 кастрычніка 1861 г. закрыць усе касцёлы і спыніць богаслужэнні. У выніку быў арыштаваны за антыўрадавую дзейнасць, прыгавораны да смяротнага пакарання, але атрымаў памілаванне ў выглядзе турэмнага заключэння ў Бабруйскую крэпасць на 1 год.

[2] Андрэй Замойскі (1716–1792) — знакавая палітычная персона Рэчы Паспалітай, ініцыятар рэформ па змяншэнні саслоўнай розніцы.

[3] Леапольд Кроненберг (1812–1878) — грамадскі дзеяч, заснавальнік Варшаўскага банкірскага дома.

[4] Дакладных звестак, на жаль, не выяўлена.

[5] Войнилович Э. Воспоминания. Минск, 2007. С. 40–41.

Сапраўды, калі звярнуцца да архіўных дакументаў, то першапачатковую хвалю пратэстнай актыўнасці ў Слуцку паднялі менавіта гімназісты. Ад прадстаўнікоў урадавых колаў зыходзіла шмат паведамленняў аб тым, што вучні 7-га класа амаль усе звольніліся без бачных для таго падстаў. Дырэктару гімназіі паліцэйскія чыны ўвесь час даводзілі да ведама аб падазрэнні яго падапечных у захоўванні зброі. Неаднаразова паўтараліся выпадкі пратэсту вучняў старшых класаў супраць канкрэтнага выкладчыка. Так, 6-ы і 7-ы класы са свістам, шыканнем і іншым шумам сустракалі настаўніка французскай мовы Гранкевіча, патрабавалі яго адстаўкі. Чым настаўнік быў недаспадобы мясцоваму вучнёўству ўстанавіць не ўдалося, але сам факт падобных паводзінаў сведчыў пра іх настрой і адносіны да існуючай сітуацыі. Аналізуючы дзейнасць гімназістаў, Слуцкі гараднічы ў сакавіку 1863 г. рэзюмаваў: «Поступок учеников, как я заключаю, ничто иное как предлог к оставлению учения и немудрено, что от подстрекательства прибывших сюда в продолжении последних дней из Киевского университета и других учебных заведений студентов»[6]. Аўтар выказвання меў на ўвазе уплыў на мясцовую моладзь выключаных

---

[6] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (далей — НГАБ). Фонд 295. Воп. 1. Спр. 1525. Арк. 37.

за антыўрадавую і маніфестацыйную дзейнасць з вышэйшых навучальных устаноў (Пецярбург, Варшава, Кіеў і інш.) студэнтаў, якія вярнуліся на Радзіму ў беларуска-літоўскія губерні.

Сярод найбольш важкіх матываў самавольных зыходаў з установы Слуцкая адміністрацыя бачыла ў далучэнні да паўстанцкіх атрадаў. І яна мела пэўную рацыю, бо такія выпадкі мелі месца. Напрыклад, вучань Слуцкай гімназіі Уладзіслаў Сліжневіч (19 гадоў) і Мінскай – Эдуард Рылевіч (13 гадоў) былі арыштаваны казакамі пасля бою 9 мая 1863 г. у в. Юравічы (Ігуменшчына). Першы нават меў раненне ў нагу. На допытах яны паказалі, што добраахвотна далучыліся да атрада Ігнацыя Собэка (Станіслава Ляскоўскага). Атрад з'яўляўся пададдзелам атрада Баляслава Свентаржэцкага (памешчык з Ігуменскага павета), якога прызначыў Варшаўскі камітэт ваенным начальнікам Мінскага ваяводства. У гэты ж атрад уваходзіла аддзяленне са Случчыны пад кіраўніцтвам настаўніка Слуцкай гімназіі Л. Дамброўскага. Прычыну далучэння да паўстання У. Сліжневіч растлумачыў так: «Вооружился для освобождения Польши и Литвы от Русского Правительства»[7]. Э. Рылевіч сказаў, што паслухаўся распараджэння Варшаўскага Цэн-

[7] НГАБ. Фонд 296. Воп. 1. Спр. 33. Арк. 8.

тральнага камітэта, атрыманае ад гарадскога канцылярыста Сушчэвіча. У выніку, першага паўстанца залічылі да 2-й катэгорыі палітычных злачынцаў з высылкай у менш аддаленыя месцы Сібіры з канфіскацыяй маёмасці, другога — да 3-й катэгорыі з аддачай на парукі бацькам і выплатай штрафу. Падобныя выпадкі хутчэй з'яўляліся заканамернасцю, чым выключэннем з правілаў.

На другім месцы па нядобранадзейнасці на Случчыне, ва ўяўленнях гарадской адміністрацыі, былі жанчыны. Нават Э. Вайніловіч адзначыў жаночы патрыятызм: «Жанчыны як больш ўспрымальныя і гарачыя патрыёткі ва ўсіх дэманстрацыях ішлі наперадзе і клікалі за сабой»[8]. Параўноўваючы падзеі 1863–1864 гг. з Першай сусветнай вайной Вайніловіч сцвярджаў: «Калі ў катаклізмах падзей 1914–1918 гг. жанчыны і моладзь амаль не прымалі ўдзелу, то ў 1861–1863 гг. іх роля была пераважнай»[9]. Найбольш актыўна жаночая частка Случчыны праявіла сябе ў маніфестацыйных акцыях (спяванні патрыятычных гімнаў, нашэнні жалобных убораў і інш.) і агітацыі. Архіўныя дакументы ўтрымліваюць даволі шмат таму пацвярджэнняў. Вось адна з тыповых замалёвак. Неяк радавы 20-й роты Арлоўскага рэ-

---

[8] Войнилович Э. Воспоминания. Минск, 2007. С. 41.

[9] Войнилович Э. Воспоминания. Минск, 2007. С. 40.

зервовага пяхотнага палка Дзяніс Конус з’яўвіўся да камандуючага з данясеннем на дачок Слуцкага павятовага казначэя Расудоўскага. Сустрэўшы яго выпадкова ў горадзе, адна з іх запыталася адкуль ён родам і даведаўшыся, што з Царства Польскага, цікавілася ці шмат палякаў у роце, а пасля сказала яму: «Бери свое ружье беги в лес к своим братьям». Калі радавы адмовіўся, бо не хацеў ісці супраць прысягі, то ў размову ўмяшалася другая дачка Расудоўскага, і сказала «что он даст ответ перед Богом, что не дал помощи своим собратьям, которых имеется в лесу довольно много»[10].

Трэцяе месца па ўзроўні «вредности в политическом отношении» займалі каталіцкія святары. Для такіх заключэнняў у кіраўніцкіх органаў былі свае падставы. Так, асабліва адметнымі ў Слуцкай следчай камісіі з’яўляліся дзве справы ў адносінах да ксяндзоў Слуцкага касцёла. Абставіны першай, дзе на лаве падсудных знаходзіўся ксёндз Андрэй Барташэвіч, заключаліся ў наступным. 1 студзеня 1864 г. у Слуцкі касцёл прыехаў манах дамініканскага ордэна Іпаліт Забароўскі. Ён выступіў з пропаведдзю, «поучающей повиноваться властям, не поддаваться научениям революционеров, губящим легкомысленный народ»[11]. У час пропаведзі

[10] НГАБ. Фонд 295. Воп. 1. Спр. 1592. Арк. 11.
[11] НГАБ. Фонд 296. Воп. 1. Спр. 93. Арк. 9.

ксёндз Барташэвіч спрабаваўся яго спыніць, спачатку пасылаў на кафедру гімназіста Мадзалеўскага з просьбай скончыць прамову. Пасля сам не вытрываў і з алтра заявіў: «Прошу кончить уже не рано». Скаргі манаха не засталіся без наступстваў. У Барташэвіча правялі вобыск і склалі спіс знойдзеных антыўрадавых папер: «Воззвание народного жонда к Католическому духовенству в Литве, один номер возмутительной газеты «Рух», брошюра под заглавием «Набожная песня», извращенная родословная Российских Монархов, предание о мученичестве Базылианок к полякам»[12]. Свае паводзіны ксёндз апраўдываў тым, што ў пропаведзі «заключались выражения, порицающие слушателей и возбудившие в них насмешку к проповедчику <...> вследсвие чего некоторые из прихожан оставили костел»[13]. Але гэта ксяндза не выратавала і яму прысудзілі 2-ю катэгорую палітычнага злачынства з пазбаўленнем духоўнага сану, канфіскацыяй маёмасці і 6-цігадовай высылкай на катаргу.

Ксяндза Слуцкага касцёла Гарбачэўскага выслалі пад строгі нагляд у аддаленыя раёны Сібіры за антыўрадавыя думкі і звесткі, якія былі выяўлены ў яго лістах. У адным з іх быў змешчаны выраз: «Nastalo zmartwychwstanie tej, której Imie nie wolno

[12] НГАБ. Фонд 296. Воп. 1. Спр. 93. Арк. 10.
[13] НГАБ. Фонд 296. Воп. 1. Спр. 93. Арк. 10.

mi tu wyrazić (*настала ўваскрашэнне той, чыё імя я не магу выказаць тут – А.С.*)»[14]. Па заключэнні судовых «экспертаў»: «Эта фраза как писанная пред возстанием явно выражает, что речь идет о Политическом воскрешении Польши»[15]. Хоць пазней самі следчыя па гэтай справе прызнавалі, што ў ліставанні ксяндза Гарбачэўскага няма нічога датычнага да паўстання, але прысуд вынеслі даволі строгі.

Пад асаблівым наглядам у мясцовых улад таксама знаходзіліся памешчыкі, дваране і іншыя жыхары рымска-каталіцкага веравызнання. Яны былі заўважаны ў зборах, раз'ездах і агітацыі (памешчык Іван Дыбоўскі), нашэнні польскіх касцюмаў з шырокім паскам і канфедэратках (ляснічы Скарына)[16], супрацьдзеянні падпісанню вернападданіцкага адраса на імя імператара (памешчык Уладзіслаў Вендорф)[17] і г. д.

Як відаць, Случчына была ахоплена антыўрадавымі настроямі, змаганне з якімі было ўскладзена на камандзіра 33-а Данскога палка Астахава. У Слуцкі павет было накіравана каля двух сотняў казакоў, у той час як напрыклад у Навагрудскі па-

---

14 НГАБ. Фонд 296. Воп. 1. Спр. 1619. Арк. 33.

15 НГАБ. Фонд 296. Воп. 1. Спр. 1619. Арк. 33.

16 НГАБ. Фонд 295. Воп. 1. Спр. 1571. Арк. 1.

17 НГАБ. Фонд 296. Воп. 1. Спр. 1619. Арк. 33.

вет было выслана толькі 96 казакоў, Рэчыцкі — 55, Бабруйскі — 52[18].

Што тычыцца непасрэдна ваенных дзеянняў на Случчыне, то іх фактычна не было. Акрамя невялікага сутыкнення каля вёскі Макрань 26 чэрвеня 1863 г. часткі атрада Людвіка Нарбута і 80-і казакаў палкоўніка Кека. Страты з абодвух бакоў невядомы. Аднак у паўстанчага кіраўніцтва існавалі планы на ўзняцце паўстання ў Слуцкім павеце. Адказнасць за гэта ўскладалася на Уладзіслава Машэўскага. Ён меў вопыт ваеннай службы ў артылерыі, у адстаўку выйшаў у чыне штабс-капітана. Да паўстання жыў у Слуцкім павеце, дзе арандаваў зямлю ў уладальніка маёнткаў Кругавічы і Навадворцы каля Клецка памешчыка Напалеона Абуховіча. Напярэдадні выступлення слуцкім павятовым начальнікам прызначаўся памешчык Ежы-Павел Магільніцкі. На яго ўскладваліся абавязкі па арганізацыі ўсіх падрыхтоўчых мерапрыемстваў (правядзенне агітацыі, збор сродкаў, нарыхтоўка зброі і г. д.), але дакладных звестак пра яго дзейнасць на гэтай пасадзе не выяўлена. Ежы з’яўляўся мужам роднай сястры Эдварда Вайніловіча — Габрыэлі. За ўдзел у паўстанні канфіскавалі маёнтак Філіповічы Слуцкага павета і саслалі ў Сібір. Актыўнасць случчан заўважалі і ўлады.

[18] НГАБ. Фонд 296. Воп. 1. Спр. 148. Арк. 3.

Вясной 1863 г. М. Мураўёў паведамляў Часоваму Мінскаму ваеннаму губернатару Заблоцкаму: «Из заграницы получено частным образом сведения, что на Литве есть много помещиков, которые, владея обширными поместьями, будут служить центром влияния польской народности и управлять мелко-поместными помещиками, и что в Слуцке и Пинске уже проведена организация»[19].

Канчаткова мясцовы атрад быў сфарміраваны 19 красавіка 1863 г. Ён пачаў свае дзеянні паводле традыцыйнай для паўстання 1863–1864 гг. схемы: ссек 5 тэлеграфных слупоў за 10 вёрст ад паштовай станцыі Сіняўка і парваў дрот, у маёнтку князя Леана Радзівіла, дзе, узламаўшы акно, забраў 40 паляўнічых стрэльбаў, некалькі кінжалаў і скрыню пораху. Атрад удзельнічаў у адным ваенным сутыкненні на тэрыторыі Ігуменскага павета. Прайшоўшы мяжу Слуцкага павета атрад спыніўся на адпачынак каля вёскі Азярцы (сёння — вёска Азярцы Гацукоўскага сельскага савета Слуцкага раёна Мінскай вобласці). Па данясенні сялянскіх вартавых, 21 красавіка паўстанцы былі атакаваны расійскім атрадам у складзе 50-ці чалавек пяхоты і 20-ці казакоў Данскога казацкага палка пад камандаваннем падпалкоўніка Драгапулы. Па афіцыйных звестках, страты мяцежнікаў склалі 3 забітымі на

---

[19] НГАБ. Фонд 1521. Воп. 1. Спр. 6. Арк. 54.

месцы, параненымі 14 і ўзятымі ў палон 31 чалавекам. З боку расійскіх войскаў — забіты 1 казак, цяжка паранены 1 гарніст, які памёр на наступны дзень[20].

Па спісе асоб у 58 чалавек, што знаходзіліся ў Слуцкай следчай камісіі на красавік 1863 г., пераважную частку складала моладзь. Узрост падследных вагаўся ад 17 да 28 гадоў. Самаму старэйшаму ўдзельніку было 56 гадоў. Паводле сацыяльнага складу пераважалі дваране[21].

Увогуле, па ведамасці аб секвестраванай і канфіскаванай маёмасці ўдзельнікаў паўстання па Мінскай губерні на перыяд 22 чэрвеня 1864 г. — 27 мая 1865 г., па Слуцкім павеце ўлічана 50 асоб з агульнай колькасцю ў 789 чалавек[22].

У 1864 г. паўстанне афіцыйна было падаўлена. Але яго адгалоскі адчуваліся яшчэ доўга. Так, у 1865 г. у вышэйшыя інстанцыі паступалі заявы панічнага характару: «Помещики Минской губернии и уездов: Минского — Горват, Ванькович, Абланович и Мащевский; Игуменского — Янушевский; Слуцкого — Вендорф, Ковалевский и Миха-

[20] Матвейчык Д. Ч. Уладзіслаў Машэўскі і спроба ўзброенага выступлення ў Слуцкім павеце ў 1863 г. // Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Беларусі, Літве і Украіне: гісторыя і памяць: зб. навук. арт. Мінск, 2014. С. 79–92.

[21] НГАБ. Фонд 1525. Воп. 1. Спр. 2. Арк. 1–10.

[22] НГАБ. Фонд 299. Воп. 2. Спр. 6062. Арк. 3–101.

ил Боркозович с сыновьями его, коего сын и дочь суждены в каторжные работы за сильное содействие их в мятеже, и Борисовского — Тышкевич, стараются всеми силами, возможностями, деньгами и запасами истреблять народ пожарами по Минской и другим губерниям и другими средствами, для возобновления потухшего мятежа, нанимают на сей предмет лиц, возмущают шляхту и действуют так сильно, что не можем вообразить Вам»[23].

Такім чынам, Случчына ў 1863–1864 гг. была адным з цэнтраў паўстання ў Беларусі і Літве. Атмасфера, што панавала сярод жыхароў, іх спробы прадэманстраваць сваю грамадзянскую пазіцыю на тым ці іншым баку проста не маглі не паўплываць на станаўленне жыццёвых прынцыпаў і пазіцый маладога Э. Вайніловіча.

---

[23] НГАБ. Фонд 295. Воп. 1. Спр. 1775. Арк. 1–1 об.

*Святлана Талмачова*

# ДЗЕЙНАСЦЬ МІНСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЗЕМСТВА ПА АКАЗАННІ АГРАНАМІЧНАЙ ДАПАМОГІ НАСЕЛЬНІЦТВУ

Земская рэформа рэалізоўвалася ў Расійскай імперыі з 1864 г. Аднак у сувязі з паўстаннем 1863–1864 гг. распаўсюджанне яе на тэрыторыю Беларусі адтэрміноўвалася, а пытанне аб увядзенні рэформы ў краі неаднаразова паўставала перад урадам у наступныя дзесяцігоддзі[1]. У выніку ў 1903 г. у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях было ўведзена «Палажэнне аб кіраванні земскай гаспадаркай»[2]. У адпаведнасці з ім пад кантролем міністра ўнутраных спраў ствараліся губернскія і павятовыя ўправы па справах земскай гаспадаркі. Кампетэнцыя ў новых органаў была такая ж, што і ў земстваў. Але істотнае адрозненне ўстаноў па справах земскай гаспадаркі заключалася ў тым, што тут замест выбарнага губернскіх і павятовых

---

1 Больш падрабязна гл.: Талмачова С. А. Праблема правядзення земскай рэформы ў беларуска-літоўскіх губернях (1859–1903 гг.) // Весці БДПУ. Сер. 2. 2010. № 1. С. 3–7.

2 ПСЗРИ. Собр. 3-е. Т. 23 (1903). № 22757.

земскіх сходаў і адпаведных упраў губернскія і павятовыя камітэты (распарадчыя органы) і земскія ўправы (выканаўчыя органы) ствараліся на падставе не выбараў, як у земскіх губернях, а прызначэння іх асабовага саставу.

1 чэрвеня 1903 г. у Мінск прыехаў міністр унутраных спраў В. К. Плеве. Ён выступіў у будынку губернскага праўлення перад прадстаўнікамі розных устаноў, у тым ліку і прэзідыумам савета Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі. Зразумела, Э. Вайніловіч таксама прысутнічаў на гэтай сустрэчы ў якасці старшыні Таварыства. Пасля ўрачыстага пасяджэння, у час прыватнай гутаркі з членамі Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, В. К. Плеве азнаёміў іх з планамі ўрада ўвесці ў Мінскай губерні земскае самакіраванне, але на спецыяльных умовах. Э. Вайніловіч успамінаў: «Он (В. К.Плеве. – *С.Т.*) при этом поинтересовался, пожелают ли местные землевладельцы участвовать в этих институтах. Я ответил, что все “исключительные права” мы рассматриваем как унижающие наших землевладельцев, которые всегда охотно отзываются на любое приглашение правительства и всегда добросовестно выполняют свои обязанности, не давая, таким образом, никаких оснований для недоверия. В связи с этим мы требуем уравнивания нас в правах с землевладель-

цами внутренних губерний России. Но, поскольку мы руководствуемся принципами участия в любой деятельности, связанной с нашим краем, заявляем, что будем принимать участие во вновь создаваемых институтах»[3].

У сваіх успамінах Э. Вайніловіч так характарызаваў гэты перыяд дзейнасці Мінскага губернскага камітэта па справах земскай гаспадаркі, у склад якога ён уваходзіў: «Нельзя сказать, что этот постепенный переход от управления "губернского распорядительного комитета" к земскому, даже в рамках закона 1903 г., был для нас бесполезным. Мы, лишенные возможности в течение ряда лет принимать участие в экономической и культурной жизни Края, на первых заседаниях чувствовали себя слепыми котятами. Но постепенно начали ориентироваться, "брать быка за рога" и, несмотря на то что количество оглядывающихся на мнение председательствующего губернатора было преобладающим, силой аргументации и неоспоримым стремлением к цели, далеко не второстепенным, а ради блага общества, мы заслужили себе авторитет и в основном свои идеи претворяли в жизнь»[4].

Аднак да 1910 г. дзейнасць Губернскага камітэта, які павінны быў займацца мерапрыемствамі

[3] Войнилович Э. Воспоминания. Минск, 2007. С. 115.
[4] Войнилович Э. Воспоминания Минск, 2007. С. 115–116.

па садзейнічанні эканамічнаму дабрабыту насельніцтва, абмяжоўвалася толькі захадамі па паляпшэнні мясцовай конегадоўлі. Гэта адлюстроўвалася ў выдаткаванні неабходных сум на ўтрыманне конскіх злучных пунктаў у губерні і на выдачу ўзнагарод сялянам, якія прывозілі коней на штогадовую выставу ў Навагрудку[5].

У сувязі з перавагай у краі «польскай» інтэлігенцыі і землеўладання ўрад баяўся даць ім поўныя правы, якімі карысталіся земствы ў іншых губернях імперыі. Нарэшце, 14 сакавіка 1911 г. Мікалай II падпісаў так званы закон аб заходнім земстве — аб распаўсюджанні дзеяння Палажэння аб земскіх установах на Віцебскую, Валынскую, Кіеўскую, Мінскую, Магілёўскую і Падольскую губерні[6]. У выніку ў трох беларускіх губернях уводзіліся земствы па ўзоры 1890 г., але з пэўнымі зменамі і дапаўненнямі.

Выбарныя земствы ўводзіліся толькі ў тых губернях, дзе з 1903 г. дзейнічала «Палажэнне аб земскай гаспадарцы». Урад імкнуўся на падставе гэтага закону «забяспечыць у земскім кіраванні слушныя інтарэсы рускага насельніцтва, у адпаведнасці з <...> належным [яму] першасным у гэтым краі значэннем». З гэтай прычыны адмяняліся выбары

---

5 Вестник Минского губернского земства. 1914. № 3–4. С. 83.

6 ПСЗРИ. Собр. 3-е. Т. 31 (1911). № 34903.

па саслоўях, у адрозненне ад цэнтральных губерняў Расіі, дзе дзейнічалі земскія ўстановы на аснове Палажэння 1890 г. Земствы, такім чынам, сталі бессаслоўнымі. Замест саслоўных курый (дваранскай і сялянскай) уводзіліся дзве нацыянальныя курыі — «польская» і «руская» (у апошнюю ўключаліся ўсе, акрамя палякаў і яўрэяў)[7].

Мясцовае дваранства і, у прыватнасці, Э. Вайніловіч так ставілася да гэтага закона: «И как это не раз случалось, зло оборачивалось добром. Польские землевладельцы получили постоянное количественное превосходство в земствах, хотя и урезанное тенденциозной статистикой, но, во всяком случае, зависящее только от своих выборов, в то время как российские землевладельцы стали зависимы от выборов крестьянской курии. ... В самом деле, ликвидация в законе от 14 марта отдельной польской курии могла бы нас отстранить от участия в земских правах»[8].

Такім чынам, Э. Вайніловіч лічыў неабходным выкарыстоўваць усякую магчымасць для таго, каб прынесці карысць роднай зямлі. Як вопытны грамадскі дзеяч і старшыня Мінскага таварыства

---

7 Больш падрабязна гл.: Талмачова С. А. Распаўсюджанне земскай рэформы ў заходніх губернях Расійскай імперыі (1903–1911 гг.) // Весці БДПУ. Сер. 2. 2010. № 4. С. 20–24.

8 Войнилович Э. Воспоминания. Минск, 2007. С. 117.

сельскай гаспадаркі ён уносіў шмат прапаноў па паляпшэнні развіцця краю, культуры земляробства і пашырэння сельскагаспадарчых ведаў. Зразумела, што большасць свайго часу і сіл ён прысвячаў менавіта дзейнасці Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, але ў гэтым жа рэчышчы і пры яго натхненні развівалася і земская гаспадарка губерні. Пры гэтым Э. Вайніловіч быў абраны ў якасці галоснага ад Слуцкага павета ў склад Мінскага губернскага земства, а таксама галосным Слуцкага павятовага земства.

Агранамічную дапамогу насельніцтву ў Мінскай губерні аказвалі розныя арганізацыі. Першым па часе ўзнікнення (1876 г.) было ўжо ўзгаданае Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі. Яно аб'ядноўвала прадстаўнікоў мясцовых землеўладальнікаў. Пры вырашэнні задачы саслоўнага значэння Таварыства адыграла значную ролю ў аказанні агранамічнай дапамогі насельніцтву ў цэлым і паўплывала сваім прыкладам і вопытам у больш позні перыяд на дзейнасць земстваў у гэтым кірунку.

Спачатку Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі арыентавалася на рэалізацыю інтарэсаў сваіх членаў — буйных землеўладальнікаў. Але з цягам часу сфера яго дзейнасці распаўсюджвалася на больш шырокія пласты насельніцтва. Так, у пачатку XX ст. Таварыства ладзіла першыя дробна-раённыя

выставы з удзелам сялян, на якіх дэманстраваліся дасягненні іх гаспадарак: у г. Пінску ў 1904 і 1910 гг., у м. Любешаве і м. Лунінцы Пінскага павета у 1907 г., у Слуцку у 1908 г. і інш.[9]. Пры гэтым Мінскі губернскі камітэт таксама выдаткоўваў пэўныя сродкі на ўзнагароды ўдзельнікам мерапрыемстваў.

Акрамя выстаў мясцовыя аддзяленні Таварыства вялі працу па распаўсюджанні сельскагаспадарчых ведаў іншымі шляхамі. Так, Слуцкае аддзяленне ў 1906 г. пачало прымаць у склад членаў Таварыства сялян (з платай у 1 руб.). Для іх арганізоўваліся сходы з чытаннем рэфератаў на тэмы паляпшэння сялянскай гаспадаркі (даклады Ю. Булгака «Аб прымяненні лубіну ў сялянскіх гаспадарках»; даклад сяляніна Круковіча «Аб карысці хутарской гаспадаркі і шкодзе цераспалосіцы» і інш.). Аднрачасова былі праведзены іспыты сельскагаспадарчых прылад (плугоў і барон) у маёнтку «Івань» Слуцкага павета. Вынікам стала павелічэнне попыту на палепшаны інвентар, у прыватнасці, на пружынныя бароны («пружынаўкі») з боку сялян з бліжэйшых населеных пунктаў.

У 1909 г. інструктарам па малочнай гаспадарцы Таварыства быў арганізаваны шэраг курсаў па

---

[9] Михайлов А. М. Краткий очерк развития агрономической помощи населению в Минской губ. и Советской Белоруссии. Минск, 1923. С. 7.

паляпшэнні жывёлагадоўлі для сялян і навучэнцаў Мар'інагорскай сельскагаспадарчай школы. З 1905 г. члены Таварыства і мясцовае насельніцтва атрымлівалі дапамогу ў забеспячэнні сельскагаспадарчым інвентаром, насеннем, угнаеннямі праз камерцыйны аддзел Таварыства (пазней пераўтвораны ў Мінскі земляробчы сіндыкат), які стаў першым арганізатарам сельскагаспадарчых складоў у Мінскай губерні[10]. Да адкрыцця земскіх складоў у 1910 г. склады сіндыката з'яўляліся адзінымі буйнымі цэнтрамі забеспячэння насельніцтва неабходным сельскагаспадарчым інвентаром, якія канкурыравалі з прыватнымі гандлярамі. Такім чынам, Э. Вайніловіч як старшыня Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі зрабіў шмат захадаў для развіцця агранамічнай дапамогі насельніцтву губерні.

Акрамя Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, у пачатку XX ст. агранамічную дапамогу насельніцтву аказвалі ўрадавыя органы. З рэалізацыяй Сталыпінскай аграрнай рэформы на тэрыторыі Беларусі пачалі дзейнасць землеўпарадкавальныя камісіі, падначаленыя Дэпартаменту земляробства. Іх задачай была арганізацыя індывідуальнага землекарыстання. Выдаткі на агранамічныя мера-

[10] Михайлов А. М. Краткий очерк... Минск, 1923. С. 7–8.

прыемствы ў раёнах дзеяння камісій Мінскай губерні з 1910 да 1914 гг. узраслі амаль у 6,5 разоў: з 14 тыс. руб. у 1910 г. да 90 тыс. 446 руб. у 1914 г.[11] Непасрэдная праца па абслугоўванні насельніцтва ўскладалася на ўчасткавых (участак — агранамічны раён) і павятовых аграномаў пры землеўпарадкавальных камісіях, а таксама сельскагаспадарчых тэхнікаў і інструктараў. У Мінскай губерні на сродкі ўрада (па даных на 1 студзеня) утрымоўвалася: у 1911 г. — 7 чал., у 1912 г. — 28 чал., у 1913 г. — 37 чал., у 1914 г. — 54 чал.[12] агранамічнага персаналу (табліца 1). Для характарыстыкі размеркавання ўрадавага персаналу па службовых катэгорыях можна прывесці даныя за 1913 і 1914 гг. (па стану на 1 студзеня).

***Табліца 1* — Урадавы агранамічны персанал Мінскай губерні**[13]

| Гады | Інспектары па сельскай гаспадарцы і ўрадавыя аграномы | Аграномы землеўпарадкавальных камісій | Сельскагаспадарчыя старасты | Спецыялісты | Інструктары | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1913 | 2 | 6 | 19 | 3 | 7 | 37 |
| 1914 | 2 | 9 | 28 | 2 | 13 | 54 |

[11] Вельяминов-Зернов А. В. Обзор по оказанию агрономической помощи в районах землеустройства Минской губернии за 1914 г. Минск, 1915. С. 1.

[12] Михайлов А. М. Краткий очерк... Минск, 1923. С. 10.

[13] Михайлов А. М. Краткий очерк...Минск, 1923. С. 10.

У пачатку 1914 г. сярод ўрадавага аграперсаналу вышэйшую сельскагаспадарчую адукацыю мелі 10 чал. (18 %), сярэднюю – 6 чал. (12 %), ніжэйшую – 38 чал. (70 %)[14].

У раён дзеяння кожнага з аграномаў землеўпарадкавальных камісій Мінскай губерні ўваходзіла першапачаткова ад аднаго да трох паветаў. У 1913 г. у Мінскай губерні на 9 паветаў прыходзілася 3 раённых і 2 павятовых аграномаў, а ў 1914 г. – 3 раённых і 5 павятовых. Зразумела, што гэтай колькасці было яўна недастаткова. У прыватнасці, у Пінскім, Мазырскім і Рэчыцкім паветах кожнаму з аграномаў прыходзілася аказваць дапамогу насельніцтву на тэрыторыі больш за 1 млн дзес. Таму ў Мазырскім і Рэчыцкім паветах у 1914 г. былі створаны пасады яшчэ двух (па адным на павет) у дапаўненне да двух ужо існаваўшых аграномаў. У выніку плошча кожнага з чатырох агранамічных участкаў стала роўнай амаль палове павета, ці каля 400–500 дзес.[15] Да 1 студзеня 1915 г. агранамічны персанал у губерні (у тым ліку і прызваныя ў армію асобы) складаўся з 1 губернскага агранома, 9 павятовых і 2 участкавых аграномаў, 4 інструктараў (2 па садоўніцтве і 2 па жывёлагадоўлі) і 34 агранамічных

---

[14] Михайлов А. М. Краткий очерк... Минск, 1923. С. 10.

[15] Вельяминов-Зернов А. В. Обзор по оказанию агрономической помощи... за 1914 г. Минск, 1915. С. 2.

старастаў. З іх 8 аграномаў мелі вышэйшую адукацыю і 4 — сярэднюю, а інструктары і аграналмічныя старасты — ніжэйшую адукацыю. Аднак, як адзначалася ў справаздачы, «такое количество агрономического персонала ... является для огромной площади губернии крайне недостаточным, поэтому едва ли может быть речь о близости агрономов к населению, когда агроном живет на расстоянии сотни, а то и более верст от обслуживаемых им селений...»[16]

З гэтай нагоды такой важнай была праца Мінскага губернскага земства па аказанні агранамічнай дапамогі насельніцтву. Яшчэ ў 1910 г. Мінскім губернскім камітэтам па справах земскай гаспадаркі былі вызначаны пасады губернскага і пяці павятовых земскіх аграномаў (у Бабруйскім, Барысаўскім, Мінскім, Слуцкім і Навагрудскім паветах), а губернскі агранoм быў запрошаны толькі ў 1911 г.[17]. Пры гэтым земскі агранамічны персанал не абмяжоўваўся толькі раёнамі землеўпарадкавання ці прыватнага маёнтка, а ажыццяўляў сваю дапамогу насельніцтву ўсёй губерні і павета.

У цэлым у Беларусі адчуваўся недахоп кадраў, якія мелі сельскагаспадарчую адукацыю. Таму

[16] Вельяминов-Зернов А. В. Обзор по оказанию агрономической помощи... за 1914 г. Минск, 1915. С. 4.

[17] Михайлов А. М. Краткий очерк... Минск, 1923. С. 14.

з 1910 г. Мінскі губернскі камітэт па справах земскай гаспадаркі распачаў працу па падрыхтоўцы ў губерні сваіх спецыялістаў і стварэнні ніжэйшай сельскагаспадарчай школы. У прыватнасці, было асігнавана 9 тыс. руб. на пераўтварэнне Бабруйскай школы садоўніцтва ў сельскагаспадарчае вучылішча і на ўладкаванне ў м. Азарычах Бабруйскага павета пачатковай сельскагаспадарчай школы. Адначасова быў сфарміраваны губернскі эканамічны савет, уладкаваны сельскагаспадарчыя аддзелы пры губернскай і павятовых управах. Мінскі губернскі камітэт хадайнічаў перад дэпартаментам земляробства аб прызначэнні ў губерню аднаго інструктара і трох майстроў «па малочнай справе».

Да звычайных выдаткаў на ўтрыманне конскіх злучных пунктаў і на выдачу ўзнагарод на Навагрудскай конскай выставе была дадазена сума на фінансаванне сельскагаспадарчага таварыства ў м. Капылі Слуцкага павета. Акрамя таго, было пастаноўлена стварыць у паветах склады для продажу земляробчых прылад, насення і ўгнаенняў, а таксама зернеачышчальныя пункты (па адным на павет). У цэлым каштарыс губернскага камітэта на сельскагаспадарчыя патрэбы ў 1910 г. складаў 29 тыс. 821 руб., у тым ліку 6 тыс. руб. — на меры па садзейнічанню конегадоўлі, як практыкавалася раней, і 23 тыс. 790 руб. — на іншыя

сельскагаспадарчыя мерапрыемствы з запасных сум[18].

Мінскім губернскім камітэтам па справах земскай гаспадаркі было запланавана выдаткаваць у 1911 г. на сельскагаспадарчыя мерапрыемствы 38 тыс. 591 руб. Меркавалася павялічыць каштарыс на ўладкаванне і абсталяванне ў м. Азарычах Бабруйскага павета і ў м. Плотніцах Пінскага павета пачатковых сельскагаспадарчых школ, на запрашэнне павятовых аграномаў для астатніх чатырох паветаў губерні і інш. У сакавіку 1911 г. планавалася рэалізаваць шэраг новых мерапрыемстваў: арганізацыю і абсталяванне станцый, дзе мясцовыя сяляне маглі ўзяць у часовае карыстанне сельскагаспадарчае абсталяванне; пастаноўку вопытаў з мінеральнымі ўгнаеннямі; правядзенне сельскагаспадарчых гутарак; распаўсюджанне травасеяння і культуры кармавых раслін і інш. На названыя мерапрыемствы меркавалася выдаткаваць у звышкаштарысным парадку (з запасных сум) 15 тыс. 475 руб. Аднак Асобая па земскіх і гарадскіх справах прысутнасць адхіліла гэты каштарыс, таму запланаваныя мерапрыемствы не былі рэалізаваны. У выніку у 1911 г. з насельніцтва былі сабраны земскія зборы, але з гэтых сродкаў на мясцовыя сельскагаспадарчыя патрэбы з-за позняга зацвяр-

---

[18] Вестник Минского губернского земства. 1914. № 3–4. С. 83.

джэння каштарыса так і не былі выкарыстаны амаль 37 тыс. руб.[19] Такім чынам, адсутнасць у краі земстваў замаруджвала рэалізацыю мерапрыемстваў па агранамічнай дапамозе насельніцтву.

Сапраўдная дзейнасць земстваў пачалася ў 1912 г. На адкрыцці Мінскага губернскага земскага сходу, якое адбылося 25 студзеня 1912 г., Мінскі губернатар Я. Эрдэлі звярнуўся да галосных с прамовай. Ён адзначыў важнасць мерапрыемстваў, якія мелі мэтай «непосредственно материальное его (насельніцтва. – *С. Т.*) благосостояние. К ним надо отнести все доклады о мерах, клонящихся к улучшению сельского хозяйства...»[20]

Старшыня агранамічнай камісіі І. А. Папа-Афанасопула выступіў з прамовай, у якой асудзіў сціпласць выдаткаў былога губернскага камітэта па справах земскай гаспадаркі на агранамічныя мерапрыемствы. У прыватнасці, ён адзначыў: «За этот период времени (что существовал губернский комитет) было взято с населения в сметном порядке на удовлетворение всех отраслей земско-народной жизни губернии 13 млн 479 тыс. 256 руб., при чем в эту сумму не вошли затраченные деньги на мероприятия по дорожному и страховому делу, которые

[19] Вестник Минского губернского земства. 1914. № 3–4. С. 85.

[20] Журналы I Очередного Минского Губернского Земского Собрания. Сессия 25 января – 7 февраля 1912 г. Минск, 1912. С. 1.

удовлетворялись из специальных средств. Что же губернский комитет дал населению из взятых миллионов обратно, на агрономические мероприятия? За все время своего существования губернский комитет уделил на агрономию самую ничтожную сумму, в размере лишь 78 тыс. 220 руб., т. е. 0,58 % всего сбора; в эту сумму входят и мероприятия, не чисто агрономического характера, по облесению песков, стоившие около 15 тыс. руб. Если прибавить к этому деньги, затраченные на Виленскую случную конюшню, включая этот расход в число мер экономического характера, то вышеуказанная сумма выразится в 132 тыс. 238 руб., т. е. 0,9 % ... Я ставлю теперь вопрос: можно ли впредь ограничиваться такими крохами, при взимании с населения миллионов? — Ответ сам собою ясен...»[21]

Галоўным напрамкам у дзейнасці земстваў сталі эканамічныя мерапрыемствы, якія цяпер фінансаваліся больш шчодра. Так, агульныя каштарысы выдаткаў земстваў у 40 губернях на сельскагаспадарчыя мерапрыемствы ў 1913 г. складалі 22 млн 221 тыс. руб. і ўзраслі з 1912 г. на 6 млн 313 тыс. руб. (40 %)[22]. У 1913 г. Мінская губерня па агульнай суме выдаткаў на агранамічную дапамогу насельніцтву

---

[21] Журналы I Очередного Минского Губернского Земского Собрания... Минск, 1912. С. 83–84.

[22] Вестник Минского губернского земства. 1914. № 2. С. 35.

(397,6 тыс. руб.) займала 22-е месца сярод усіх земскіх губерняў і 10-е ў працэнтных адносінах гэтай сумы да агульнага каштарыса (9,3 %), пераўзыходзячы нават Маскоўскае і Саратаўскае земствы[23].

Значную ўвагу Мінскае губернскае земства скіравала на арганізацыю сельскагаспадарчых земскіх складоў і пракатна-зернеачышчальных пунктаў. Першыя склады ў пяці паветах (5 пунктаў – па адным на павет) пачалі функцыянаваць з вясны 1911 г. У 1912 г. іх было ўжо 12, а ў 1914 г. – 19. За гэты час тут было рэалізавана прадукцыі ў 1911 г. (за 9 месяцаў) на 12 тыс. 747 руб., у 1912 г. – на 66 тыс. 201 руб., у 1914 г. – на 105 тыс. 400 руб.[24] Пры гэтым сельскагаспадарчыя тавары на земскіх складах прадаваліся больш танна і лепшай якасці, чым у многіх іншых месцах.

Штогод у Мінскай губерні адкрываліся новыя земскія пракатна-зернеачышчальныя пункты: у 1911 г. – 1, у 1912 г. – 12, у 1913 г. – 24, у 1914 г. – 14. Пры гэтым ва ўсёй губерні ў 1914 г. працавалі 87 пракатна-зернеачышчальных пунктаў, з іх земскіх – 51 пункт, землеўладкавальных – 31, якія належалі крэдытным установам і сельскагаспадарчым таварыствам – 5 пунктаў[25]. На земскіх зер-

[23] Вестник Минского губернского земства. 1914. № 3–4. С. 97.

[24] Михайлов А. М. Краткий очерк... Минск, 1923. С. 14.

[25] Михайлов А. М. Краткий очерк... Минск, 1923. С. 14.

неачышчальных пунктах і пракатных станцыях сельскае насельніцтва за вельмі танны кошт, а на некаторых пунктах і бясплатна, магло ачысціць сваё насенне, звычайна вельмі забруджанае. Акрамя таго, сяляне мелі магчымасць часова карыстацца разнастайнымі неабходнымі ў гаспадарцы прыладамі, набыць якія многія гаспадары не маглі з-за параўнальнай дарагоўлі ці ўвогуле былі яшчэ невядомымі сялянам[26].

На другім чарговым земскім сходзе на пасяджэнні 10 лютага 1913 г. было адзначана, што «к ведению губернскаго земства должны быть отнесены организация и финансирование следующих мероприятий: 1) обследований всякого рода, 2) опытнаго дела в составе: опытных станций, районных опытных полей, а также коллективных опытов, 3) мероприятий по улучшению животноводства, имеющих губернское значение, 4) сельскохозяйственного образования и распространения сельско-хозяйственных знаний, имеющих губернское значение. По остальным мероприятиям необходимо лишь техническое объединение губернского и уездных земств»[27].

---

26 Вестник Минского губернского земства. 1914. № 3–4. С. 95.

27 Свод постановлений губернского агрономического совещания, состоявшегося при Минской губернской земской управе 1–3 июля 1914 года. Минск, 1914. Приложения. С. 22.

Шырокі размах атрымала распаўсюджанне доследных станцый, вопытных палёў, калектыўных вопытаў, меры па ўдасканаленні сельскагаспадарчай адукацыі, жывёлагадоўлі і распаўсюджанні сельскагаспадарчых ведаў. Дзеля іх планамернай арганізацыі губернскім земствам было прынята рашэнне аб неабходнасці папярэдняга вывучэння глебы, геалагічнай структуры, клімату губерні. Гэта было неабходна для вызначэння сельскагаспадарчых раёнаў і арганізацыі тых ці іншых вопытных ўстаноў. Таму губернская ўправа заключыла пагадненне з вядомым рускім вучоным, доктарам мінералогіі і геаграфіі П. А. Тутcоўскім аб складанні геалагічнага агляду Мінскай губерні. Вынікам стаў «Геологический очерк Минской губернии», на выданне якога з губернскіх сродкаў было выдаткавана 700 руб.[28]

Вялікую цікавасць сярод насельніцтва набылі і іншыя мерапрыемствы па распаўсюджанні сельскагаспадарчых ведаў. У 1912 г. у Мінску былі заснаваны месячныя цэнтральныя сельскагаспадарчыя курсы, у якіх за два гады (1912–1913 гг.) прайшлі навучанне сотні сялян з усёй губерні.

[28] Вестник Минского губернского земства. 1914. № 3–4. С. 87; 1915. № 3. С. 58; Тутковский П. А. Геологический очерк Минской губернии / по данным научной литературы и собственным исследованиям составил профессор П. А.Тутковский. Киев, 1915. 343 с.

У тым жа годзе ў Мінску быў адкрыты сельскагаспадарчы музей, у якім можна было паглядзець на разнастайныя новыя сельскагаспадарчыя прылады і механізмы[29]. З пачаткам вайны дзейнасць земства ў названым напрамку працягвалася. У прыватнасці, у 1915 г. Дэпартамент земляробства даў дазвол на адкрыццё і фінансаванне цэнтральных сельскагаспадарчых курсаў пры Мінскай губернскай земскай управе і на правядзенне ў шасці паветах сельскагаспадарчых чытанняў[30].

У цэлым аб дынаміцы росту колькасці земскіх сельскагаспадарчых курсаў сведчыць табліца 2.

***Табліца 2*** **— Колькасць земскіх сельскагаспадарчых курсаў (1911–1914 гг.)**[31]

| Гады | Колькасць чытанняў | Колькасць слухачоў |
|---|---|---|
| 1911–1912 | 19 | 3.895 |
| 1912–1913 | 115 | 10.469 |
| 1913–1914 | 367 | 36.454 |

У жніўні 1911 г. адкрылася Мінская вопытная балотная станцыя, мэтай якой была «праверка метадаў эксплуатацыі багнаў». Мінскае губернскае земства выдаткавала на яе арганізацыю 21,5 тыс. руб. Трэба зазначыць, што мерапрыемствы па асушэнні багнаў і далейшым выкарыстанні атрыманых угод-

29 Вестник Минского губернского земства. 1914. № 3–4. С. 90.

30 Вестник Минского губернского земства. 1915. № 3. С. 43.

31 Михайлов А. М. Краткий очерк... Минск, 1923. С. 16.

дзяў праводзіліся пры шчыльным супрацоўніцтве з дзяржаўнымі органамі і прыватнымі асобамі. Пры гэтым звярталася ўвага насельніцтва на карысць падобных мерапрыемстваў. Дзеля гэтага спецыяльным персаналам па культуры балот і лугаводстве пры земскіх управах Мінскай губерні была зроблена пробная сяўба розных кармавых караняплодаў на асушаных багнах. У выніку гаспадары ўпэўніваліся, што на такіх землях ураджаі атрымліваліся больш высокімі пры найменшых затратах, а ў статку пры кармленні карняплодамі павышаліся надоі і якасць малака[32].

У 1913 г. пры Мінскай губернскай земскай управе было заснавана культурна-гідратэхнічнае бюро. Яго мэтай стала складанне праектаў і рэалізацыя работ па асушэнні багнаў. Бюро створана ў рэчышчы рэалізацыі агульнарасійскай праграмы па «зямельным паляпшэнні» і, па сутнасці, выконвала пасрэдніцкую функцыю. У прыватнасці, на меліяратыўныя работы на Палессі са сродкаў дзяржаўнага бюджэту меркавалася выдаткаваць 4 млн руб.[33]. Зразумела, што ў гэтым сэнсе земства не мела самастойнасці, але прапаноўвала некаторыя мерапрыемствы і рабіла пасільны ўклад у агульную справу.

---

[32] Вестник Минского губернского земства. 1915. № 1–2. С. 32–33.

[33] Вестник Минского губернского земства. 1914. № 11. С. 5–6; № 12. С. 13–14.

Мінскае губернскае земства ўзяло на сябе ініцыятыву стварэння кадраў для сельскай гаспадаркі з асяроддзя мясцовага насельніцтва. 19 лютага 1912 г. пры Мінскай балотнай станцыі адкрыліся цэнтральныя сельскагаспадарчыя курсы з трохмесячным тэрмінам навучання. Непасрэдная задача гэтых курсаў — падрыхтоўка спецыялістаў па культуры кармавых раслін, асушэнні багнаў, лугаводстве па Віцебскай, Валынскай, Кіеўскай, Мінскай, Магілёўскай і Смаленскай губернях. У маі 1912 г. першыя выпускнікі курсаў пасля экзаменаў і праходжання практыкі былі накіраваны на экскурсію на вопытную ферму Рыжскага політэхнічнага інстытута. Гэта былі трэція па ўсёй Расіі курсы, арганізаваныя з падобнай мэтай[34]. Акрамя таго, у Мінскай губерні пры Мар'інагорскай сельскагаспадарчай школе ў 1911 г. адкрыліся месячнныя курсы для настаўнікаў па земляробстве, садоўніцтве, агародніцтве і малочнай справе.

У 1914 г. Мінскім земствам былі арганізаваны экскурсіі сялян і дробных землеўладальнікаў за мяжу (у Данію і Швецыю). Фінансавая падтрымка на паездку выдавалася Дэпартаментам земляробства. Мэтай такіх экскурсій было азнаямленне са станам сельскай гаспадаркі ўвогуле і жывёла-

[34] Слобожанин В. П. Земское самоуправление в Беларуси (1905–1917 гг.). Минск, 1994. С. 54.

гадоўлі ў прыватнасці ў гэтых класічных краінах дробнага землеўладання і высокай сельскагаспадарчай культуры[35].

У 1914 г. Мінскае губернскае земства ўзбудзіла хадайніцтва перад Міністэрствам народнай асветы аб стварэнні ў Мінску сельскагаспадарчага інстытута. Хадайніцтва было падтрымана Дзяржаўнай думай, якая пастанавіла: праект Мінскага губернскага земства прыняць, перадаць на разгляд сельскагаспадарчаму ведамству і прызнаць пажаданым адкрыццё ў г. Мінску Сельскагаспадарчага інстытута[36]. У маі 1914 г. Мінскае губернскае земства прыняло рашэнне: да восені 1914 г. стварыць у Мінску ніжэйшае культурна-тэхнічнае вучылішча[37].

У адпаведнасці з каштарысам на 1914 г., Мінскім губернскім земствам планавалася выдаткаваць «па § 9 на садзейнічанне эканамічнаму дабрабыту насельніцтва» 96 тыс. 328 руб. (12,2 %) з агульнага бюджэта ў 780 тыс. 628 руб. Пры гэтым трэба адзначыць, што павятовыя земствы складалі свае каштарысы, у якія ўключалі выдаткі і на названыя патрэбы. У цэлым у Мінскай губерні ў 1914 г. агульны бюджэт губернскага і павятовых

---

35 Вестник Минского губернского земства. 1914. № 3–4. С. 90.

36 Слобожанин В. П. Земское самоуправление в Беларуси... Минск, 1994. С. 47.

37 Слобожанин В. П. Земское самоуправление в Беларуси... Минск, 1994. С. 30.

земстваў складаў 5 млн 028 тыс. 654 руб., у тым ліку па § 9 – 320 тыс. 715 руб. (6,4 %). Пры гэтым Барысаўскае і Рэчыцкае павятовыя земствы лічылі мэтазгодным на агранамічныя мерапрыемствы выдаткаваць толькі па 2,5 % свайго бюджэту – па 13 тыс. 230 руб. і 10 тыс. 907 руб. адпаведна, а Ігуменскае – 67 тыс. 450 руб. (14,5 %)[38]. З гэтай прычыны Губернская агранамічная нарада, якая адбылася 1–3 ліпеня 1914 г. пры Мінскай губернскай земскай управе, адзначыла, што «в видах правильной и планомерной организации дела агрономической помощи населению губернии необходимо объединение губернского и уездных земств...»[39]

На названай нарадзе высветлілася, што ў некаторых выпадках мясцовае сялянскае насельніцтва негатыўна адносілася да земскіх агранамічных мерапрыемстваў з-за сваёй недасведчанасці. Гэта ставіла задачу больш дакладнай работы па абвяшчэнні і тлумачэнні сялянам задач агранамічнай дзейнасці земства. Акрамя таго, пры арганізацыі сельскагаспадарчых чытанняў і гутарак з сялянамі ў вёсках нярэдка сустракаліся перашкоды з боку мясцовай адміністрацыі. З гэтай нагоды губерн-

---

[38] Свод постановлений губернского агрономического совещания... 1914 года. Минск, 1914. Приложения. С. 45.

[39] Свод постановлений губернского агрономического совещания... 1914 года. Минск, 1914. С. 9.

ская ўправа прасіла ўсіх земскіх аграномаў паведамляць ёй аб такіх выпадках для высвятлення стаўлення мясцовай адміністрацыі да названай справы[40].

З пачаткам Першай сусветнай вайны Мінская губерня, як адна з бліжэйшых да раёна баявых дзеянняў, апынулася ў складаных умовах. Першая ж ваенная мабілізацыя пазбавіла мясцовыя агранамічныя арганізацыі многіх работнікаў, а тыя, што засталіся, прыцягваліся да выканання заданняў, звязаных з мэтамі ваеннага часу: арганізацыяй дапамогі сем'ям мабілізаваных, нарыхтоўках фуражу для арміі і інш. Каштарысы на агранамічныя мерапрыемствы скарачаліся. Прыйшлося адмовіцца ад многіх планаў, паўсталі задачы захавання ўжо створаных асяродкаў культуры.

Такім чынам, Мінскае губернскае земства праводзіла значную працу па агранамічнай дапамозе насельніцтву губерні. Аднак трэба адзначыць, што недахоп земскага сельскагаспадарчага персаналу часам замаруджваў рэалізацыю шэрагу мерапрыемстваў. Ступень набліжэння агранамічнай дапамогі да насельніііцтва ў цэлым з'яўлялася недастатковай. Губернскае земства шчыльна супрацоўнічала з урадавымі сельскагаспадарчымі ўста-

[40] Свод постановлений губернского агрономического совещания... 1914 года. Минск, 1914. С. 5–6.

новамі і атрымоўвала ад іх значную дапамогу. Гэта адлюстроўвалася ў частковым фінансаванні Дэпартаментам земляробства многіх земскіх мерапрыемстваў, дапамозе спецыялістаў, якія падпарадкоўваліся мясцоваму інспектару сельскай гаспадаркі. Напярэдадні Першай сусветнай вайны з развіццём земстваў паўстала пытанне аб аб'яднанні ўрадавай агранамічнай арганізацыі і земскай пад ведамствам апошняй.

*Сяргей Траццяк*

# «АПОШНІ БЕЛАРУСКІ БАЯРЫН»: ЭДВАРД ВАЙНІЛОВІЧ І МІРНЫЯ ПЕРАГАВОРЫ Ў РЫЗЕ (1920–1921 гг.)

Рыжскі мірны дагавор 18 сакавіка 1921 г. паклаў канец распачатаму ў 1914 г. перыяду войнаў ва Усходняй Еўропе. Ён азначаў падзел Беларусі і беларускага народа паміж дзяржавамі з розным грамадска-палітычным ладам і дыяметральна процілеглымі геапалітычнымі арыентацыямі, а таксама міжнародна-прававое афармленне дзяржаўнасці Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі.

Рыжскі мір канчаткова замацаваў у грамадска-палітычнай думцы Усходняй Еўропы ў цэлым і Беларусі ў прыватнасці прынцыпы нацыянальнай дзяржавы і дзяржавы-нацыі, выхад на пануючыя пазіцыі ў грамадска-палітычным жыцці рэгіёна партый і рухаў, ідэалогія якіх грунтавалася на мадэрным нацыяналізме ў буржуазнай ці сацыялістычнай яго версіі. І ў адносінах да Беларусі — зыход у гістарычны нябыт раней уплывовай у асяроддзі мясцовай арыстакратыі і інтэлігенцыі

шляхецкага паходжання культурна-палітычнай плыні ліцьвінізму або польскай краёвасці. Гэта відавочна праявілася ў палітычным лёсе выдатнага прадстаўніка краёвай ідэі Эдварда Вайніловіча.

Парадаксальна, але Эдвард Адам Вайніловіч (1847–1928) — чалавек, які так шмат зрабіў для справы мадэрнізацыі Беларусі, ніколі не прымяняў мадэрнай канцэпцыі нацыі ні для вызначэння ўласнай тоеснасці, ні для вызначэння тоеснасці насельніцтва таго краю, які называў Беларуссю. Ён усведамляў і сябе, і іншых насельнікаў роднага краю часткай даўняга ліцьвінскага народа — насельніка былога Вялікага Княства Літоўскага, да якога належалі і «краёвыя» палякі, і літоўцы-«ліцьвіны», і беларусы.

У рэвалюцыйных і ваенных падзеях 1917–1918 гг. Э. Вайніловіч заняў актыўную антыбальшавіцкую пазіцыю. Перад прыходам на Случчыну атрадаў Чырвонай Арміі 2 снежня 1918 г. Э. Вайніловіч з жонкай Алімпіяй выехаў у Варшаву, дзе 6 снежня 1918 г. быў сярод заснавальнікаў Саюза палякаў беларускіх ускраін (СПБУ). СПБУ разгарнуў агітацыю запісу добраахвотнікаў у Літоўска-беларускую дывізію, выдаткаваў грошы на яе забеспячэнне, падтрымаў ідэю ўваходжання літоўска-беларускіх зямель у склад шматнацыя-

нальнай федэратыўнай Рэчы Паспалітай і ўсталявання усходняй мяжы новай дзяржавы як мага далей на ўсход (да ўсходніх межаў былой Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў — да часу першага падзелу ў 1772 г.).

У лютым 1919 г., калі афіцыйна пачалася Польска-савецкая вайна, Э. Вайніловіч з Р. Скірмунтам актыўна арганізоўваў сустрэчы і вёў перамовы з уплывовымі польскімі палітыкамі (асабліва з ліку арыстакратаў) адносна лёсу літоўска-беларускіх зямель і захавання ўгоддзяў за іх ранейшымі ўласнікамі.

Польская рада беларускіх зямель склала дэкларацыю польскаму ўраду аб жаданні цеснага саюза Беларусі і Польшчы, але ніяк не ўключэння Беларусі ў склад апошняй[1]. 22 красавіка 1919 г., калі польскія войскі ўзялі Вільню, Ю. Пілсудскі выдаў «Адозву да жыхароў былога Вялікага Княства Літоўскага», якая аб'яўляла аб жаданні стварыць Літоўска-Беларускую дзяржаву, што была б звязана ўніяй з Польшчай. Для рэалізацыі гэтага намеру была створана новая адміністрацыйная адзінка — Грамадзянскае ўпраўленне Усходніх зямель, якое ўзначаліў Е. Асмалоўскі (1872–

[1] Gierowska-Kałłaur J. Zarząd cywilny Ziem Wschodnich (19 lutego 1919 – 9 września 1920). Warszawa, 2003. – S. 46.

1952)[2], член Польскай рады Мінскай зямлі і краёвец па перакананнях. Генеральны камісар Усходніх зямель падпарадкоўваўся непасрэдна Начальніку Польскай дзяржавы Ю. Пілсудскаму. 31 мая 1919 г. па ініцыятыве Л. Дубейкаўскага і Э. Вайніловіча ў Варшаве была створана малалікая арганізацыя «Польска-беларускае таварыства для палітычнага і культурнага супрацоўніцтва на Беларусі» (ПБТПКСБ). Мэтай гэтай арганізацыі была палітычная падтрымка ідэі федэратыўнага саюза Беларусі і Польшчы. Членамі ПБТПКСБ сталі як беларускія маянткоўцы-кансерватары, так і дзеячы нацыянальна-дэмакратычнага руху: М. Ваньковіч, княгіня М. Радзівіл, Р. Скірмунт, А. Смоліч, А. Лядніцкі, Ч. Янкоўскі, Б. Тарашкевіч і інш. 26 жніўня 1919 г., пасля заняцця польскімі

---

[2] Ежы Асмалоўскі (1872–1952) нарадзіўся ў Пінскім павеце Мінскай губерні. «Польскі» дваранін-каталік, адзін з блізкіх сябраў Р. Скірмунта і князя Г. Друцкага-Любецкага. Як і Р. Скірмунт, фінансава падтрымліваў «Нашу Ніву» — галоўную газету беларускага нацыянальна-дэмакратычнага руху. Пра свае адносіны да Беларусі напісаў у мемуарах: «Увесь мой род беларускага паходжання з Магілёўскай губерні. Магчыма толькі ў прадзеда роднай мовай была польская. Што ж з'яўляецца маёй Айчынай — Польшча ці Беларусь? І хто я — паляк ці беларус? Я паляк па культуры і па мове. Я каталік. Але не жыву ў Польшчы. Маю пэўныя абавязкі ў адносінах да краю, дзе нарадзіўся, і людзі, сярод якіх я жыву, мне больш блізкія». Гл.: Смалянчук А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. СПб., 2004. С.127, 208.

войскамі Міншчыны, Э. і А. Вайніловічы выехалі з Варшавы ў Беларусь.

Пасля заняцця польскімі войскамі Мінска, 19 верасня 1919 г. Ю. Пілсудскі выступіў перад дэлегацыяй мінскай грамадскасці з прамовай пабеларуску, недвухсэнсоўна дэкларуючы неабходнасць дзяржаўнасці для беларусаў. 8 мая 1920 г. Э. Вайніловіч спецыяльна прыехаў з Мінска ў Варшаву, каб падаць праз ПБТПКСБ у польскі ўрад дэкларацыю аб саюзе Беларусі і Польшчы. Гэта было дадатковым аргументам для прыхільнікаў ідэі раўнапраўнай польска-беларускай федэрацыі, а не ўключэння толькі часткі беларускіх зямель у склад Польшчы ў статусе звычайных польскіх ваяводстваў, як таго шмат месяцаў дабіваліся польскія «эндэкі». Ён патлумачыў, што сітуацыя складаная, бо перамагае ідэя падзелу Беларусі паміж Польшчай і бальшавікамі, а пра незалежнасць Беларусі не можа ісці гаворкі. Такая дэкларацыя была апублікавана ў польскіх газетах[3].

24 чэрвеня 1920 г. Э. Вайніловіч сустрэўся з Ю. Пілсудскім у Бельведэрскім палацы ў Варшаве, каб прадухіліць правядзенне радыкальнай аграрнай рэформы ў Беларусі і запэўніць, што мясцовае дваранства літоўска-беларускіх зямель

[3] Войнилович Э. Воспоминания: пер. с польск. Минск, 2007. С. 313–314.

аддана змагаецца супраць бальшавікоў за ўнію Беларусі і Літвы з Польшчай. Э. Вайніловіч адзначаў, што ён не праціўнік аграрнай рэформы (пераходу часткі зямлі беззямельным), але хоча, каб працэс праходзіў пастунова, як у Заходняй Еўропе, а не паводле бальшавіцкага ўзору поўнай экспрапрыяцыі зямлі ў буйных уласнікаў[4].

Ізноў у змаганне за будучы лёс Беларусі Э. Вайніловіч уступіў у кастрычніку 1920 г. Ён атрымаў весткі аб заключэнні ў Рызе перамір’я паміж Польшчай і Савецкай Расіяй, але яны яго не ўзрадавалі. 13 кастрычніка 1920 г. Э. Вайніловіч занатаваў у сваім дзённіку: «Я даведаўся аб падпісанні ў Рызе мірных ініцыятыў, згодна з якімі ўсходнія памежныя губерні і Мінск – сталіца Беларусі застаюцца ў руках бальшавікоў!!! ... Польшча адракаецца ад Мінска, дзе знікае ўся наша тытанічная праца, узяць хоць бы наша “Аграрнае таварыства”, “Узаемнае страхаванне”, “Гарадское крэдытнае таварыства”, “Мацеж”, школы, школьныя пункты. Няўжо гэтая цяжкая, карпатлівая праца патрэбна была для таго, каб усё звесці да нуля не з прычыны ваенных няўдач, не ў сувязі з супраціўленнем ворага, а ў выніку непаразумення ўсёй значнасці нашых усходніх зямель для ўмацавання дзяржавы? Дзеля таго, каб наша камісія на мірных перамовах

---

[4] Войнилович Э. Указ. соч. С. 321–323.

у Рызе не тое, каб “павінна была саступіць”, а з самага пачатку ў прынцыпе “не хацела адстойваць Мінск”»[5]. 20 кастрычніка 1920 г. з’яўляецца такі запіс: «У адпаведнасці з праверанай інфармацыяй, мяжа, пазначаная на мірных перамовах, праходзіць на ўсход ад Нясвіжа, а, дакладней, паміж Нясвіжам і Цімкавічамі, паміж Клецкам і Цімкавічамі, далей ідучы да ракі Лань. Тут маё радавое гняздо, якое застаецца ў бальшавікоў. Госпаду Богу было заўгодна, каб я склаў сваю галаву, бяздомны і са сціплымі сродкамі на зыходзе свайго быцця»[6].

У той час прыхільнікамі анексіі ў склад Польшчы былі землеўласнікі Віленшчыны і ў памежных з Польшчай паветах былой Гродзенскай губерні, а ўніі з Польшчай — землеўласнікі з астатніх беларускіх зямель. Прычынай таму былі прэтэнзіі Літвы на Вільню, Віленскі край, Гродна і Гродзенскі край. Маянткоўцы Віленшчыны і Гродзеншчыны лічылі, што за памкненнямі Літвы стаяць немцы ці бальшавікі, і не хацелі ўваходжання сваіх зямель у склад Літвы[7]. 22 кастрычніка 1920 г. Э. Вайніловіч атрымаў тэлеграму ад Р. Скірмунта — неадкладна прыехаць у Варшаву на сход СПБУ[8].

---

[5] Там жа. С. 333–334.

[6] Там жа. С. 335.

[7] Войнилович Э. Указ. соч. С. 338; Gierowska-Kałłaur J. Ibid. S. 46–48.

[8] Войнилович Э. Указ. соч. С. 335.

24 кастрычніка 1920 г. на сходзе, дзе прысутнічала 500–600 чалавек, Э. Вайніловіч выступіў з асуджэннем нядаўняй ухвалы сейма Польскай Рэспублікі адносна дагавора з бальшавікамі ў Рызе, паводле якога Беларусь падзялялася на дзве часткі, і выказаўся, што ўзровень польскага сейма і ўрада не адпавядае надзённым задачам. У цэлым ахарактарызаваў дагавор як чацвёрты падзел «Польшчы» (г. зн. Рэчы Паспалітай) і адмову ад «ягелонскай ідэі» — аднаўлення шматнацыянальнай і талерантнай для народаў і рэлігій федэрацыйнай дзяржавы, за якую змагаліся ў паўстаннях і цярпелі столькі нягод у XIX ст.[9] М. Абязерскі, які быў адпраўлены ў Рыгу ад імя арганізацый землеўласнікаў беларускіх зямель і з'яўляўся адначасова старшынём ПБТПКСБ, расказаў, што пазіцыя старшыні польскай мірнай дэлегацыі «эндэка» С. Грабскага (1871–1949) вызначыла адмову Польшчы ад тэрыторый былых Віцебскай, Магілёўскай і паловы Мінскай губерняў, хоць савецкі прадстаўнік А. Іофе ахвотна саступаў Польшчы беларускія землі да Дняпра і Заходняй Дзвіны[10].

Э. Вайніловіч з колам найбліжэйшых калег вырашыў, што трэба патрабаваць ад польскага ўрада прытрымлівацца канцэпцыі межаў Рэчы Па-

[9] Там жа. С. 337.

[10] Там жа. С. 336.

спалітай 1772 г. (хіба толькі з малымі саступкамі) і ў рамках яе прадставіць усім землям былога Вялікага Княства Літоўскага шырокую аўтаномію. Э. Вайніловіч быў цвёрда перакананы, што, расчляняючы Беларусь, Польшча не пазбаўляецца «беларускай балячкі» раз і назаўсёды, а стварае «вечную ірэдэнту». Да таго ж віноўніцай падзелу Беларусі ў вачах беларусаў будзе Польшча, паколькі «мы самі, скардзячыся на працягу стольkіх год на падзел дзяржавы паміж трыма суседзямі, цяпер, не спытаўшыся беларусаў, расчлянілі іх краіну»[11].

Э. Вайніловіч спадзяваўся на асабістую падтрымку Начальніка Польскай дзяржавы, але ў кастрычніку 1920 г. па Варшаве хадзілі чуткі, якія не спрыялі рэалізацыі федэрацыйнай канцэпцыі Ю. Пілсудскага. Паводле чутак, нібыта генерал С. Булак-Балаховіч заняў Мінск і збіраецца аб'явіць незалежнасць Беларусі, у часовы ўрад якой уключаны Э. Вайніловіч, Р. Скірмунт, граф Е. Чапскі і А. Свіда[12]. Акрамя таго, у Слуцку ў доме, які належаў Э. Вайніловічу, 14–15 лістапада 1920 г. праходзіў Беларускі з'езд Случчыны, які ўзняў Слуцкае паўстанне ў нейтральнай зоне паміж польскім і савецкімі бакамі пад выразна незалежніцкімі лозунгамі. Зразумела, што да прапа-

[11] Войнилович Э. Указ. соч. С. 334–336.
[12] Там жа. С. 338.

ноў і заклікаў Э. Вайніловіча польскія афіцыйныя структуры ставіліся з падазронасцю.

Савічы па мірным дагаворы адыходзілі на савецкі бок, але нейкі час былі заняты польскімі войскамі. 18 лістапада 1920 г. Э. Вайніловіч «у сувязі з пацвярджэннем сумных звестак аб стратах у Савічах і Пузаве, і паведамленнямі газет аб адыходзе польскіх войск да лініі перамір'я, вырашыў паехаць на месца, каб паспрабаваць выратаваць што-небудзь у доме, каб прадаць і атрымаць сродкі для жыцця». А ўжо 27 лістапада 1920 г. на тры гадзіны заехаў у Савічы, адкуль ужо сыходзілі польскія войскі, і знайшоў палац цалкам спустошаным[13].

У студзені 1921 г. Э. Вайніловіч рабіў усё магчымае, каб паўплываць на канчатковыя рашэнні мірнага дагавора і працэс размежавання тэрыторый. Ён «налягаў» на князя К. Радзівіла (1886–1968), каб той ратаваў Нясвіжскі маярат, бо з-за яго легкадумнасці значная частка маярату магла застацца на савецкім баку[14]. Ва ўмовах апатыі многіх членаў СПБУ Э. Вайніловіч ўсё ж імкнуўся паўплываць на тое, каб прадухіліць падзел Беларусі: «Мяне ж больш за ўсё абурала тое, што Ліга Нацый прызнае права невядома каго — грузін, калмыкаў, зулусаў — да нацыянальнага самавызначэння і дзяржаўнасці,

---

13 Войнилович Э. Указ. соч. С. 342–344.

14 Там жа. С. 348–349.

а Беларусь абыходзяць бокам і самавольна дзеляць у Рызе. <...> Энергіі мне надала сустрэча ў Варшаве з Раманам Скірмунтам, якога я лічыў найбольш прыдатным для гэтай місіі і які, нягледзячы на тое, што прыехаў у Варшаву па вельмі важных справах, са звычайнай сваёй гатоўнасцю ахвяраваць, пад маім уплывам згадзіўся на паездку (у Рыгу. — *С. Т.*)»[15].

Віцэ-старшыня СПБУ Г. Кеневіч (1867–1925) пераканаў Э. Вайніловіча, што пасылаць Р. Скірмунта ў Рыгу, дзе ў польскай дэлегацыі ўплыў маюць «эндэкі», немэтазгодна, бо Р. Скірмунт мала ўдзельнічаў у сходах арганізацый землеўласнікаў і гэта можа пашкодзіць запланаванай місіі. Р. Скірмунт да таго ж быў прэм'ер-міністрам БНР, таму ў Рызе быў бы прыняты большасцю польскай дэлегацыі (прыхільнікамі ўнітарнай дзяржавы) холадна. Э. Вайніловіч вызваліў Р. Скірмунта ад выканання сваёй просьбы. Урэшце і сам Р. Скірмунт адмовіўся ад паездкі ў Рыгу, а выехаў толькі І. Парэмбскі, «прычым з малой надзеяй на вынік з-за прадузятага стаўлення польскай дэлегацыі да "беларускага пытання"»[16].

Паводле меркаванняў Э. Вайніловіча, у Рызе бальшавікі згаджаліся саступіць як мага больш

---

[15] Там жа. С. 349–350.

[16] Там жа. С. 352.

зямель за золата, але польская дэлегацыя лічыла, што няпольскіх тэрыторый атрымае і так зашмат, а золата мае мала[17]. Рыжскі мірны дагавор быў падпісаны 18 сакавіка 1921 г., па якім заходнебеларускія землі ўключаны ў склад Польшчы ў статусе звычайных ваяводстваў – «гэта была не ўнія, а анексія»[18]. Акрамя таго, пісаў Э. Вайніловіч: «24 сакавіка 1921 г. з Познані прыехаў Вітольд Магільніцкі і прывёз жудасную навіну, што мае родныя Савічы і Пузава засталіся на расійскім баку. І гэта тады, калі ведаў з газет, што мяжа пройдзе па рацэ Морач да яе ўпадзення ў Случ. Я разлічваў на хоць і спустошаныя, але заўсёды здольныя даць мне дах над галавой і кашу ў місцы мае родныя нівы. Я губляюся ў здагадках, што ж там адбываецца, што прадпрымае мой кіраўнік, што плануе, як сябе паводзіць у гэтай сітуацыі, не атрымліваючы ад мяне ніякіх дырэктыў. Бог і тут нас падвергнуў выпрабаванню»[19].

На польскім боку апынулася толькі частка маёнтка Пузава (у былым Слуцкім павеце) – фальварак Пераходы. Аднак Э. Вайніловіч (з жонкай і сёстрамі) не паехаў туды на сталае жыхарства, у першую чаргу з псіхалагічных прычын. Рыжскі

[17] Войнилович Э. Указ. соч. С. 352.
[18] Там жа. С. 357.
[19] Там жа. С. 359.

дагавор не проста адабраў большую частку яго радавай зямлі, а балюча перакрэсліў усю працу па адраджэнні федэратыўнай Рэчы Паспалітай. «...Я б з'явіўся там, — казаў Вайніловіч, — як збанкрутаваная ідэя Польшчы, бо не дзеля такой Польшчы пакутавалі мы, змагаліся ўсё жыццё і ўсё паўтаралі, што Польшча — гэта права, справядлівая свабода і ўзнёсласць шанавання правоў чалавечых і Божых. Словам, нешта зусім іншае, чым тое, што цяпер сцвярджаюць асаднікі-жаўнеры, якім аддаюць зямлю, адабраную ў адвечных патомных уладароў <...> Не ўяўляю сабе, каб я мог туды вярнуцца і набрацца моцы і трываласці глядзець на тое, што з іх бальшавікі зрабілі, і на тыя парадкі, якія польскі ўрад заводзіць, самавольна капаючы магілу для ідэі польскасці, якой мы гэтулькі вякоў служылі»[20].

28 красавіка 1921 г. Э. Вайніловіч прыехаў у Варшаву, каб атрымаць пашпарт грамадзяніна Польшчы для сябе і блізкіх, пасля чаго з сям'ёй перабраўся на сталае жыхарства ў Быдгашч на Памор'і — былы германскі Бромберг, дзе было тады найтаннейшае жыллё ў краіне. Аднак 29 красавіка 1921 г. у Варшаве адбылося пасяджэнне Рады Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, на якім быў напісаны праект пратакола, які дэклара-

[20] Хмялеўская Г. Церні Крэсаў: аповесць пра Эдварда Вайніловіча і яго сям'ю: пер. з польск. Мінск, 2015. — С. 213, 214.

ваў самаліквідацыю Таварыства, і, паводле зместу, быў своеасаблівым «тастаментам» Э. Вайнловіча. Па сутнасці гэта быў абвінаваўчы акт супраць тых, хто падпісаў Рыжскі дагавор.

1 мая 1921 г. на агульным сходзе членаў МТСГ у Варшаве ў зале Цэнтральнага таварыства сельскай гаспадаркі (у доме № 30 на вуліцы Каперніка) зачытаны Э. Вайніловічам пратакол быў ухвалены. Палітычная частка пратакола была апублікавана ў газетах[21].

У 1922 г. сябры прапанавалі Э. Вайніловічу абірацца ў сенатары Польшчы ад кансерватыўнай польскай Партыі рэальнай народнай працы, аднак ён скептычна аднёсся да гэтай ініцыятывы, бо ў парламенце Польшчы дамінавалі «эндэкі» і іх саюзнікі, якія добра ведалі яго палітычныя погляды і дзеянні. Э. Вайніловіч толькі дазволіў сябрам вылучыць яго кандыдатуру і сказаў, што сам ніякіх актыўных крокаў для абрання рабіць не будзе. У выніку яго не вылучылі кандыдатам у сенатары. У ліпені 1922 г. ён таксама атрымаў прапанову стаць лідарам беларускага нацыянальна-дэмакратычнага руху ў Польшчы (людовага руху), установчы з'езд якога арганізоўваўся Б. Тарашкевічам у Нясвіжы. Э. Вайніловіча задаволіў такі давер, але ён

[21] Там жа. С.193.

адмовіўся, бо не ўяўляў, як можна выконваць гэтую функцыю ў Быдгашчы, а вяртанне ў Нясвіж было б балючым для душы[22].

21 студзеня 1923 г. Э. Вайніловіч быў выбраны на пасаду старшыні «Саюза палякаў усходніх ускраін» (Związek Polaków z Kresów Wschodnich), які займаўся падтрымкай эмігрантаў з Літвы, Беларусі і Украіны. Пасля ваганняў 22 снежня 1923 г. ён прыняў ордэн «Polonia Restituta». Усё ж, адроджаная Польская Рэспубліка была зусім не той Польшчай — радзімай-маці для ўсіх народаў былой Рэчы Паспалітай, пра якую марыў ён калісьці.

25 кастрычніка 1926 г. у Нясвіжы ў палацы Радзівілаў адбылася сустрэча лідараў «віленскіх кансерватараў» з маршалам Ю. Пілсудскім, які хацеў атрымаць падтрымку з боку буйных маянткоўцаў пасля «майскага перавароту». Э. Вайніловіч таксама быў запрошаны сваімі добрымі сябрамі нясвіжскімі Радзівіламі на сустрэчу з Ю. Пілсудскім, але не паехаў, бо адышоў ад палітычнай дзейнасці, не ўступаў у палітычныя партыі, быў абмежаваны ў грашах, а таксама крытычна глядзеў на рэжым «санацыі» і не ўтрымаўся б ад малапрыемнай для Ю. Пілсудскага прамовы[23]. І такая прамова, пазней, прагучала.

---

[22] Хмялеўская Г. Указ. твор. С. 217.
[23] Там жа. С. 274.

Пасля разгрому польскімі ўладамі ў студзені 1927 г. Беларускай сялянска-работніцкай грамады і чарговых нападак віленскіх «эндэкаў» на саюз мясцовых маянткоўцаў на чале з графам Е. Чапскім, якія асуджалі Рыжскі мірны дагавор, Э. Вайніловіч спецыяльна напісаў артыкул «Граніцы Польшчы ў 1771-м і 1920-м годзе» («Słowo», № 96 і № 97, 1927 г.). Ён нагадаў, што ў адрозненне ад украінскіх зямель Польскага Каралеўства, куды шляхта перасялілася з карэннай Польшчы, у Беларусі шляхта Вялікага Княства Літоўскага была пераважна мясцовага паходжання, таму блізкая па крыві мясцоваму сялянству і дробнай шляхце, якая ў штодзённым жыцці карысталася беларускай мовай. Э. Вайніловіч зазначыў, што паланізацыя шляхты мела павярхоўны характар – беларуская мова не забывалася, а існавала побач з польскай, якая дапамагала засвойваць набыткі заходнееўрапейскай культуры. Указаў, што піянерамі беларускамоўнай літаратуры ў XIX ст. былі менавіта мясцовыя шляхціцы, а не сяляне, і катэгарычна выступіў супраць паланізацыі беларускамоўнага насельніцтва Заходняй Беларусі. Выказаўся за змяншэнне падаткаў у Заходняй Беларусі, што давала б, на яго думку, магчымасць гаспадаркам мясцовых сялян і бедных дваран (засцянкоўцаў) праз куплю пустуючых абшараў зямлі павялічваць свае

зямельныя ўладанні, а не выстаўляць на вымушаны продаж з-за разарэння. Прапанаваў таксама, што ваенныя асаднікі-перасяленцы павінны набываць зямлю за грошы, а не атрымліваць бясплатна.

На думку Э. Вайніловіча, менавіта адмова польскіх «эндэкаў» стварыць унію і ўключэнне часткі Беларусі ў склад Польшчы прывялі да таго, што беларускае сялянства ўступае ў пракамуністычныя арганізацыі. Ён адзначыў, што саюз дзвюх дзяржаў (Польшчы і Беларусі) быў бы аптымальным і ўзаемакарысным, даваў бы Беларусі выхад да мора. І дадаў, што тая павярхоўная паланізаванасць не азначала, што нельга вярнуць ранейшую сітуацыю (status quo ante), калі шляхта Беларусі вярнулася б да пастаяннага выкарыстання беларускай мовы. Э. Вайніловіч прывёў у прыклад Чэхію, дзе дэнацыяналізацыя арыстакратычных радоў («wynarodawianie się rodów możnowładczych») не была незваротнай стратай, а са стварэннем самастойнай Чэшскай дзяржавы адбываецца працэс дэгерманізацыі анямечанага дваранства. Зазначыў, што тое самае магло б адбыцца ў Беларускай дзяржаве — дэпаланізацыя і беларусізацыя мясцовага дваранства і інтэлігенцыі (т. зв. «палякаў»).

Правільная палітыка польскага ўрада ў беларускім пытанні, быў упэўнены Э. Вайніловіч, пазбавіла б савецкі ачаг «беларускай ірэдэнты» той

прывабнасці, якую ён набыў у Заходняй Беларусі: «Часта можна пачуць сцвярджэнне, што і без таго ў Сейме і Сенаце Польшча ёсць шмат клопату з прадстаўнікамі нацыянальных меншасцяў. А што было б, калі б Польшча ўключала ўсю Беларусь?

Па-першае, калі б Беларусь пасля адрачэння ад яе Польшчы ў Рызе не была падзелена, то не было б і гэтай крыніцы незадавальнення, якая існуе сёння і праяўляецца ў розных «Грамадах». Па-другое, патрыёты Беларусі, якія разумеюць, што Беларусь, якая не мае выхаду да мора, самастойна існаваць не можа, а пры аб'яднанні з Расіяй яна проста знікне ў расійскім моры, ахвотна аднавілі б былыя традыцыі сумеснага жыцця ў згодзе з Польшчай, не азмрочаных ніякай «каліюўшчынай».

Задаволеныя шырокім самакіраваннем у межах пэўнай аўтаноміі, яны, магчыма, не прынеслі б больш клопату, чым пястаўскі Слёнск. Мясцовыя землеўласнікі, атрымаўшыя права земскага кіравання, якія б адчувалі давер дзяржавы да сваіх ініцыятываў, адразу б распачалі працу па арганізацыі новых умоў жыцця. Вынікі былі б лепшыя, чым тыя, якіх дасягнулі прысланыя на крэсы бюракраты. Яны нічога агульнага з Краем не маюць, настрояў, што ў ім пануюць, не разумеюць. У той жа час уся дэструктыўная праца знаходзіцца ў руках бальшавікоў. Як некалі Аўстрыя ў сваёй антырасій-

скай палітыцы спрыяла ўкраінцам, так цяпер яны, бальшавікі, засноўваюць беларускія ўніверсітэты, праводзяць парцэляцыю ўладанняў землеўласнікаў, і не для чужынцаў з Расіі ў супастаўленні з ваенным польскім асадніцтвам, а для мясцовага насельніцтва, каб паказаць беларусам [Польскай] Рэспублікі, што за кардонам рай. <...> Нічога дзіўнага, што параўнанне сітуацыі на Усходзе і Захадзе ўплывае на настроі. Сялянам новы лад падабаецца, калі ён ім нешта дае, і адразу яны змяняюць фронт, калі ад іх нешта забіраюць. Тое ж самае можна сказаць пра сімпатыі сялян у карэннай Расіі, дзе зараз сяляне сталі галоўнымі ворагамі камунізму. Але для гэтага разумення патрэбныя гады досведу і лепшы парадак у Польшчы»[24].

З іншага боку, паводле пераканання Э. Вайніловіча, неабходна было ўвядзенне высокага маёмаснага цэнзу, курыяльных выбараў у Сейм Польшчы і курыяльнай сістэмы прадстаўніцтва, што дало б перавагу права-кансерватыўным партыям і «краёвым» саюзам зямельных уласнікаў. Гэта нават у санацыйнай Польшчы гучала як недарэчны анахранізм. Менавіта за такую пазіцыю, выказаную прама і наўпрост, рэдактар газеты

[24] Вайніловіч Э. Межы Польшчы ў 1771 і 1920 гадах // Краёвая ідэя: канец XIX – пачатак XX стагоддзя. Анталогія. Мінск, 2014. С. 219–220, 221–222.

«віленскіх кансерватараў» «Słowo» Ст. Мацкевіч (Цат) здзекліва назваў Э. Вайніловіча «апошнім беларускім баярынам»[25]. Выраз «апошні беларускі баярын» створаны і ўжыты Мацкевічам па аналогіі з выразам «апошні грамадзянін Вялікага Княства Літоўскага», які меў у Польшчы ўжытак пасля Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. і абазначаў выміраючую і адыходзячую ў гісторыю катэгорыю людзей, звязаных з традыцыяй і гісторыяй Вялікага Княства Літоўскага. У 1920-я гг. ва ўспрыняцці маладога пакалення «віленскіх кансерватараў» погляды Э. Вайніловіча («літоўскага краёўца», «Нестара краёўцаў беларускай арыентацыі») на аграрнае і «беларускае» пытанне падаваліся састарэлымі, абмежаванымі і неэфектыўнымі, бо не маглі стрымаць распаўсюджання камуністычных ідэй сярод сялян Заходняй Беларусі і прадухіліць рэваншысцкія планы з боку СССР пад сцягам сацыяльнай рэвалюцыі і «беларускай ірэдэнты».

«Апошні беларускі баярын» Э. Вайніловіч да самага канца застаўся кансерватыўным ліцьвінскім рамантыкам, але ў свеце нацыянальных дзяржаў міжваеннай Еўропы настальгічныя мары аб адраджэнні былога Вялікага Княства Літоўскага ў уніі з Польшчай маглі разглядацца толькі як

---

[25] Cat (Stanisław Mackiewicz). Ostatni bojar białoruski // Słowo. 1927. № 96. S. 1.

рэакцыйнае рэтраградства. Таму апошні артыкул славутага сына Беларусі стаў не толькі яго ўласным палітычным запаветам, а, па сутнасці, «замагільнымі запіскамі» ўсёй ідэалогіі краёўцаў — грамадска-палітычнага руху, які імкнуўся адначасова і мадэрнізаваць Беларусь і аднавіць былую веліч і славу даўняй Рэчы Паспалітай.

# ЗВЕСТКІ ПРА АЎТАРАЎ

**Бухавец Пётр Пятровіч** – аспірант кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ імя М. Танка.

**Даўгач Таццяна Валянцінаўна** – аспірант аддзела гістарыяграфіі і метадаў гістарычных даследаванняў Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

**Завальнюк Уладзіслаў Мацвеевіч** – кандыдат гістарычных навук, Ксёндз-магістр, настаяцель Мінскага Касцёла Святога Сымона і Святой Алены.

**Зянюк Раіса Уладзіміраўна** – кандыдат гістарычных навук, навуковы супрацоўнік аддзела гістарыяграфіі і метадаў гістарычных даследаванняў Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

**Кахновіч Віктар Адамавіч** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Расіі БДУ.

**Літвінчук Юлія Сяргееўна** – аспірант аддзела гістарыяграфіі і метадаў гістарычных даследаванняў Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

**Мазец Валянцін Генрыхавіч** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела Навейшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

**Макарэвіч Віталь Сяргеевіч** — кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу БДУ.

**Мальдзіс Адам Іосіфавіч** — доктар філалагічных навук, прафесар, ганаровы старшыня Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў.

**Пуцік Уладзімір Станіслававіч** — кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дэкан факультэта перападрыхтоўкі спецыялістаў адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.

**Сакольчык Алена Эдвардаўна** — кандыдат гістарычных навук, дацэнт, старшы навуковы супрацоўнік аддзела гістарыяграфіі і метадаў гістарычных даследаванняў Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

**Талмачова Святлана Аляксандраўна** — кандыдат гістарычных навук, дацэнт Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.

**Траццяк Сяргей Аляксандравіч** — кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела Навейшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

**Яноўская Валянціна Васільеўна** — кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык аддзела гістарыяграфіі і метадаў гістарычных даследаванняў Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

# ЗМЕСТ

Прывітальнае слова
дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі
В. В. Даніловіча ........ 5

Прывітальнае слова
акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных
навук і мастацтваў НАН Беларусі А. А. Кавалені ........ 8

Прывітальнае слова біскупа Юрыя ........ 14

***Пётр Бухавец***

Эдвард Вайніловіч — удзельнік мінскага таварыства
сельскай гаспадаркі (1878–1888 гг.) ........ 18

***Татьяна Долгач***

Деятельность Эдварда Войниловича в минском
обществе сельского хозяйства ........ 26

***Уладзіслаў Завальнюк***

Хрысціянскі аскетызм — лёс Эдварда Вайніловіча ........ 43

***Раіса Зянюк, Валянціна Яноўская***

Традыцыі фундатарскай дзейнасці ў Беларусі ........ 53

***Віктар Кахновіч***

Гаспадарка ў маёнтках Эдварда Вайніловіча
на мяжы XIX–XX стст. ........ 73

***Юлия Литвинчук***

Делопроизводственные материалы Минской
губернской строительной комиссии как исторический
источник по истории малой родины Э. Войниловича ........ 97

***Валянцін Мазец***

Эдвард Вайніловіч і працэс інстытуалізацыі беларускай дзяржаўнасці ў 1917–1918 гг. ........ 106

***Віталь Макарэвіч***

Фальсіфікаванне дваранскіх дакументаў у беларуска-літоўскіх губернях Расійскай Імперыі (30–70-я гг. XIX ст.) ........ 120

***Адам Мальдзіс***

Зямля капыльская — не «інтэлектуальная глушэча»! ........ 136

***Владимир Путик***

Минское общество сельских хозяев как фактор формирования элементов гражданского общества в северо-западном крае Российской Империи ........ 144

***Алена Сакольчык***

Слуцк і гімназічныя гады Э. Вайніловіча ў перыяд паўстання 1863–1864 гг. ........ 156

***Святлана Талмачова***

Дзейнасць Мінскага губернскага земства па аказанні агранамічнай дапамогі насельніцтву ........ 168

***Сяргей Траццяк***

«Апошні беларускі баярын»: Эдвард Вайніловіч і мірныя перагаворы ў рызе (1920–1921 гг.) ........ 193

*Звесткі пра аўтараў* ........ 214

*Навуковае выданне*

Серыя «Беларусь і Эдвард Вайніловіч»

# БЕЛАРУСЬ, КАПЫЛЬШЧЫНА І ЭДВАРД ВАЙНІЛОВІЧ

*Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі*

(г. Капыль, 14 лістапада 2015 г.)

Укладальнікі:
**Унучак** Андрэй Уладзіміравіч,
**Пуцік** Уладзімір Станіслававіч,
**Анофранка** Наталля Васільеўна

Рэдактар *Л. М. Каранеўская*
Камп'ютарны дызайн, вёрстка *І. І. Галіцкага*
Дызайн вокладкі *І. І. Галіцкага*

Падпісана да друку 10.06.2016. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 12,6. Улік.-выд. арк. 7,0.
Наклад 200 ас. Замова 3593.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
таварыства з абмежаванай адказнасцю «Медысонт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/142 ад 09.01.2014. № 2/34 ад 23.12.2013.
Вул. Ціміразева, 9, 220004, Мінск.




Юбілейны значок, падараваны Эдварду Адамавічу Вайніловічу
членамі Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі
ў 25-ю гадавіну працы ў таварыстве

ISBN 978-985-7136-18-6

